ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№3 (1026), САКАВІК, 2019
Беларусь. Belarus

БЕЛАРУСЬ

Палітыка. Эканоміка. Культура

ISSN 0320-7544

САКАВІЦКІ НАСТРОЙ

ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАННЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» — НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY

Газета для суайчыннікаў, якую ведаюць і чытаюць па ўсім свеце

ЗМЕСТ

8 **Разам у будучыню**

Лепшых студэнтаў, якія прыехалі на навучанне з Кітаю, узнагародзілі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі

9 **Рынкаў шмат не бывае**

Нягледзячы на тое, што сёння Беларусь падтрымлівае гандлёвыя адносіны больш чым са 160 дзяржавамі свету, новых рынкаў для беларускіх экспарцёраў яшчэ нямала

11 **Камфортнае жыццё ў «зялёным» горадзе**

Многія памылкова лічаць, што «зялёны» горад — гэта звычайны населены пункт, толькі з мноствам зялёных насаджэнняў. На самай справе гэтае паняцце нашмат шырэйшае. Каб зрабіць горад зялёным у сучасным разуменні, неабходна ўлічваць мноства фактараў

14 **Прылады для чысціні**

У буйных гандлёвых цэнтрах краіны ўсталююць спецыяльныя прылады, якія будуць прымаць нябітыя і нерастаптаныя алюмініевыя бляшанкі, ПЭТ-бутэлькі і шклянкі, дзе не пашкоджана этыкетка. Менавіта на ёй змесцяць штрых-код, па якім тарамат вызначыць, ці варта плаціць за гэты другасны рэсурс

16 **Робат, будзь чалавекам!**

У Аб'яднаным інстытуце праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі Навук Беларусі ствараюць антрапаморфнага робата

18 **Успаміны пра гомельскае мора**

Заглянуць на 350 мільёнаў гадоў назад, прыгледзецца да прывідаў каралавых рыфаў цёплага гомельскага мора, расшыфраваць мову старажытнага каменя...

Беларусь. Belarus

Грамадска-палітычны часопіс

№ 3 (1026), сакавік, 2019
Выдаецца з 1930 года.

Заснавальнік:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Харкоў Віктар Міхайлавіч

Адказны сакратар
Валянціна Ждановіч

Адрас рэдакцыі:
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а,
г. Мінск, Беларусь, 220013.
Тэл.: +375 (17) 287-19-19,
+375 (17) 292-66-92.
Тэл./факс: +375 (17) 287-15-26.

www.zviazda.by
E-mail: belarus.mag@mail.ru

Падпісны індэкс — 74820.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 8, выдадзена 16.07.2018 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дызайн і вёрстка:
Таццяна Старажэнка
Любоў Малышава

Карэктар:
Аліса Гюнгер

«Беларусь.Belarus» выходзіць на беларускай, англійскай і кітайскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **«Беларусь. Belarus»** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

Падпісана да друку 22.03.2019.
Фармат 60х84 ⅛.
Афсетны друк.
Папера крэйдаваная.
Ум.-друк. арк. 6,51
Ул.-выд. арк. 7,80

Агульны наклад — 1646 асобнікаў (на беларускай мове — 451).

Заказ

Друкарня:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, Мінск,
Рэспубліка Беларусь, 220123.

© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2019

На першай старонцы вокладкі фота БелТА

ЯШЧЭ Ў НУМАРЫ

25 Навука размяшчэння

Калі ў нас у чарговы раз заходзіць размова пра ўдасканаленне сферы гасціннасці, у першую чаргу чамусьці маецца на ўвазе сталіца і абласныя цэнтры

26 Адна цёплая гісторыя

З сям'ёй Фёдаравых мы сустрэліся ў дні, калі ў Мінску праходзіў чарговы Coffee Fest Belarus. Крыху пазней даведаліся, здзівіўшыся: Ірына Фёдарава, кандыдат біялагічных навук і наша добрая знаёмая на Gastrofest «Кава-2019» была адным з удзельнікаў фокус-групы і выбірала сярод барыста самага харызматычнага.

36 Гульні з розумам

Хто яна, Людміла Рублеўская? Празаік? Паэтка? Гісторык-даследчык, які аднаўляе ў нацыянальнай свядомасці праўдзівыя кадры мінулага, ці казачніца, якая стварае новую прыгожую гісторыю Беларусі?

41 Мінулае ў рытмах сучаснасці

Шэраг цікавых імпрэзаў Нацыянальны гістарычны музей Беларусі ладзіць з улікам тых датаў і падзей, якімі жыве краіна сёння

48 Рарытэты з чыгункі

Музеі, як вядома, бываюць розныя. Некаторыя з іх — вельмі арыгінальныя. У Баранавічах, напрыклад, ёсць музей... чыгункі! Гэта — адно з любімых месцаў жыхароў горада. Бо складаецца музей не толькі з традыцыйнага музейнага памяшкання. Найбольш цікавая частка экспазіцыі размешчана пад адкрытым небам

50 На «скрыжаванні» талентаў і мастацтваў

Тое, што ў Пінску з'явілася скульптура палешука-пінчука, выглядае надзвычай сімвалічна

1

З НАГОДЫ СВЯТА

Стала адметнай падзеяй для беларускіх жанчын кожны год на пачатку вясны атрымліваць віншаванні ад Прэзідэнта Беларусі

І сёлета Прэзідэнт таксама звярнуўся 8 сакавіка — у Дзень жанчын — з самымі цёплымі словамі да лепшай паловы чалавецтва. Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку ўсім жанчынам краіны і быў шчыры на камплімент: «Непараўнальная прыгажосць беларускіх жанчын, іх прафесійныя поспехі і перамогі праслаўляюць нашу Радзіму далёка за яе межамі. Вашыя разуменне і падтрымка, цяпло сэрцаў, якія могуць кахаць горача і палка, натхняюць нас, мужчын, на новыя здзяйсненні».

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў жанчынам за тое, што яны актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх сферах жыцця грамадства, выхоўваюць маладое пакаленне, а таксама — за ўменне падтрымліваць спакой і дабрабыт у сям'і. Менавіта жанчыны, на яго думку, робяць свет добрым, забяспечваюць яго духоўнае адзінства і стабільнасць.

Алеся **Пятроўская**

2

ГЕАГРАФІЯ ПАЛЁТАЎ МОЖА ПАШЫРЫЦЦА

Беларусь і Індыя абмяркоўваюць адкрыццё авіязносінаў паміж Мінскам і Дэлі

Напярэдадні ў Нацыянальным аэрапорце Мінск адбылася дзелавая сустрэча з генеральным дырэктарам групы кампаній Primemedia Group of Companies Аніш Гандзі, у якую ўваходзіць адна з найбуйнейшых турыстычных фірмаў Індыі, а таксама кампанія, што ажыццяўляе прадстаўнічыя функцыі для авіякампаній, аказвае паслугі па наземным абслугоўванні павет раных судоў.

Падчас сустрэчы абмяркоўвалася магчымае супрацоўніцтва з індыйскім бокам па пытаннях адкрыцця авіязносінаў паміж Мінскам і Дэлі. Прадстаўнікі Нацыянальнага аэрапорта Мінск выказалі зацікаўленасць і гатоўнасць да супрацоўніцтва з індыйскім бокам, паколькі авіязносіны не толькі пашыраць геаграфію палётаў з мінскага аэрапорта, але і будуць спрыяць істотнаму нарошчванню турыстычнага патоку і станоўча адаб'юцца на бізнес-патэнцыяле, іміджы Беларусі.

Аніш Гандзі адзначыў, што супрацоўніцтва Беларусі і Індыі ў галіне пасажырскіх авіяперавозак стала б адным з важных крокаў у павышэнні і прасоўванні турыстычных магчымасцяў абедзвюх краін. Акрамя таго, прадстаўнік індыйскай кампаніі выказаў зацікаўленасць у адкрыцці турыстычнага офіса для прадстаўлення Беларусі на рынку Індыі.

Працягнуць дыялог па пытаннях арганізацыі авіязносін бакі дамовіліся на Еўрапейскім рэгіянальным форуме, які пройдзе ў красавіку ў Гановеры.

Аляксей **Фядосаў**

3

НА СТАРТ-АП!

План правядзення стартап-мерапрыемстваў у Беларусі прадставіла Міністэрства эканомікі. Іх арганізацыяй зоймуцца ў рэгіёнах і сталіцы.

Сярод прапанаваных формаў для прадпрымальнікаў-пачаткоўцаў — майстар-класы, стартап-школы, пітч-сесіі, мітапы, конкурсы бізнес-ідэй. Выканаўцамі мерапрыемстваў стануць сталічныя і рэгіянальныя вну, каледжы і ліцэі, Інкубатар малога прадпрымальніцтва. Сустрэчы на працягу года пройдуць не толькі ў абласных, але і ў раённых цэнтрах краіны: у Капылі, Баранавічах, Оршы, Пружанах, Наваполацку, Салігорску.

Падтрымка стартап-руху вызначана важным кірункам у Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016–2020 гады, новай рэдакцыі Дырэктывы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб прыярытэтных кірунках умацавання эканамічнай бяспекі дзяржавы», а таксама ў Дзяржаўнай праграме «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь» на 2016-2020 гады.

Марыя **Дадалка**

ШЧЫРАЯ РАЗМОВА ПРА НАЙБОЛЬШ ВАЖНАЕ

Гэтая сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі грамадскасці і экспертнай супольнасці, беларускіх і замежных СМІ працягвалася амаль сем з паловай гадзін

У «Вялікай размове з Прэзідэнтам» прынялі ўдзел больш за 200 чалавек. У іх ліку не толькі журналісты, але і палітолагі, эканамісты, работнікі рэальнага сектара эканомікі, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў і канфесій. Кіраўнік дзяржавы адказаў на некалькі дзясяткаў пытанняў, якія тычыліся шырокага спектра тэм. Аляксандр Лукашэнка падрабязна распавёў аб прыярытэтах унутранай і знешняй палітыкі, пракаментаваў узаемаадносіны з Расіяй, Кітаем, краінамі СНД ды іншымі дзяржавамі. Прэзідэнт выказаўся наконт праблем у эканоміцы, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, сацыяльнай сферы, звярнуўшы асаблівую ўвагу на меры, якія прымаюцца для іх рашэння. Удзельнікі «Вялікай размовы з Прэзідэнтам» не абмяжоўваліся толькі пытаннямі, але і выступалі з ініцыятывамі, выказвалі свой пункт гледжання, дыскутавалі з кіраўніком дзяржавы. Дыялог працягваўся нават пад час кароткага перапынку: Аляксандр Лукашэнка адказваў на пытанні ў нефармальных зносінах з экспертамі і прадстаўнікамі СМІ.

Прэзідэнт, у прыватнасці, нагадаў, што знешняя палітыка Беларусі праводзіцца выключна ў інтарэсах забе-

БЕЛТА

спрачэння бяспекі і захавання міру на зямлі:

— Мы супраць любых праяваў агрэсіі, як ваеннай, так і надзённай — інфармацыйнай. Але па перыметры нашай мяжы ўзнікаюць новыя кропкі напружанасці. Дагаворы, якія забяспечвалі баланс ваенных сіл на планеце, разыходзяцца па швах. У разгары — новая гонка ўзбраенняў. І толькі пачынаем рэагаваць на сучасныя выклікі, рабіць крок у напрамку ўмацавання ўласнай ваеннай моцы, як адразу пачынаюцца хваляванні ў міжнародных палітычных колах і на прасторах інтэрнэту. Мы прывыклі да таго, што не ўсе вітаюць спакойнае жыццё, паступальнае развіццё невялікай незалежнай краіны ў цэнтры Еўропы, што не выклікае захаплення абраны Беларуссю курс сацыяльна арыентаванай дзяржавы, падпарадкаванай інтарэсам чалавека. Мы гэта бачым і разумеем — не ўсім тое падабаецца. Гэты факт правакуе, мабыць, найбольшую колькасць нападак на нашу ўнутраную палітыку з боку неафіцыйных і ананімных крыніц.

А вось пра што яшчэ выказваўся Прэзідэнт Беларусі:

Пра лёс Саюзнай дзяржавы і адносіны з Расіяй

— Ведаеце, калі я вызначаўся на пачатку нашай незалежнасці: з кім быць і як быць, шмат у чым лёс нашай дзяржавы і маю палітыку абумовіла тое, што мы не толькі як людзі завязаныя адна на адной, мы — родныя. Пад гэта ўвесь эканамічны базіс быў падведзены. Наша эканоміка была фінішнай высокатэхналагічнай вытворчасцю, і мы пералапачвалі надмерна вялікую колькасць рэсурсаў, камплектуючых ды іншае з Расійскай Федэрацыі перш за ўсё. Потым усё гэта ішло на экспарт. Многія фактары мяне падштурхнулі да таго, каб мы мелі вось такія цесныя саюзніцкія адносіны з Расіяй. Калі мы падпісалі дамову аб Саюзнай дзяржаве, там былі прадугледжаны крокі па стварэнні гэтай дзяржавы. Галоўны крок, які мы павінны былі зрабіць, — прыняць на рэферэндуме Канстытуцыю нашай дзяржавы, дзе на ўсе пытанні павінны быць дадзены адказы: ад агульнай валюты да органаў кіравання гэтай дзяржавай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы пры тым, што расійскі бок у той час на гэта не пайшоў. — Калі сёння вынесці пытанне на рэферэндум у Беларусі пра аб'яднанне дзвюх дзяржаў і, як у Расіі кажуць, пра ўключэнне Беларусі ў склад Расіі, 90 адсоткаў прагаласуюць супраць. Не таму, што ў нас у грамадстве настроены супраць Расіі. Вырасла новае пакаленне, ды й сталыя зразумелі, што мы можам жыць і супрацоўнічаць зусім у іншай форме: як родныя, блізкія. І беларусы сёння хочуць быць разам з Расіяй, але жыць у сваёй кватэры. Што ў гэтым дрэннага?

Пра выбары, якія маюць адбыцца

— У бліжэйшы час рашэння Прэзідэнта і Парламента па гэтых пытаннях будуць фармалізаваныя. Усё будзе ў адпаведнасці з Канстытуцыяй.

Прэзідэнт пакуль тэму выбарчых кампаній у частцы тэрмінаў іх правядзення ні з кім не абмяркоўваў:

— Я вам клянуся, нават калі сітуацыя будзе вельмі цяжкая, ніколі я не буду маніпуляваць грамадскай думкай, падбіраць момант, каб прапхнуць сябе ва ўладу. Мне гэта не патрэбна. Літаральна ў бліжэйшы час мы маем

намер абмеркаваць тэму і прыняць рашэнне па тэрмінах правядзення.

Прэзідэнт падкрэсліў, што выбары — гэта экзамен не толькі для вертыкалі ўлады, але і для кожнага. У нас адна агульная краіна — іншай няма:

— Я ўпэўнены, што мы годна здадзім гэты іспыт. Галоўнае — па-дзелавому правесці гэтыя кампаніі ды не кінуцца ў нейкую «бойку», каб пацярпелі людзі і краіна. Гэта адгукнецца на нашых дзецях.

Пра канцэпцыю інфармацыйнай бяспекі

Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Беларусі будзе перагледжана на адным з пасяджэнняў Савета Бяспекі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў свеце ідзе інфармацыйная вайна. Ён падкрэсліў, што Беларусь павінна ўмець супрацьстаяць у гэтай вайне, выкарыстоўваючы розныя метады:

— Будзем удасканальваць канцэпцыю інфармацыйнай бяспекі. Праблему мы бачым і ўжо сёння вырашаем. Канцэпцыю перагледзім і ўзмоцнім жорсткасць, каб вы разумелі, у якім кірунку ўлады будуць дзейнічаць, асабліва напярэдадні прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў.

На думку Прэзідэнта, каб супрацьстаяць інфармацыйным атакам з захаду ці ўсходу, трэба ў першую чаргу аб'яднацца ўнутры краіны. Апазіцыя павінна быць канструктыўнай:

— Расія не хоча страціць Беларусь, учыніць тут пераварот, пагоршыць сітуацыю, абстаноўку. Я ў гэтым перакананы. Не павінна быць аднабокасці. Напэўна, ёсць праблема з усходу, але яна яшчэ большая з захаду. Расіяне ж не усталёўваюць ракеты за Масквой на захад, каб іх нацэліць на Беларусь. Навошта гэта Польшчы, іншым краінам (не буду іх пералічваць)? Давайце будзем аб'ектыўныя ў гэтым плане.

Пра ЕАЭС

— Калі шчыра, я вялікіх надзей не пешчу ў плане Еўразійскага эканамічнага саюза. Занадта шмат насцярожанасці, рознагалоссяў і, што зусім непрымальна, эканамічны саюз пачынае ўсё больш палітызавацца.

Прэзідэнт звярнуў увагу на велізарную колькасць выключэнняў у гандлёвых адносінах і на невыкананне ўласна прынятых рашэнняў у рамках ЕАЭС:

— А калі і ўносім разумныя прапановы па вырашэнні той ці іншай праблемы, то выпустошваем гэта рашэнне да такой ступені, што яно не мае ніякага значэння. Нават вольнае перасоўванне, адсутнасць межаў у эканоміцы для тавараў, капіталаў, людзей і г. д. кожная краіна спрабуе абысці і заблакаваць гэты рух — тое, што наогул з'яўляецца аксіёмай для гэтага саюза. І там у нас з'яўляюцца праблемы.

Калі казаць пра будучае старшынства Беларусі ў ЕАЭС, Прэзідэнт адзначыў, што асабліва не разлічвае на нейкі прарыў, паколькі ўсе рашэнні там прымаюцца ў кансэнсусе. Таму ад пазіцыі адной дзяржавы, хай нават самай буйной, наўрад ці нешта залежыць, калі хоць адна дзяржава будзе супраць.

БЕЛТА

Пра размяшчэнне ракет сярэдняй далёкасці

— Калі ва Украіне будуць размешчаны такія ракеты — гэта катастрофа. Трэба разумець, расіяне ж не могуць дапусціць, каб гэтыя ракеты былі там размешчаны. Мы з расіянамі абсалютна будзем салідарныя. Таму ні ў якім разе нельга рабіць у гэтым кірунку крокі Украіне.

Прэзідэнт Беларусі не першы раз выказвае занепакоенасць магчымым размяшчэннем у Еўропе ракет малой і сярэдняй далёкасці. Як кіраўніка дзяржавы яго ў першую чаргу непакоіць у гэтай сувязі Беларусь. «І не хацелася б, каб у старой матухне-Еўропе загарэлася нейкая, не дай Бог, ядзерная катастрофа».

Пра беларуска-кітайскія адносіны

Кітай — надзейны партнёр, які заўсёды падстаўляе плячо Беларусі. Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанне кітайскай журналісткі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што падтрымка з'яўляецца ўзаемнай, і закрануў пытанні развіцця эканамічнага ды інвестыцыйнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Ён падзякаваў кітайскаму боку. «Не было пытання, з якім бы я звярнуўся да кіраўніцтва Кітая і яно не было б вырашана», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

У якасці прыкладу ён прывёў сітуацыю, калі паўсталі праблемы з пастаўкамі прадукцыі ў Расію:

— Калі Сі Цзіньпін быў у мяне дома, я яго пачаставаў нашай прадукцыяй і спытаў: як прадукцыя? Ён адказаў, што вельмі добрая, якасная. Я кажу: трэба дапамагчы нам з рынкам. Кітай закупляе велізарную колькасць прадуктаў харчавання. Тым больш ёсць цягнік, які курсіруе паміж Кітаем і Заходняй Еўропай праз Беларусь. Нам гэта проста падарунак: на зварот-

ным шляху, каб паражняком не ішоў, мы можам загружаць на кітайскі рынак сваю прадукцыю, перш за ўсё сельскагаспадарчую.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць дыверсіфікацыі паставак прадукцыі на знешнія рынкі. І дадаў, што раней Беларусь у велізарнай ступені залежала ад расійскага рынку, цяпер жа за кошт Кітая ды іншых краін мае формулу бяспекі экспартна арыентаванай краіны (30х30х30).

Звяртаючыся да прадстаўнікоў кітайскіх СМІ, Аляксандр Лукашэнка заўважыў:

— Вы павінны ведаць, што беларусы ў даўгу не застануцца. Вы — надзейны партнёр, які па любым пытанні падстаўляў нам плячо. Мы сапраўды гэтак жа будзем ставіцца да вашай краіны. Тут у вас сябры.

Пра наведванне Кітая

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка плануе ў красавіку наведаць Кітай для ўдзелу ў другім форуме «Адзін пояс і адзін шлях». Прэзідэнт адзначыў, што ён атрымаў запрашэнне Старшыні КНР прыняць удзел у форуме, які адбудзецца, і даў на яго станоўчы адказ. «Мы прыедзем на яго, а потым, ужо ў чэрвені, сустрэнемся ў Бішкеку, на сесіі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У нас дастаткова шчыльны графік. Больш за тое, прыадкрыю сакрэт: Сі Цзіньпін прапанаваў мне сустрэцца ў Пекіне акрамя гэтага». Як растлумачыў кіраўнік дзяржавы, магчымасць такой двухбаковай сустрэчы прапрацоўвалася на сакавік, але тыя планы змяніліся ў сувязі з тым, што Аляксандр Лукашэнка прыедзе ў Кітай на красавіцкі форум.

— На гэтым этапе у сувязі з новымі ўмовамі, сітуацыяй і вакол Беларусі, і ў асаблівасці вакол Кітайскай Народнай Рэспублікі нам ёсць крайняя неабходнасць сустрэцца і пагаварыць пра тое, як у гэтых умовах мы будзем супрацоўнічаць.

Пра «Хельсінкі-2»

— Надышоў момант, калі трэба было б дзесьці «Хельсінкі-2» сабраць і пагаварыць сур'ёзна хоць бы на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў АБСЕ (апошняя сустрэча кіраўнікоў дзяржаў АБСЕ адбылася ў Астане ў 2010 годзе, папярэдняя — у Стамбуле ў 1999 годзе. — **БелТА**). Тут не рванеш. Трэба ісці пакрокава.

Аляксандр Лукашэнка прывёў у прыклад перамовы лідараў ЗША і КНДР. Многія разлічвалі, што складанасці ў адносінах паміж краінамі будуць знятыя пасля першай жа сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў, аднак гэтага не адбылося. «Буйныя пытанні адразу не вырашаюцца, асабліва там, дзе задзейнічаны немалыя гульцы, і асабліва на ўзроўні дзяржаў», — адзначыў Прэзідэнт.

З'явіліся новыя ініцыятывы, у тым ліку адраджэнне Шаўковага шляху. «Паўстала пытанне спалучэння гэтых ініцыятыў, як іх сумясціць, каб не супярэчылі адзін аднаму. Як успрымуць нашы кітайскія сябры гэтую ініцыятыву, ці не будзе яна замінаць Шаўковаму шляху? Вельмі шмат праблем і вельмі шмат пытанняў», — сказаў на заканчэнне кіраўнік дзяржавы.

Пра ўрэгуляванне на Данбасе

— Я даўно сказаў: пакуль амерыканцы не далучацца і не падтрымаюць фармат, які існуе, і тыя перамовы, якія прайшлі тут у свой час, толку не будзе. Так яно і адбылося. Я публічна заклікаў, каб амерыканцаў пасадзіць за стол перамоваў «нармандскай чацвёркі». Я ўпэўнены: калі б яны (ЗША — **БелТА**) падтрымалі гэты працэс, ён бы сямімільнымі крокамі пайшоў наперад.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь гатова пры неабходнасці больш актыўна ўдзельнічаць у перамовах: «Я не цярплю пасярэдніцтва, нейкім памочнікам быць ды іншае, навязвацца. Вы скажыце, што трэба — а мы будзем рабіць, каб мяне не абвінавацілі ў тым, што я міратворцам рвуся туды, гэта не зусім добра пераношу. Але калі трэба нешта зрабіць, вы ведаеце маю пазіцыю: мы зробім максімум».

Пра Канстытуцыю

«Я схільны сёння да таго, што новую Канстытуцыю нам прыйдзецца прымаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт растлумачыў, што займацца гэтымі пытаннямі будуць суддзі Канстытуцыйнага Суда: «Шчыра кажучы, я гэта даручэнне зрабіў. Упэўнены, што суддзі Канстытуцыйнага Суда — вельмі адказныя людзі і яны над гэтым працуюць. Я схільны сёння да таго, што новую Канстытуцыю нам прыйдзецца прымаць. Можа быць, прыйдзецца ўзмацняць іншыя галіны ўлады: выканаўчую, заканадаўчую. Можа, нешта трэба будзе пасля сур'ёзнага аналізу распачаць па выбарчай сістэме: уводзіць — не ўводзіць прапарцыйную сістэму або спыніцца на мажарытарнай. Гэта проста будзе зрабіць, досвед ужо ёсць і Расіі, і Казахстана, іншых краін. Мы вывучым гэты досвед».

Паводле **БелТА**

РАЗАМ У БУДУЧЫНЮ

Лепшых студэнтаў, якія прыехалі на навучанне з Кітаю, узнагародзілі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі

Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Кітаю ў Беларусі Цуй Цымін вітае студэнцкую моладзь

Іх поспехі ў вучобе, навуцы і грамадскім жыцці ўніверсітэтаў адзначыў Міністр адукацыі Ігар Карпенка. Кіраўнік ведамства падкрэсліў важнасць дадзенай сустрэчы: «Мерапрыемства разглядаю як вельмі важнае па дзвюх прычынах. Па-першае, гэта зносіны з маладымі людзьмі, у тым ліку і з навучэнцамі з Кітайскай Народнай Рэспублікі, гэта магчымасць абмеркаваць перспектывы падрыхтоўкі кадраў, абмяняцца думкамі па шырокаму спектру пытанняў, якія хвалююць замежных студэнтаў. Па-другое, наша мерапрыемства асаблівае: мы прымеркавалі яго да рэалізацыі ініцыятывы Года адукацыі Беларусі ў Кітаі. Таму сімвалічна, што сустрэча са студэнтамі праходзіць у нашай галоўнай скарбніцы ведаў — у Нацыянальнай бібліятэцы».

У Кітаі ў гэтым годзе адкрыўся Цэнтр культуры Беларусі ў Пекінскім універсітэце замежных моў і стаў ужо дзевятым у Паднябеснай. У хуткім часе іх стане 10. Цяпер у беларускіх вну навучаюцца амаль 3300 кітайскіх студэнтаў — на тысячу больш, чым летась.

Паводле **БелТА**

Студэнты беларускіх вну ў часе ўручэння ўзнагародаў

У Нацыянальнай бібліятэцы прыемна зрабіць сэлфі

БЕЛТА

Творчы ўзаемаабмен паміж беларускімі і кітайскімі студэнтамі

РЫНКАЎ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Нягледзячы на тое, што сёння Беларусь падтрымлівае гандлёвыя адносіны больш чым са 160 дзяржавамі свету, новых рынкаў для беларускіх экспарцёраў яшчэ нямала

Утым упэўнены і старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч. Вось што ён, у прыватнасці, кажа, раскрываючы канцэпцыю самага шырокага ахопу перспектыўных для краіны рынкаў:

— Мы праводзім комплексную працу па ацэнцы найбольш цікавых замежных рынкаў. Пры планаванні выстаў вывучаем прапановы й рэкамендацыі амбасадаў і дзяржаўных органаў. Да гэтых дзвюх крыніц дадаем уласны маркетынгавы аналіз. Шукаем рынкі, дзе ёсць рэальная ніша для айчыннай прадукцыі, плацежаздольныя партнёры, ацэньваем ступень рызык, лагістыку. Дарэчы, упершыню нацыянальная экспазіцыя Рэспублікі Беларусь будзе прадстаўлена ў Нігерыі ў рамках міжнароднай выставы Agrofood. Гэта вельмі перспектыўны рынак для экспарцёраў сельскагаспадарчай тэхнікі, прадуктаў харчавання. Новай краінай у выставачным календары стане і Аргенціна: беларускую экспазіцыю там плануем прэзентаваць у чэрвені. Маркетынгавы аналіз паказвае на запатрабаванасць у рэгіёне Лацінскай Амерыкі ўгнаенняў, тэхналогій у раслінаводстве і жывёлагадоўлі.

Яшчэ адна сур'ёзная задача, на думку Уладзіміра Улаховіча, — умацаваць свае пазіцыі на буйным і вельмі важным для сусветных экспарцёраў рынку Інданэзіі, якая сёння прэтэндуе на ролю субрэгіянальнага лідара ў Паўднёва-Усходняй Азіі. З гэтай мэтай у рамках універсальнай выставы ў Джакарце будзе арганізавана і нацыянальная экспазіцыя Беларусі. Сёлета годзе гандлёва-прамысловая палата працягне арганізацыю маштабных шматгаліновых выстаў беларускіх вытворцаў «Made in Belarus» — яны пройдуць у Грузіі ды Казахстане.

Сёння 70 адсоткаў беларускага экспарту пастаўляецца ў пяць краін. Гэта традыцыйныя партнёры, з якімі наладжана дакладная праца і няма неабходнасці ўкладваць сродкі ў маркетынг. Але ў такім раскладзе, як лічыць Уладзімір Улаховіч, крыецца і слабасць. Беларускія прадпрыемствы рэгулярна сутыкаюцца з нядобрасумленнай канкурэнцыяй, абмежаваннямі, забаронамі. Каб нівеліраваць страты ад падобных сітуацый, патрэбна ідэальная экспартная формула. «Важна разумець: мы не ставім мэту, напрыклад, скараціць аб'ёмы паставак у ЕАЭС да 30 адсоткаў, а гаворым пра тое, каб нарасціць да такіх жа паказчыкаў аб'ёмы экспарту ў Еўропу і краіны далёкай дугі», — адзначае Уладзімір Улаховіч.

Пакуль жа экспартна-арыентаваная беларуская формула выглядае так: на постсавецкую прастору мы прадаем больш за палову ўсёй сваёй прадукцыі, у краіны ЕС — каля чвэрці, астатняя частка прыпадае на рынкі далёкай дугі.

Хоць ёсць напрамкі, дзе назіраецца добрая дынаміка росту. Такіх пазітыўных індыкатараў нямала на рынку краін Паўднёва-Усходняй Азіі, у Кітаі. Калі зусім нядаўна, напрыклад, казалі пра пастаўкі прадукцыі ў КНР на суму 10 мільёнаў долараў, то толькі ў мінулым годзе выйшлі ўжо на 100 мільёнаў. Нельга не згадаць Афрыку — патэнцыял у рынку велізарны. Па-ранейшаму ёсць ніша для беларускай прадукцыі і ў рэгіёне Лацінскай Амерыкі.

З еўрапейскім рынкам складаней. З аднаго боку, патэнцыйныя партнёры кажуць пра адкрытасць рынку і прынцыпах СГА, якія там маюць рэальную прэрагатыву, з другога — трапіць на рынак ЕС са сваёй прадукцыяй няпроста: там дзейнічае нямала абмежавальных інструментаў.

Як бы там ні было, Беларуская гандлёвая-прамысловая палата мэтанакіравана матывуе айчынных вытворцаў выходзіць на еўрапейскі рынак. Бо атрымаўшы сертыфікат на рынак ЕС, прадпрыемствам будзе значна прасцей працаваць і на іншых кірунках.

Васіль **Харытонаў**

На адной з замежных выставаў

ПУЦЁЎКА Ў ЛЕТА

У II Еўрапейскіх гульняў з’явілася афіцыйная мабільная праграма-дадатак

На прэзентацыі навінкі ў ПВТ прысутным прапанавалі адразу ўзяць свае смартфоны і знайсці праграму-дадатак Minsk2019 у Google Play і App Store. Яна бясплатная і ўжо даступна для запампоўкі. Па ёй літаральна за хвіліну карыстальнікі з любой краіны змогуць атрымаць самы поўны даведнік па галоўнай спартыўнай падзеі лета са свежымі навінамі, адрасамі, раскладам, інфармацыяй пра краіны ды спартоўцах. Навінка, якая працуе як на Android, так і на iOS, — вынік супрацоўніцтва Дырэкцыі II Еўрапейскіх гульняў і рэзідэнта ПВТ — кампаніі Synesis sport, афіцыйнага пастаўшчыка праграмна-тэхнічнага блока Гульняў.

— II Еўрапейскія гульні не толькі стануць яркай спартыўнай падзеяй з удзелам сусветных зорак, але і прадэманструюць высокі ўзровень тэхналогій, падрыхтоўкі й правядзення. Не выпадкова прэзентацыя адбылася ў ПВТ. Гэта сведчыць, што тэхналагічная платформа ствараецца на базе самых сучасных падыходаў у сферы развіцця IT-індустрыі ў нашай краіне і ў свеце ў цэлым, — не хаваў эмоцый Георгі Катулін, дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года».

БЕЛТА

Функцыянальная і стыльная мабільная праграма-дадатак Minsk2019 стане адным з галоўных інструментаў для ўдзельнікаў і заўзятараў гульняў. У ім ужо сабраны самыя апошнія публікацыі, датычныя гульняў, фота і відэа. Акрамя таго, укладка «Інтарэсы» дазволіць карыстальнікам рабіць сваю стужку навін, выходзячы з уласных інтарэсаў, зрабіўшы акцэнт на пэўных дысцыплінах або спартоўцах. Раздзел пра спартыўныя аб’екты прадстаўлены ў выглядзе карты з маркерамі, якія пазначаюць лакацыі з магчымасцю пабудаваць найкарацейшы маршрут. Асаблівую цікавасць выклікае ўкладка «Падзеі», дзе ўказваецца, калі і якія спаборніцтвы будуць праходзіць на канкрэтным аб’екце — з выхадам на партал куплі квіткоў. Прадугледжаны асобны раздзел па відах спорту з поўнай інфармацыяй як пра дысцыпліны, так і пра расклад спаборніцтваў. Ёсць фільтраванне раскладу па інтарэсах. Таксама па меры набліжэння Гульняў будзе папаўняцца інфармацыя пра краіны й спартоўцаў, якія іх прадстаўляюць, а затым — пра вынікі спаборніцтваў.

Арыгінальным дадаткам да праграмы стануць 3D-мадэль стадыёна «Дынама», якая дапаможа гасцям арыентавацца на гэтай маштабнай пляцоўцы, і чат-бот. У бліжэйшы час ён будзе даступны ў Viber, Telegram-канале і месэнджары Facebook. Талісман Гульняў — Лісяня Лесік, якое размаўляе на англійскай і рускай мовах, адкажа на любыя пытанні карыстальнікаў.

Юлія **Васілішына**

КАМФОРТНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў «ЗЯЛЁНЫМ» ГОРАДЗЕ

Многія памылкова лічаць, што «зялёны» горад — гэта звычайны населены пункт, толькі з мноствам зялёных насаджэнняў. На самай справе гэтае паняцце нашмат шырэйшае. Каб зрабіць горад зялёным у сучасным разуменні, неабходна ўлічваць мноства фактараў. Энергаэфектыўнасць, устойлівая мабільнасць, прадуманая забудова, абыходжанне з адходамі, аднаўляльныя крыніцы энергіі, «разумныя» тэхналогіі — вось тыя элементы (зрэшты, далёка не ўсе), з якіх складаецца сучасны «зялёны» горад.

У хуткім прасоўванні зялёных інавацый сёння зацікаўлены практычна ўсе. Для органаў улады гэта магчымасць выйсці на ўстойлівае развіццё рэгіёна, прыцягнуць інвестыцыі ды павысіць якасць жыцця ў горадзе. Дэвелаперы зацікаўлены ў тым, каб зялёныя рашэнні рабілі будынкі больш якаснымі, камфортнымі для пражывання. Але ў галоўным фокусе — гарадскія жыхары, якія зацікаўлены ў тым, каб гарадское асяроддзе было экалагічным, камфортным і бяспечным.

Важнасць тэмы ўстойлівага развіцця гарадоў і населеных пунктаў падкрэсліваецца ўключэннем самастойнай Мэты ўстойлівага развіцця (Мэта 11) у глабальны парадак дня. Мэта 11 заключаецца ў тым, каб «зрабіць гарады й населеныя пункты адкрытымі, бяспечнымі, жыццяздольнымі і ўстойлівымі».

На дасягненне гэтай мэты накіравана праца праекта ПРААН «Беларусь: падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах», які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі.

Праект ажыццяўляецца ў трох гарадах: Полацку, Наваполацку і Навагрудку. «Гэтыя гарады былі выбраны не выпадкова, — распавядае кіраўніца праекта Ірына Усава. — Яны ўжо маюць пэўны досвед у рэалізацыі экалагічных праектаў. Усе, у прыватнасці, падпісалі Пагадненне мэраў па кліматыцы і энергіі. Полацк і Наваполацк далучыліся да сеткі гарадоў па ўстойлівым транспарце CIVITAS».

Якім жа ўяўляецца сёння зялёны горад у Беларусі?

Спецыялісты лічаць, што асноўная задача ўкаранення зялёнага горадабудаўніцтва ў Беларусі —гэта распрацоўка і ажыццяўленне інтэграванага падыходу, скіраванага на павышэнне ўстойлівасці гарадоў за кошт энергазберажэння, развіцця транспарту, скарачэння выкідаў парніковых газаў, адаптацыі да змены клімату, а таксама іншых мер, якія выгадныя для эканомікі гэтых гарадоў, карысныя для навакольнага асяроддзя і паляпшаюць якасць жыцця гараджан.

Важным элементам зялёнага горада, напрыклад, з'яўляецца мабільнасць, якая скіраваная на развіццё транспарту агульнага карыстання і стварэнне як камфортных, так і бяспечных умоў для пешаходаў, веласіпедыстаў. «Горад для людзей, а не для машын!» — вось слоган, які выдатна вызначае прынцыпы такой мабільнасці.

БЕЛТА

Кіраўніца праекта Ірына Усава

Абмеркаванне праблемных участкаў гарадской інфраструктуры з жыхарамі Наваполацка

Гарадскі транспарт у зялёным горадзе працуе дакладна па раскладзе і мае перавагі ў руху. У Полацку і Наваполацку Праектам ужо запланаваныя пашырэнне веласіпеднай сеткі, аб'яднанне двух гарадоў адзінай веласіпеднай сеткай. Акрамя таго, у Наваполацку намечана адаптацыя святлафорных аб'ектаў па прынцыпе «зялёнай хвалі», адбудзецца замена прыпынкаў грамадскага транспарту. У выніку чакаецца рост даверу насельніцтва да грамадскага транспарту і стымуляванне адмовы ад выкарыстання асабістых аўтамабіляў у гарадскіх паездках, будуць павышаны бяспека і камфорт паездак. Мадэрнізацыя і аб'яднанне веласіпедных сетак двух гарадоў з улікам еўрапейскага досведу павысіць папулярнасць роваруў у якасці аднаго з асноўных відаў гарадскога транспарту. Рэалізацыя ініцыятыў стварае роўныя магчымасці перамяшчэння для ўсіх жыхароў горада, у тым ліку для асоб з інваліднасцю.

«Мы разглядаем Полацк і Наваполацк як канглямерацыю, для якой распрацоўваецца адзіны План устойлівай гарадской мабільнасці, — тлумачыць Павел Астапеня, эксперт праекта па ўстойлівым транспарце. — Гэта ўнікальны дакумент для Беларусі. Яго мэта — забяспечыць камфортную сувязь паміж двума гарадамі. Перш за ўсё, гэта развіццё ўстойлівага грамадскага транспарту. І, вядома ж, гэта развіццё веласіпеднага руху. Мы звяжам гарады веладарожкай, прыбярэм існуючыя бар'еры, укаранім неабходную веласіпедную інфраструктуру. Паводле апытання, 60% жыхароў двух гарадоў не карыстаюцца роварам на пастаяннай аснове з-за адсутнасці адпаведнай інфраструктуры, у першую чаргу, месцаў для захоўвання роваў — велагаражоў».

Дарэчы, каб мерапрыемствы прыносілі гараджанам максімальную карысць і павышалі якасць іх жыцця, экспертамі Праекта праведзена апытанне, у якім прыняло ўдзел каля сямі тысяч жыхароў Полацка і Наваполацка.

Яшчэ адзін пілотны горад Праекта «Зялёныя гарады» — Навагрудак. На ўваходзе ў райвыканкам Навагрудка размешчаны слоган: «Ужо сёння рабіць тое, пра што іншыя будуць думаць заўтра». Сапраўды, цяпер Навагрудак — прыклад таго, як мясцовая ўлада імкнецца выкарыстаць усе магчымыя крыніцы для ўкаранення інавацый, каб рухацца да «разумнага» горада, «зялёнага» горада. Актыўная праца гарадской адміністрацыі можа паслужыць добрым прыкладам для іншых гарадоў Беларусі. Між тым, Навагрудскі раён — адзіны ў краіне, які аддае электраэнергіі з аднаўляльных крыніц больш, чым сам спажывае. Энергаэфектыўнае асвятленне, ветрагенератары, станцыі сонечных батарэй, цеплаабменнікі, экалагічная ўтылізацыя адыходаў, падтрымка экатурызму — усе гэтыя паняцці ўжо сталі для Навагрудскага раёна рэальнасцю.

Яшчэ адзін істотны момант. Справа ў тым, што ўкараненне ў Навагрудку сістэмы разумнага святлодыёднага вулічнага асвятлення і разумных лічыльнікаў уліку спажытых рэсурсаў таксама зробіць свой унёсак ва ўстойлівае развіццё горада. «У зялёным горадзе «разумнае святло» кіруецца сістэмамі кантролю асвятлення, — распавядае Іван Філюціч, эксперт Праекта па энергетычнай эфектыўнасці. — Гэтыя сістэмы ўлічваюць наяўнасць людзей, транспарту, асвечанасць і час сутак, каб уключаць і выключаць асвятленне, тым самым эканомячы электраэнергію і грошы. Акрамя таго, на вуліцах павышаецца агульная бяспека». Праца Праекта «Зялёныя гарады» не абмяжоўваецца чыста тэхнічнымі мерапрыемствамі. Каб зрабіць зялёнае развіццё гарадоў у Беларусі агульнай практыкай, каманда Праекта распрацоўвае прапановы па ўдасканаленні заканадаўства. Гэтыя змены і дапаўненні дазволяць зрабіць беларускія гарады больш адкрытымі, жыццяздольнымі, экалагічна ўстойлівымі.

«Канкрэтна для нашых пілотных гарадоў мы распрацоўваем Планы зялёнага горадабудаўніцтва, якія дапа-

Велапрабег у мэтах праекта «Зялёныя гарады»

Каманда праекта на вуліцах Полацка

могуць вызначыць напрамкі развіцця горада на перыяд да 2040 года і будуць садзейнічаць зніжэнню выкідаў парніковых газаў, — распавядае Вера Сысоева, эксперт Праекта па зялёным горадабудаўніцтве. — Трэба разумець, што план зялёнага горадабудаўніцтва — гэта пакрокавая стратэгія па дасягненні жаданага стану зялёнага горада. Яна распрацоўваецца з удзелам усіх зацікаўленых бакоў. План ствараецца для вызначэння прасторавай структуры горада — асновы для развіцця інфраструктуры, паляпшэння мабільнасці, павышэння якасці жыцця».

Мала пабудаваць зялёны горад толькі «тэхнічна». Трэба і яго, і навакольнае асяроддзе пастаянна падтрымліваць у належным стане. Для гэтага ў першую чаргу свядомасць людзей павінна зменьвацца ў бок зялёнага мыслення, зялёнага ладу жыцця. У плыні здзяйснення інфармацыйнай кампаніі каманда Праекта праводзіць у розных фарматах сустрэчы з жыхарамі пілотных гарадоў. Удзельнікі такіх сустрэч наносяць на карту горада найбольш праблемныя ўчасткі гарадской інфраструктуры і выказваюць свае пажаданні па стварэнні камфортнага гарадскога асяроддзя. Абмяркоўваюцца пытанні добраўпарадкавання тэрыторый, функцыянавання грамадскага транспарту, будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў. Веласіпедысты ўносяць прапановы па паляпшэнні веласіпеднай інфраструктуры, а людзі з інваліднасцю выказваюцца з нагоды магчымасці стварэння інклюзіўнай прасторы па ўсім горадзе. Прапановы жыхароў улічваюцца пры распрацоўцы Плана зялёнага горадабудаўніцтва.

Праект актыўна падтрымлівае розныя ініцыятывы падобнай тэматыкі. Напрыклад, сумесна з ПРААН бярэ ўдзел у правядзенні Еўрапейскага тыдня мабільнасці. Мэта штогадовай кампаніі — паказаць жыхарам гарадоў і гарадскім адміністрацыям выгады выкарыстання экалагічных відаў транспарту. З 2016 года ПРААН стала інфармацыйным каардынатарам гэтай кампаніі. І калі ў 2015 годзе толькі тры беларускія гарады далучыліся да правядзення Еўрапейскага тыдня мабільнасці, то ў 2018-м пасля таго, як да каардынацыі гэтай ініцыятывы далучыліся эксперты ПРААН, іх стала ўжо 66!

Адна з важных задач Праекта — распаўсюдзіць пазітыўныя вынікі на іншыя гарады Беларусі. З мэтай тыражавання вынікаў удзельнікі Праекта на конкурснай аснове аказваюць гарадскім адміністрацыям экспертную падтрымку. Гэта адбываецца ў рамках Пагаднення мэраў аб распрацоўцы і рэалізацыі планаў дзеянняў па ўстойлівым энергетычным развіцці. Для абагульнення і распаўсюджвання падыходаў да зялёнага горадабудаўніцтва Праект, напрыклад, аказаў экспертную дапамогу ў распрацоўцы канцэпцыі «Симбио-Сити-Брест-2050», якую гарадскі Савет дэпутатаў зацвердзіў у якасці доўгатэрміновай стратэгіі ўстойлівага развіцця горада Брэста. Таксама на падставе конкурсу былі адабраныя пяць гарадоў для аказання экспертнай падтрымкі ў распрацоўцы планаў дзеянняў па ўстойлівым энергетычным развіцці і клімаце. Гэта Баранавічы, Пружаны, Лёзна, Мсціслаў, Слаўгарад. У 2019 годзе Праект абвясціў конкурс яшчэ для чатырох гарадоў Беларусі ў мэтах аказання экспертнай падтрымкі ў распрацоўцы планаў зялёнага горадабудаўніцтва.

«Зялёнае горадабудаўніцтва — гэта комплексны інтэграваны падыход, які можа быць рэалізаваны толькі сумеснымі намаганнямі на розных узроўнях кіравання, — заключае кіраўнік Праекта Ірына Усава. — Дзейнічаць трэба ў некалькіх кірунках: вызначацца з нацыянальнай палітыкай у сферы зялёнага развіцця гарадоў, паляпшаць нацыянальнае заканадаўства ў гэтым сегменце, распрацоўваць планы развіцця для кожнага горада з улікам інтэграванага падыходу да развіцця гарадскіх тэрыторый, а таксама мець у наяўнасці розныя магчымасці для фінансавання інфраструктурных праектаў. І, што немалаважна, вырашаць праблемы з улікам меркаванняў усіх зацікаўленых бакоў».

Уладзімір **Міхайлаў**

ПРЫЛАДЫ ДЛЯ ЧЫСЦІНІ

У буйных гандлёвых цэнтрах краіны ўсталююць спецыяльныя прылады, якія будуць прымаць нябітыя і нерастаптаныя алюмініевыя бляшанкі, ПЭТ-бутэлькі і шклянкі, дзе не пашкоджана этыкетка. Менавіта на ёй змесцяць штрых-код, па якім тарамат вызначыць, ці варта плаціць за гэты другасны рэсурс. Заклад за ўпакоўку, дарэчы, можна будзе атрымаць не толькі чэкам, але і перавесці грошы на мабільны ці дабрачынны рахунак.

Пашыраная адказнасць у дзевяць капеек

Плануецца, што дэпазітна-закладная сістэма (ДЗС) запрацуе ў 2020 годзе. Час конкурсу, які вызначыць, хто стане інвестарам, гатовым укласці 100 мільёнаў еўра ў некалькі тысяч тараматаў, каб наладзіць у краіне такі збор, пакуль не аб'яўлены. Аднак гэта мусіць быць арганізацыя з досведам работы з ДЗС, падкрэслівае Анатоль Шагун, начальнік упраўлення дзяржустановы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:

— Сам падыход да арганізацыі ДЗС досыць просты. Але, каб схема добра працавала і мела мінімальныя інвестыцыйныя і эксплуатацыйныя затраты, інвестару прапануецца самому спраектаваць і стварыць сістэму. А маючы досвед, ён сабе ўяўляе, як гэта павінна быць арганізавана. Тое, што сістэма будзе ўкараняцца, мы ўпэўнены, бо яна дазваляе ў разы павялічыць збор упакоўкі, якая сёння трапляе ў несартаваныя адходы і ў выніку — на палігоны, а не на перапрацоўку. Пры тым яна не павялічыць затраты вытворцаў і пастаўшчыкоў і, як вынік, — цану тавару на паліцы.

Сёння ва ўсе віды ўпакоўкі закладзены кошт будучых затрат на яе ўтылізацыю. Для шкляной паўлітровай бутэлькі, напрыклад, — дзевяць капеек. І гэтая лічба, прынамсі пры ўвядзенні ды зладжанай рабоце ДЗС, можа нават зменшыцца да сямі, лічыць Анатоль:

— Пашыраная адказнасць вытворцаў упакоўкі ў практыцы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі (тыя самыя дзевяць капеек) — толькі адна з крыніц фінансавання дэпазітнай сістэмы. Сюды ўваходзяць таксама сродкі ад продажу ўпакоўкі, сабранай у якасці другасных матэрыяльных рэсурсаў. А таксама нявернутыя дэпазіты — грошы, якія былі заплачаны чалавекам за тару пры набыцці тавару з улікам

закладу за ўпакоўку. Дасягнуць стапрацэнтнага збору ўпакоўкі на перапрацоўку, вядома, нерэальна. Як паказвае практыка, 10–20 % яе не вяртаецца. Нешта паб'ецца, парвецца, выкінецца на сметнік.

Да ўдзелу ў конкурсе мяркуецца прыцягнуць як прыватныя, так і дзяржаўныя арганізацыі, дадае Алег Грузінаў, начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі й добраўпарадкавання Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:

— Мы хочам не дапусціць ніводнай памылкі, якая магла б стаць тормазам на шляху ўкаранення гэтай сістэмы. Разглядаем і магчымасць размяшчэння тараматаў у пэўных гандлёвых пунктах, і зручнасць, і неабходнасць абнаўлення сістэмы касавых апаратаў, каб яны прымалі чэкі з закладнымі сумамі, і сам кошт за ўпакоўку.

Больш тары — больш пакупак

Мяркуецца, што тараматы ўстановяць не толькі ў гандлёвых цэнтрах, але, магчыма, і па-за іх межамі, на паркоўках каля будынкаў гэтых крам, каб здаць тару можна было ў любы час.

Паколькі дэпазітна-закладная сістэма — рэч для дзяржавы карысная, рытэйлерам будзе выгадна ўключыцца ў гэтую схему і выдзеліць месца пад тараматы ў сваіх памяшканнях. Уладальнікі цэнтраў павінны разумець сваю адказнасць у агульнай справе паасобнага збору смецця. Думаючы аб прыбытку, нельга забывацца на сацыяльна-экалагічную адказнасць, кажа Алег Грузінаў:

— Людзі ўсё больш сартуюць тару. Калі ў Літве пачыналі такі праект, планавалі дасягнуць звароту ў 60–70 %, а па факце атрымалі ўсе 79 %, наступным жа годам — ужо больш за 90 %. А беларусы і літоўцы вельмі падобныя і па менталітэце, і па суадносінах спажывецкага кошыка да сярэдняга заробку.

Акрамя таго, крамы, на тэрыторыі якіх паставяць абсталяванне, будуць атрымліваць невялікую плату, якая пакрые іх выдаткі на абслугоўванне тарамата: электраэнергію, сувязь з інтэрнэтам, выманне ўпакоўкі. Зацікаўлены ўладальнік гандлёвага пункта ва ўсталяванні тараматаў — бо яны павялічаць колькасць спажыўцоў і гандлёвы абарот, лічыць Анатоль Шагун:

— Калі чалавек здасць тару ў краме і атрымае чэк, то імаверна, што рэалізуе яго тут жа. І гэта прамы стымул мець у сябе пункт прыёму тары.

Вернутую праз тараматы ўпакоўку могуць як аддаваць на перапрацоўку самім яе вытворцам, так і прадаваць адпаведным перапрацоўчым арганізацыям.

Увайшоў цэлы, выйшаў — сплюшчаны

Прынцып дзеяння тарамата досыць просты. Чалавек апускае шкляную ці пластыкавую бутэльку ў прыладу і атрымлівае чэк на 20 капеек за кожную ўпакоўку. На думку спецыялістаў, гэта дастатковы кошт, які прастымулюе чалавека не выкінуць тару ў смецце, а прынесці да тарамата. На ім, у адрозненне ад некаторых еўрапейскіх аналагаў, будзе толькі адна адтуліна для ўсёй упакоўкі.

— Сучасны ўзровень распазнавання розных відаў тары дазваляе прымаць усю ўпакоўку праз адну адтуліну. У тарамаце бутэлькі распазнаюцца па форме, вазе і штрых-кодзе на этыкетцы, — заўважыў прадстаўнік «Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў». — Гэтых параметраў дастаткова, каб выключыць магчымае махлярства з другаснымі рэсурсамі: спробу здаць бутэльку, якой няма ў ДЗС, усунуць у тарамат пакамечаную ці пабітую ўпакоўку з пашкоджанай этыкеткай, недапітую бутэльку.

Пра наяўнасць штрых-кода і ўключэнне тары ў закладную сістэму павінен клапаціцца сам вытворца ўпакоўкі. Калі тара будзе ўвозіцца з-за мяжы, пастаўшчык павінен сачыць, каб яе памеры і форма адпавядалі тым, што будуць акрэслены ўмовамі ДЗС. На паліцы крамаў не павінна трапляць бутэлька, якая не можа ўлезці ў тарамат, кажа Алег Грузінаў.

Спажывец зможа сам выбраць спосаб вяртання закладу з дапамогай пэўных кнопак на абсталяванні: атрымаць чэк, перавесці сродкі на мабільны тэлефон, а то і ўвогуле даслаць іх на дабрачынны рахунак.

— Калі чалавек выбірае чэк, яго можна будзе рэалізаваць у межах крамаў гандлёвай сеткі, дзе ўсталяваны тарамат, прыкласці да пакупкі замест часткі сумы наяўных грошай або нават атрымаць за яго гатоўку на касе, — разважае Анатоль Шагун.

Мяркуецца, што за напаўненнем тараматаў можна будзе сачыць анлайн, каб своечасова апаражняць іх. Дарэчы, хоць прымаюцца другасныя матрэсурсы (далей — ДМР) толькі цэлымі, бляшанкі і ПЭТ-бутэлькі вымаюцца з тарамата спрасаванымі, а шкляныя бутэлькі (калі гэта не шматабаротная тара) — у выглядзе шклабою. Гэта яшчэ адна гарантыя супраць махлярства — каб тару не здалі паўторна.

Тараматы з'явяцца і пачнуць працаваць адначасова ва ўсіх буйных гарадах краіны. Вядома, што ў невялічкіх раённых крамах такія прылады не ўсталююць, прадавец там будзе вяртаць заклад уручную. Шляхам установкі тараматаў спадзяюцца стымуляваць насельніцтва да яшчэ большага збору ДМР і дасягнуць вяртання ў другаснае карыстанне 80 % усёй упакоўкі.

Ірына **Сідарок**

РОБАТ, БУДЗЬ ЧАЛАВЕКАМ!

У Аб’яднаным інстытуце праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ствараюць антрапаморфнага робата

Усё за нас будуць рабіць робаты — такія думкі нярэдка наведваюць, калі ўяўляем сабе, якой жа будзе будучыня. Ужо цяпер на вытворчасцях працуюць робаты, яны пераносяць цяжкія грузы, а ў дамах займаюцца ўборкай робаты-пыласосы… Не ўсюды, не ва ўсіх, але ў цэлым тэндэнцыя вызначаецца. Развіваюць яе і ў Аб’яднаным інстытуце праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук. Акрамя фундаментальных даследаванняў і распрацовак, там робяць навучальных робатаў для школьнікаў і студэнтаў, рыхтуюць сферычнага робата, які будзе значна лепшы, чым знакаміты робат BB-8 з кінафільма «Зорныя войны», а таксама друкуюць на 3D-друкарцы чалавекападобнага робата ў поўны рост. Наш карэспандэнт даведалася падрабязнасці.

Палова мяне?

Я ў лабараторыі робататэхнічных сістэм Аб’яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН. Інжынер-праграміст Яўген Пячкоўскі займаецца адытыўнымі тэхналогіямі, сочыць за працай 3D-друкаркі й робіць яшчэ адну важную дэталь для «Ньюмэна» — так тут называюць новага робата, які падобны да чалавека.

— Гэты робат — распрацоўка французскіх дызайнераў ды інжынераў, — распавядае ён. — Электронныя мадэлі яго механічных частак аўтары выклалі ў інтэрнэт, каб універсітэты, даследчыя лабараторыі, нават любы чалавек, у якога ёсць жаданне, змаглі зрабіць і вывучыць яго, займацца даследаваннямі на яго базе. Вядома, мы б хацелі ў лабараторыі стварыць свайго ўласнага падобнага робата, але для гэтага трэба ведаць і разумець, як зроблены аналагі.

Перад намі «паўчалавека»: галава і бюст робата. Ён будзе слухаць і размаўляць — у галаву ўсталююць спецыяльныя слыхавы і маўленчы апараты, ён і нават зможа адчуваць дотык да прадметаў праз пальцы, у якіх, вядома, будуць датчыкі.

— А яшчэ ён будзе разумець, дзе ён, — паказвае на грудзі робата Яўген. — Тут устаноўлена 3D-камера, дзякуючы ёй ён будзе «разумець» прастору вакол сябе, рабіць картаграфаванне, праводзіць распазнаванне асоб. Для інжынераў гэта скарбніца, таму што ў ім шмат сэрвапрывадаў. Да пры-

SB.BY

Так цяпер выглядае робат «Ньюмэн»

кладу: толькі ў адной руцэ — адзінаццаць ступеняў рухомасці. І нашы праграмісты адказваюць за тое, каб узнавіць рух гэтай жа рукі ў яго, як у чалавека. Мы нават будзем імкнуцца, каб ён мог адчыняць дзверы за ручкі і падымаць поўныя кубачкі кавы, — жартуе Яўген. «Ньюмэн» зможа падымаць рукі, паварочваць іх, рухаць запясцем і пальцамі. Цікава, што менавіта з рукі ўсё й пачалося: некалькі гадоў таму на II З'ездзе вучоных Беларусі супрацоўнікі лабараторыі прадэманстравалі толькі яе. Каля рукі ўсталявалі вэб-камеру, якая распазнавала малюнкі. Чалавек рабіў рух рукой, а штучная рука паўтарала яго. Усім настолькі гэта спадабалася, што тады вырашылі зрабіць паўнавартаснага чалавека, абапіраючыся на досвед замежных калег. У тым ліку і расійскіх. Дарэчы, падручнікаў па тым, як зрабіць такога робата, як і падручніка па 3D-друку, няма: нашым навукоўцам было цікава пазнаёміцца з гэтым працэсам. Усаджванне пластыка і яго залежнасці, набор вільгаці пэўнымі матэрыяламі… Увогуле, аказалася, што добрая друкарка — гэта не просты офісны атрыбут, а станок для інжынера.

— Каб зрабіць толькі фізічную яго частку — тулава, нам спатрэбілася 7,5 кілаграмаў пластыка PLA: ён бліжэй за ўсё да зялёных тэхналогій. Вытворца запэўнівае, што калі яго змясціць у асяроддзе, якое садзейнічае раскладанню, пластык на працягу 5 гадоў распадзецца і не забрудзіць наваколле, — дадае цікавы факт Яўген Пачкоўскі. Разам з ім і іншыя навуковыя супрацоўнікі займаюцца стварэннем штучнага чалавека. Іван Падмазаў ды Ілья Тузін таксама павінны надзяліць гэтага робата здольнасцю не проста чуць, але і адказваць — паўнавартасна мець зносіны з дапамогай маўленчага сінтэзатара. А хадзіць? Ног у яго пакуль няма — праграмаванне гэтай функцыі для яго — адна з самых няпростых задач. Але, запэўніваюць навукоўцы, і ногі яму надрукуюць. Пакуль жа — адладка верхняй часткі «новага чалавека», які, магчыма, стане прабацькам першага беларускага робата-чалавека…

Яны сярод нас

У гэтай лабараторыі працуюць і над стварэннем іншых робатаў. Вось, напрыклад, універсальныя канструктары для мадэлявання робатаў рознага прызначэння — RoboCake. У лінейцы канструктара RoboCake ёсць тры віды робатаў: Beginner (для пачаткоўцаў), Student (для студэнтаў) і Professional (для прасунутых карыстальнікаў). Дарэчы, апошнія ўжо выкарыстоўваюцца ў БДУ ў якасці навучальных набораў. Загадчык лабараторыі Рыгор Пракаповіч раскладвае іх і тлумачыць: такія малагабарытныя мабільныя робаты створаны для таго, каб лёгка паказваць, вучыць прынцыпам робататэхнікі.

— Гэта складаная комплексная прылада, якая стаіць на трох кітах: механіцы, электроніцы, інфарматыцы. Каб атрымаўся паўнавартасны якасны робат, трэба ведаць і разумець тонкасці ўсіх трох кірункаў. Таму мы і стараемся выкарыстоўваць самыя лепшыя дасягненні названых абласцей ведаў у сваіх распрацоўках, каб годна канкураваць, ствараць цікавыя рэчы, — кажа Рыгор Пракаповіч. — Першымі былі прамысловыя робаты — яны замянілі людзей на складанай і манатоннай працы. Затым з'явілася неабходнасць у экстрэмальных робатах — тых самых, якія здольныя працаваць у самых складаных умовах, дзе чалавеку быць небяспечна

Рухацца робат зможа па вадзе, па снезе і па сушы

(напрыклад, месяцаходы). Пасля з'явіліся робаты-сапёры, сэрвісныя і, вядома, цяперашнія — хатнія робаты. Мы, навукоўцы, праводзім пошукавыя даследаванні й праекты ва ўсіх напрамках робататэхнікі. Да нас прыходзяць розныя запыты ад прыватных і дзяржаўных прадпрыемстваў, але мы ж і самі генератары ідэй — спрабуем зрабіць свой унёсак у сэрвісную, персанальную, прамысловую робататэхніку.

Так разам з Рыгорам Пракаповічам я падышла да тэмы пра робата-шар.

— У нашага робата-шара ёсць перавага перад канкурэнтамі: у яго будзе магчымасць рухацца ва ўсіх напрамках з нулявым радыусам павароту — цяпер мы над гэтым працуем, — паказвае гэты загадкавы шар, у сярэдзіне якога 6 рухавікоў, блок сістэмы кіравання, элементы сілкавання аб'яднаны ў адзіны працоўны орган паралельнага маніпулятара. Усё гэта пакуль цалкам ручная работа супрацоўнікаў лабараторыі. — Разумееце, чым ён лепшы за свайго канкурэнта з кінафільма «Зорныя войны» — робата BB-8? Апошні не мог разагнацца, як аўто, і сысці «ў нейтралку» для эканоміі энергіі. Наш жа, дзякуючы перамяшчэнню працоўнага органа ўнутры самога шара, можа змяняць кірунак руху, быць больш рухомым і манеўраным.

Яшчэ адна перавага робата-шара: нашы навукоўцы хочуць выводзіць не на дадатковы экран тое, што бачыць робат, а якраз на паверхню шара. У таго ж BB-8 ёсць «галава», якая назірае за тым, што адбываецца. На мяжы паміж рухомай ніжняй часткай і «галавой», як і ў іншых робатаў, якія бегаюць-ступаюць, часта ўзнікаюць праблемы: пыл збіраецца, карозіяй пакрываецца гэты ўчастак, сціраецца… А ў шара такога быць не можа: ён абаронены ад падобнага сваёй жа формай.

— Наш сферычны робат не будзе проста свяціцца і каціцца, ён зможа, напрыклад, дэманстраваць абстаноўку з усіх куткоў вашага дома, скажам, на смартфон. Вы ўбачыце ўсё, не будзе белых плям, — інтрыгуе Рыгор Пракаповіч. — Мы таксама пастараемся дасягнуць таго, каб ён змог перадаваць навакольную карцінку.

Рыгор Пракаповіч не выключае, што ў будучыні менавіта такая мадэль робатаў зможа вырашыць пытанні перамяшчэння: унутры разумнай сферы можна будзе ехаць, як у машыне.

Аліна **Касель**

УСПАМІНЫ ПРА ГОМЕЛЬСКАЕ МОРА

Заглянуць на 350 мільёнаў гадоў назад, прыгледзецца да прывідаў каралавых рыфаў цёплага гомельскага мора, расшыфраваць мову старажытнага каменя... Такую ўнікальную магчымасць даюць пароды, якія захоўваюцца ў адзіным беларускім кернасховішчы — Цэнтры апрацоўкі, даследавання і захоўвання керна.

NEFT.BY

Геолаг Ганна Ерашэнка з узорам керну

Гэты прэзентабельны будынак у паўночнай частцы Гомеля з'явіўся ў 2015 годзе. Роўна з таго моманту пачаўся адлік новага фармату працы інстытута «БелНДПІнафта» з каменным матэрыялам Прыпяцкага прагіну. Па словах намесніка генеральнага дырэктара аб'яднання «Беларуснафта» Пятра Поўжыка, там удалося аб'яднаць адразу дзве справы: захоўванне важнага прыроднага матэрыялу і правядзенне ўсяго комплексу даследаванняў. А гэта, удакладняе спецыяліст, цалкам іншыя магчымасці для таго, каб выбудоўваць стратэгічную праграму геалагічных работ.

Начальнік аддзела літалогіі ды стратыграфіі «БелНДПІнафта» Ігар Яшын праводзіць лікбез:

— Што такое керн? Гэта ўзор горнай пароды, выбуранай адмысловым свідраваннем з глыбіні ад 2–3 кіламетраў да максімальных 7. Па сутнасці, керн — адзіны фактычны матэрыял, які дазваляе геолагам вызначыць перспектывы нафтаноснасці той ці іншай тэрыторыі, дзе праводзіцца выведка. Гэта першакрыніца шырокай інфармацыі: аб геалагічнай будове нетраў, умовах ападказбірання, рэчыўным складзе горных парод, наяўнасці й адсутнасці ў іх вуглевадародаў.

Слова за слова — высвятляецца: паміж сабой спецыялісты называюць кернасховішчы бібліятэкамі. Пароды — нібы кнігі, па якіх можна здзейсніць падарожжа ў мінулае й даведацца вельмі шмат чаго не толькі спецыялістам. Напрыклад, у гэтым сховішчы прадстаўлена каля 35 кіламетраў керна з 1450 пройдзеных у Беларусі свідравін. Шмат якім узорам па 350–360 мільёнаў гадоў. У той далёкі час, распавядае геолаг першай катэгорыі Ганна Ерашэнка, гомельскія наваколлі ўяўлялі з сябе цёплае плыткаводдзе, там раслі каралавыя рыфы... Ну чыста Чырвонае мора ў сучаснай інтэрпрэтацыі! Пісьмёны былых курортных дзён цяпер можна прачытаць на ўзорах керна. Спецыяліст дастае з кантэйнера «каменныя» слупкі. Нейкія нагадваюць губку з адтулінамі розных формаў і памераў, іх называюць порамі й кавернамі, нейкія — усходнюю халву з каляровай гульнёй слаёў на зрэзе. Крыху пазней, знаёміўшыся з працай лабараторыі, на такім вось узоры выдатна разгледзелі след «першабытнага» чарвяка і яго норку… Працэс нараджэння аднаго з варыяцый керна Ганна Ерашэнка тлумачыць вельмі даступна:



БЕЛТА

На падставе атрыманых у лабараторыі вынікаў фарміруюцца літалагічныя карты, дзе зафіксаваны перспектыўныя для нафтаздабычы зоны

— Прыпяцкі прагін валодае складаным і адначасова ўнікальным нафтаносным комплексам. Пароды маюць мазаічную будову. Вось звярніце ўвагу на сферычныя «малюнкі» — гэта ўтварэнні з багавіння. Ва ўмовах неспакойнага мелкаводдзя пясчынкі наскоквалі, намотваліся на багавінне, у выніку ўтвараючы сферу. Гэтыя ўтварэнні з багавіння з'яўляюцца калектарамі вуглевадародаў — горных парод, — якія змяшчаюць пустэчы, здольныя ўмяшчаць і фільтраваць такія цікавыя нам флюіды, як нафта, газ, вада.

Пароды, узнятыя з розных глыбінь, адпраўляюцца на бестэрміновае захоўванне. Велізарны бокс, застаўлены стэлажамі вышынёй да 9 метраў, нагадвае сховішча бібліятэкі. Праўда, для керна выкарыстоўваюцца вільгацеўстойлівыя вогнеахоўныя скрынкі з цеплаізаляцыйным ушчыльнікам. У залежнасці ад пароды вага такой скрыначкі вар'іруецца ў межах 10–20 кіло. На кожнай — «адрас» паходжання і QR-код, дзякуючы якому можна атрымаць поўны аб'ём інфармацыі, дастаткова мець пад рукой смартфон.

Геолаг Рустам Казіма ўдакладняе дэталі:

— У Беларусі кернаматэрыял здабываецца з 1964 года. Цяпер ён сканцэнтраваны ў Гомелі. Як бачыце, пароды сістэматызаваны, каталагізаваны і выкладзены па зонах нафтагазанакаплення: поўнач, цэнтр і поўдзень.

Асобным радком — мікраклімат для захоўвання скарбаў з нетраў, які ствараецца сучаснай сістэмай кандыцыявання й вентылявання. Керну па «душы» тэмпература ў межах +18 — +21 градусаў, вільготнасць — каля 75 адсоткаў. Усё гэта прадухіляе разбурэнне каменя, дазваляючы яму захоўвацца вечна. І гэта не ўсё. Пакуль камень адпачывае на паліцах, яго вывучаюць. Спецыялісты некалькіх лабараторый кернасховішча вядуць свае кірункі, якія ў канчатковым выніку й дазваляюць «глыбока й шырока» бачыць перспектывы нафтаносных і газаносных раёнаў Прыпяцкага прагіну, прымяняць веды на практыцы й вырашаць усё новыя й новыя задач.

Намеснік дырэктара па геолагаразведачных работах інстытута Барыс Дубінін кажа проста й зразумела:

— Нашы даследаванні дапамагаюць прачытаць «запісы» нетраў. Гэта дазваляе спрагназаваць месцазнаходжанне новых пакладаў, блокаў, аб'ектаў для распрацоўкі. І скіраваць геолагаразведку ў патрэбнае рэчышча.

Канчатковы пункт знаёмства з «бібліятэкай» — самая буйная ў Беларусі калекцыя каменнага матэрыялу, атрыманага за гады нафташукальных геолагаразведачных работ. Больш за 200 асобнікаў. Ёсць і зусім унікальныя, што ўтварыліся сотні мільёнаў гадоў таму з гомельскіх каралаў і ракавінак. На адным з узораў «праступае» малюнак рэліктавай расліны. Вельмі ясна захаваўся лісцік з мінулага, які цяпер дапамагае прыадкрываць будучыню.

Віялета **Дралюк**

АЮРВЕДА З ВОДАРАМ ХВОІ

Ці магчымая наогул гэтая старажытная сістэма аздараўлення ў Беларусі? А чаму б і не, падумалі мы. Бо тройчы пабывалі ў Індыі, у паўднёвым штаце Керала, і на сабе выпрабавалі дабратворны ўплыў методык, аздараўленчых і ачышчальных працэдур, якія прапануе Аюрведа.

Каб паглядзець, як жыве Центр Аюрведы — першы ў Беларусі, які адкрыўся ў ліпені 2018 года — паехалі ў сасновы бор на бераг Мінскага вадасховішча. Якраз там тэрыторыя санаторыя «Пралеска». Безумоўна, гэта не бераг Ціхага акіяну з яго Аравійскім морам, не тое вільготнае цяпло, якое ахутае ўсяго цябе, калі на пачатку чэрвеня, у сезон дажджоў, выйдзеш з самалёта ў аэрапорце Кочын і ступіш на зямлю паўднёвага штату Індыі — Керала.

Затое ў нас, перамовіліся мы па дарозе, ёсць хвойны водар у сасновым бары, насычаным кіслародам. Тым водарам не проста дыхаеш, а здаецца — п'еш. Такі ён моцны, ацаляльны. Той водар мы адразу адчулі, калі на ўездзе на тэрыторыю санаторыя адкрылі шкло аўтамабіля і запыталі ў дзяжурнага, дзе ж Центр месціцца…

Індыя ў нашых сэрцах

Пра Аюрведу, навуку жыцця, якой больш за пяць тысяч гадоў, чулі мы даўно. І захапляліся ёю яшчэ ў маладым узросце. У хатняй бібліятэцы зберагаюцца і кнігі, у якіх — веды пра ўсталяванне гармоніі і раўнавагі ў целе, розуме і свядомасці, шмат рэкамендацый для тых, хто спавядае здаровы лад жыцця.

Але перш чым пазнаёміць чытача з Цэнтрам, з дапамогай нашых мінулых уражанняў ажыццявім невялічкае віртуальнае падарожжа ў Індыю, якую мы для сябе адкрылі і палюбілі, крыху раскажам пра сваё першае з ёй знаёмства. Больш падрабязна пра тое чытайце на старонках часопіса (№ 12–2016 і № 7–2018).

Гэтая краіна і дагэтуль жыве ў нашых сэрцах. Яе забыць немагчыма: ёсць нешта няўлоўнае, містычнае, калі думаеш пра штат Керала, тую невялікую геаграфічную частку Індыі, дзе мы пабывалі. Пра нашае апошняе аздараўленне ў Мейеведзе нагадвае невялічкае дрэўца кары. Мы яго адтуль прывезлі разам з адным лістком другой расліны, назвы якой не ведаем. Яна таксама, як і кары, прыжылася ў нас на падваконні. Вось такая прыемная сувязь з Індыяй атрымалася. А лісцікі кары можна ўжываць у ежу. Пра гэта нам сказаў наш добры знаёмы, кіраўнік адной мінскай турыстычнай фірмы, якая ладзіць туды вандроўкі. Дарэчы, Уладзімір Клюйкоў сам з жонкай Наталляй адпачываў у Мейеведзе тады, калі і мы там былі з нашым сябрам. Адна наша знаёмая, якая яшчэ раней нас захварэла Індыяй і Аюрведай, сказала аднойчы: Індыя — гэта дыягназ. Таксама ж індыйцаў розных веравызнанняў, з якімі давялося пасябраваць, забыць немагчыма. Тыя нітачкі праз тысячы кіламетраў імгненна нас з імі ў свядомасці звязваюць: варта толькі прыгадаць твары, імёны, прыветныя словы нашых індыйскіх сяброў. Гэта дактары Шрыкала Санташ і Шахіна, Ніша й Мэлдзі, шэф-кухары Джошы Себасцьян і Айнуп, терапісты Маліка, Ахіла, Шыджа, Шайнэ, Рагунат і Мэрдак, менеджары Джон і Рамэш, вадзіцель Прадзіп, настаўнікі ёгі Прасад і Санташ…

З некаторымі мы і цяпер падтрымліваем зносіны праз перапіску. Кожнай раніцай, напрыклад, прыходзіць па WatsApp прывітанне ад Джона з Трывандрума. Цяпер ён

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Гокул Крышнан, Рэшма Сабу і Адарш Мохандас — у Беларусі ўпершыню

працуе ў Каваламе. Дарэчы, запрашаў прыехаць туды адпачыць і скарыстацца магчымасцю аздаравіцца. Гэты зусім побач са сталіцай Керала, дзе жыве ягоная сям'я. З Джонам мы пасябравалі ў 2017-м, калі былі ў другі раз у Натыкабіч рэсорце, тады й Джон працаваў там. А калі летась аздараўліваліся ў Мейеведа-рэсорце і хацелі ў Натыку з'ездзіць, то Джон ужо з'ехаў у Трывандрум, каб быць, як потым нам напісаў, бліжэй да сям'і. Якраз у 2017-м у яго нарадзілася дачушка. І Кавалам, казаў, таксама, славіцца сваімі аюрведычнымі традыцыямі. Туды едуць і тыя, хто спыняецца на адпачынак у Трывандруме. А прывітанні ў Джона заўсёды цёплыя, адухоўленыя глыбокім сэнсам. Вось і сёння прыйшло чарговае. Спадзяюся, Джону будзе прыемна, калі я перакладу яго для нашых чытачоў у Беларусі:

«Жыццё цудоўнае адзін дзень, адну гадзіну і адну хвілін у. І яны ніколі не паўторацца ў далейшым тваім жыцці. Таму пазбягай агрэсіі, злосці. З усімі, хто табе сустрэнецца, размаўляй з любоўю». Альбо ўчора: «Нечаканыя падзеі і праблемы — частка жыцця. Ні пры якіх умовах не губляй надзеі, таму што цемра ночы заўсёды заканчваецца святлом дня». Якраз пад ранішнюю каву з гэтага пазітыву ад Джона мы часта пачынаем наш дзень. Так было і перад невялічкай камандзіроўкай у Цэнтр SHANTER Wellness.

І вось мы ў санаторыі «Пралеска». Падымаемся на другі паверх аднаго з будынкаў. Нас там сустракае кіраўнік Цэнтра «Аюрведа» Таццяна Насачэўская. Паказвае пакоі, дзе наведнікі прымаюць працэдуры, расказвае пра тое, што на сайце Цэнтра ёсць цікавая інфармацыя пра яго. З намі яна тым і падзялілася.

«SHANTERWellness» створаны, каб прапанаваць сучасную камбінацыю лепшых складнікаў з вобласці навукі і тэхналогій з Аюрведай, ёгай, медытацыяй і сістэмай харчавання для правільнай арганізацыі клеткавага сілкавання. Наша мэта, гаворыць суразмоўніца, паспрыяць людзям пабудаваць устойлівае здароўе на клеткавым узроўні шляхам комплекснага падыходу.

Гучыць, безумоўна, уражліва. І далей Таццяна рассказала пра тое, што беларуская кампанія «ШАНТЭР» аб'яднала намаганні з Wellness Solutions Pvt, Ltd з Індыі, каб прыўнесці лепшае, што створана навукай і прыродай у жыццё беларусаў і гасцей нашай краіны.

На сайце Цэнтра можна даведацца пра кампанію Wellness Solutions:

Яна створана ў Індыі ў 2002 годзе і ўключае ў сябе Wellness медыцынскія паслугі, Wellness адукацыю, Wellness прадукцыю для здароўя, Wellness кафэ і рэстараны, Wellness

Кіраўнік Цэнтра Аюрведы Таццяна Насачэўская

праграмы для навучэнцаў і для работнікаў, Wellness курорты, а таксама прымае ўдзел у сістэме аховы здароўя ў цэлым. Кампанія мае шэраг філіялаў у Індыі і за мяжой, кліенцкая база налічвае больш за 250 тысяч чалавек. Генеральны дырэктар Wellness Solutions Pvt, Ltd — доктар Шры Кумар Аппукуттан Наір: Прэзідэнт Індыйскай Асацыяцыі дыетолагаў, старэйшы лекар-кансультант у галіне ЛОР хірургіі, а таксама хірургіі галавы і шыйных аддзелаў з больш чым 36-гадовым стажам клінічнай практыкі. Доктар апошнія 15 гадоў актыўна практыкуе нутрытыўную і клеткавую медыцыну, ён пажыццёвы член Індыйскай Медыцынскай Асацыяцыі, Асацыяцыі оталарынголагаў Індыі, Індыйскага Таварыства Чырвонага Крыжа і многіх іншых, валодае міжнароднымі ўзнагародамі і прэміямі ў галіне медыцыны.

Першапарходцы

У Цэнтры працуюць сертыфікаваныя спецыялісты па Аюрведзе з індыйскага рэгіёна Керала, які, мы ўжо казалі, лічыцца сэрцам Аюрведы. Цяпер пад Мінскам іх называюць касмецікамі, а ў Керала — тэрапістамі. З імі заключаны гадавыя кантракты. Таццяна запрашае трох касмецікаў, якія выконваюць усе аздараўленчыя рытуалы ды працэдуры. А чацвёртая, гаворыць, паехала ў Мінск, каб упершыню самастойна пазнаёміцца з горадам. І хоць Цэнтр адкрыўся яшчэ летам, аднак касмецікі і сам доктар Джувін Кенэдзі яшчэ па сталічных вуліцах самастойна не гулялі.

Знаёмімся. Індыйцы стрымана ўсміхаюцца, а калі даведваюцца пра тое, што мы ў Керала бывалі не аднойчы, чулі там мову малаялам, на якой і яны гавораць, пачынаюць глядзець на нас як на добрых знаёмых. І зусім радуюца, калі з нашых вуснаў зрываецца слова «нанні» (з націскам на апошні склад). На дравідскай мове малаялам яно азначае — дзякуй. Мы прывезлі яго з іх радзімы. У штаце Керала многія гавораць на малаялам. У мовы вельмі мяккае гучанне. А Таццяна таксама радуецца: жывуць індыйцы тут адасоблена, рускай і беларускай мовы не ведаюць, зносяцца толькі адзін з адным на малаялам, а з іншымі на англійскай, таму ім надзвычай прыемна сустрэць тых, хто бываў у Керала.

— Яны цудоўныя! — гаворыць Таццяна. — Такія ўсмешлівыя, адкрытыя, а Рэшма наогул — цуд.

Прадставім і вам, шаноўныя чытачы гэтых абаяльных касмецікаў.

Рэшма Сабу — спецыяліст тэрапіі Аюрведы. Яна — прафесіянал. Мае пяць гадоў клінічнага досведу ў галіне Панчакармы. Гэта комплекс ачышчальных працэдур, які мы на сабе выпрабавалі, калі былі ў Індыі. Рэшма вывучылася пры шпіталі Sreedhariyam Ayurveda Hospital, Kerala. Тут яна праводзіць рытуал Нетратарпанам, гэта значыць — амалажэнне вачэй.

У Шрыкалы Шрыкумары, якая да таго ж яшчэ і добра валодае ёгай, пяцігадовы стаж працы ў Індыі і па-за яе межамі ў галіне Аюрведы і Панчакармы. Яна таксама, як і яе калегі, выйграла конкурс, каб прыехаць у Беларусь і мець магчымасць тут працаваць.

Адарш Мохандас — з сям'і, якая прытрымліваецца Аюрведы, таму з дзяцінства добра ведае, што гэта такое. Адукацыю атрымаў на прафесійных курсах пры Міністэрстве развіцця кадравага патэнцыялу Індыіі. Працаваў у кампаніі Wellness Solutions. Цяпер ён у камандзе SHANTER Wellness, дзеліцца сваім васьмігадовым клінічным досведам.

Гокул Крышнан таксама нарадзіўся ў Керала, атрымаў дыплом у галіне Аюрведы і Панчакармы ў каледжы Ashramam Training College Idukki.

Пра галоўнае ў сэрвісе

— Таццяна, як пра ваш Цэнтр пачынаюць ведаць людзі?

— Сюды ў асноўным тыя прыходзяць, хто ведае Аюрведу, хто яе шукае. А знаходзяць, як і вы, праз наш сайт. Яшчэ мы размяшчаем інфармацыю ў інстаграм і фэйсбуку. Працуе і так

Намастэ — традыцыйнае вітанне індыйцаў

званае «сарафаннае» радыё. Сёння з'явілася жанчына, якая пачула добры водгук пра аздараўляльны эфект ад працэдур ад сваёй знаёмай, таму вырашала і сама прыйсці.

— Ці многа людзей у вас пабывала?

— Пакуль не так многа. Мы ж адкрыліся зусім нядаўна. Але імкнемся сябе папулярызаваць. Наш доктар нават удзельнічай у перадачы на тэлеканале АНТ, ёсць ужо і артыкулы пра нас.

— А вы самі ведалі пра Аюрведу да таго, як узначалілі Цэнтр?

— Да таго, як пачала тут працаваць — не ведала. Цяпер я ў захапленні ад гэтай навукі, як быць здаровым. І ў гэтых людзей, індыйцаў, проста ўлюбілася. Яны такія добразычлівыя, шчырыя. Аднойчы да нас прыйшла бабуля. І я ўбачыла, як Рэшма ўзяла яе пад ручку і кажа: «hello, mam!», а потым асцярожна павяла ў пакой для працэдур. Мяне так узрушыла сардэчнасць і добразычлівасць Рэшмы. Вось гэта, падумала я тады, і ёсць сэрца, сутнасць сапраўднага сэрвісу без выбудаваных алгарытмаў. Гэта, на мой погляд, галоўнае ў ім. У мяне сярэдняя медыцынская адукацыя, ёсць і значны досвед працы ў медыцыне. А яшчэ маю вышэйшую адукацыю ў галіне маркетынга. Вось цяпер набытыя веды спрабую прымяніць і тут. Дарэчы і сама планую займацца ёгай, таксама выпрабаваць на сабе працэдуры, якія мы прапануем нашым гасцям.

— Наколькі тое, што вы прапануеце, адпавядае аутэнтычнай Аюрведзе?

— Мы імкнемся. Нездарма ж тут працуюць сапраўдныя спецыялісты па Аюрведзе. Яны праводзяць усе тыя працэдуры ды рытуалы, што ёсць у Керальскіх аюрведычных цэнтрах. Напрыклад, нашы касмецікі працуюць на тых жа маслах. Перад пачаткам рытуалу здзяйсняюць малітву. Нашы касмецікі — індусы, пакланяюцца богу Шыве. Наогул усе працэдуры ў Цэнтры аўтэнтычныя. Ёсць у нас і паравая лазня. Ну вы ж, пэўна, яе таксама наведвалі. І меню адпавядае тым патрабаванням Аюрведы, якія вызначыць доктар Джувін. Ён праводзіць персанальныя кансультацыі з пульсавай дыягностыкай, па якой вызначае тып канстытуцыі, рэкамендуе, як лепш харчавацца і аздараўлівацца.

Доктар Аюрведы Джувін упершыню сустрэўся з зімой

Пасля знаёмства і размовы з касмецікамі ды Таццянай накіроўваемся ў кабінет доктара Джувіна Кенэдзі. Зносімся з ім з дапамогай перакладчыцы Дар'і.

Доктар Аюрведы Джувін Кенэдзі, дарэчы ён і ёгу праводзіць у Цэнтры, паведамляе Таццяна, скончыў медыцынскі ўніверсітэт The Tamil Nadu Dr. M. G. R. Medical University, мае доктарскую ступень у галіне інтэгратыўнасці медыцыны. Ён, па словах Таццяны, актыўна практыкуе нутрытыўную ды экалагічную медыцыну ў Індыі, таксама за мяжой на працягу многіх гадоў. Спецыялізуецца на вывучэнні хранічных захворванняў, прызнаючы біяхімічную ўнікальнасць кожнага чалавека для складання індывідуальных планаў аздараўлення з выкарыстаннем дыеты і натуральных біялагічна актыўных дабавак разам з аптымізацыяй гарманальнага фону. За аснову аздараўлення доктар Джувін бярэ інтэгратыўны падыход да здароўя, збалансаванае рацыянальнае харчаванне, прафілактыку захворванняў і пераасэнсаванне прынцыпаў падыходу да здароўя ў цэлым. Ён улічвае ўсе фактары, якія ўплываюць на здароўе, самаадчуванне і хваробы. Сярод такіх фактараў вылучае розум, дух, цела, а

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Доктар Аюрведы Джувін Кенэдзі ў момант пульсавай дыягностыкі

таксама нашае асяроддзе. Доктару Джувіну падабаецца натхняць і навучаць іншых мастацтву і навуцы інтэграванага падыходу да здароўя, і ён лічыць, што лячэнне прычын і сімптомаў захворванняў можа дапамагчы людзям зноў здабыць радасць і сэнс у іх жыцці.

Доктар Джувін родам з поўначы Керала, з горада Канор, з сям'і католікаў. Бацька ягоны працуе ў банку, а мама — на пошце. Ёсць яшчэ і малодшы брат, яму 12 гадоў. Доктар таксама вельмі ажыўляецца, калі чуе, што мы аздараўліваліся ў Індыі. І нават бываў у тых месцах. Пра Беларусь раней ведаў, як пра краіну ў цэнтры Еўропы. А калі прыехаў у ліпені сюды, то быў уражаны тым, што Беларусь вельмі падобная на штат Керала, асабліва на тое месца, дзе ён нарадзіўся: шмат лясоў, азёраў, свежае паветра, наогул вельмі багатая прырода.

Нам чуць тое вельмі прыемна. Жартуем: толькі ў Керала крыху цяплей… І дружна смяёмся. Доктар кажа, што першы раз у жыцці пабачыў снег. І на сабе адчуў, што такое зіма. Гэтая пара года яму спадабалася. І ён лёгка перанёс нашу мяккую зіму. І беларусы спадабаліся. Яны, удакладняе, больш дружалюбныя. У Керала людзі надта сацыялізаваныя, аб'яднаныя рознымі веравызнаннямі. Ці сябруюць паміж сабой кераль-цы? З талерантнасцю, па словах доктара, ёсць праблемы, асабліва калі пытанне тычыцца рэлігіі ці палітыкі. Гаворыць, што хрысціяне ў Індыі больш міласэрныя, чым іншыя яе жыхары. Рознагалоссі, як правіла, адбываюцца ў мусульманаў з індусамі. І ён па-добраму радуецца, калі мы гаворым пра тое, што ў Беларусі цяпер жывуць прадстаўнікі больш чым 140 розных нацыянальнасцяў, прычым здаўна — у згодзе і міры.

Ёгай доктар займаецца больш дзесяці гадоў. Навучаўся ў майстра па ёзе, які ў сваю чаргу вучыўся ў першай школе ёгі ў Індыі — Кайвелетам. Гэта цяпер адзіны Інстытут ёгі, дзе выкладаюць ёгу аўтэнтычную. Ён — першы і адзіны, дзе пачаліся таксама навуковыя даследаванні ўплыву ёгі на чалавека. Ёсць яшчэ і другая школа ёгі — Біхар. Яна моцная філасофіяй ёгі. І там выкладае — Swami Kuvalyanandha. А імя настаўніка Джувіна — Prahlad Singh. Ёга, лічыць доктар, вучыць кантраляваць свядомасць. Наш розум пастаянна зменьваецца. І ёга вучыць трымаць баланс, раўнавагу паміж гэтымі зменьваннямі. На санскрыце ёга — юдж, што значыць аб'ядноўваць. Ёга праследуе мэту: аб'яднаць цела і свядомасць. Філасофія ёгі дапамагае зразумець, хто мы такія. Іншыя філасофіі вучаць глядзець навокал, а ёга — унутр самога сябе.

Наша гутарка доўжыцца. Мы расказваем доктару пра тое, што ў беларускай мове і санскрыце ёсць многа падобных словаў. Гэта выклікае цікавасць у субяседніка. У працяг тэмы ён выказвае меркаванне: Аюрведа — гэта не толькі пра Індыю. Аюрведа была ўсюды. І на тэрыторыі Беларусі таксама. Гэта тыя веды, якія перадаваліся ад бацькі да сына і далей. Распытваем у доктара пра яго захапленні, пра што ў Беларусі хацеў бы даведацца. Беларусь, дарэчы, першая еўрапейская краіна, у якую ён прыехаў. Доктар Джувін цікавіцца гісторыяй. І таму хацеў бы больш ведаць пра перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі. Мы раім Таццяне дапамагчы доктару наведаць Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Дом-музей І з'езду РСДРП. Абяцаем цікавыя ўражанні. Яшчэ доктару блізкія ідэі камунізму. У іх, кажа, многа пазітыўнага. І наогул, ён бы хацеў пазнаёміцца з тым перыядам гісторыі, калі яны ўваходзілі ў жыццё беларусаў. Яшчэ хацеў бы пабываць ва ўсіх замках Беларусі, у Нацыянальнай бібліятэцы, у Троіцкім прадмесці…

Потым доктар Джувін прапануе зрабіць нам пульсавую дыягностыку. Але гэта тэма настолькі цікавая, вартая асобнай увагі, таму мы не будзем пра тое пісаць. Пытаем у доктара, ці заўважыў ён нейкія асаблівыя адхіленні ў здароўі, характэрныя для беларусаў. Ці ёсць заканамернасці ў дысбалансе дошаў? Доша — гэта тыпы энергій, якія ўласцівыя нам, людзям. У кагосьці больш агню — гэта піта. Паветра — гэта вата. А капха — вада і зямля. Для беларусаў, тлумачыць доктар, характэрная піта. Гэта значыць, у нас больш агню, эмоцый. Тое і імгненныя іх успышкі, якія хутка праходзяць. І гэта самы распаўсюджаны тып беларусаў. Але ёсць і людзі-капха.

Меркаванні доктара Джувіна зноў даюць падставу пажартаваць нам пра тое, што, так бы мовіць, у Беларусі холадна, не так горача як у Індыі, вось мы гэтым агнём і грэемся. А ў Індыю, у цеплыню едзем па рэлакс, там свой агонь крыху прытушваем у сезон дажджоў. І абяцаем доктару, што яго агонь пасля вандровак па нашым цудоўным краі — павысіцца. Смяемся, гаворачы: гэта ж будуць эмоцыі! Доктар Джувін згодны.

Ну а тыя, каму цяжкавата ў Індыю дабрацца, могуць завітаць у Цэнтр «Аюрведа», які гасцінна прыме кожнага, хто хоча папраўіць свае здароўе.

Валянціна і Іван **Ждановічы**

НАВУКА РАЗМЯШЧЭННЯ

Калі ў нас у чарговы раз заходзіць размова пра ўдасканаленне сферы гасціннасці, у першую чаргу чамусьці маецца на ўвазе сталіца і абласныя цэнтры. Так, госці па бязвізу прыбываюць да нас праз Нацыянальны аэрапорт «Мінск». У Гродзенскай і Брэсцкай абласцях таксама ёсць тэрыторыі з бязвізавым рэжымам. А што ж невялікія гатэлі ў райцэнтрах?

Паездкі па краіне далёка не заўсёды бываюць шматдзённымі, а разлічваць на звышпрыбыткі ад камандзіраваных не прыходзіцца. Вось і вымушаныя былі ў свой час многія мясцовыя гатэлі пайсці на скарачэнне персаналу і здачу памяшканняў у арэнду. Зрэшты, ужо ў бліжэйшыя пару гадоў сітуацыя можа змяніцца ў лепшы бок. Што для гэтага трэба?

Адраджэнне гатэляў у райцэнтрах, па ідэі, павінна стаць адным з сімвалаў актывізацыі ўязнога і ўнутранага турызму, вынікам рэалізацыі мясцовых ініцыятыў у рамках Года малой радзімы. Прыемна, што пра масавае закрыццё гатэлей размовы ніколі не было і не ідзе. Але за кошт чаго часам яны выжываюць? Свежы прыклад — камандзіроўка ў адзін з райцэнтраў Гомельскай вобласці (не будзем называць горад, каб не крыўдзіць гасцінных гаспадароў). Мясцовым двухпавярховым гатэлем запраўляе камерцыйная арганізацыя. Там відавочна ўмеюць лічыць грошы: за апошнія некалькі гадоў арандатарам быў аддадзены ўвесь ніжні ўзровень, уключаючы памяшканне мясцовага бара, а супрацоўнік цяпер пустуючай стойкі рэсэпшэн прымае гасцей на другім паверсе. Засяляе па папярэдняму званку і рэкамендуе вырашаць з персаналам усе арганізацыйныя пытанні да 21.00. Пазней адкрываць уваходныя дзверы гатэля прыйдзецца самастойна, ключ прыкладаецца ў дадатак да ключа ад нумара.

Хтосьці назаве падобнае стаўленне да пастаяльцаў дзіўным. Хтосьці палічыць такі сэрвіс на даверы свежым трэндам у жыцці невялікіх гатэльных аб'ектаў. А нехта — вымушанай аптымізацыяй. На жаль, для турыстаў у адрозненне ад камандзіраваных падобны варыянт начлегу прымальны хіба што пры вельмі нізкіх коштах. Вось гастэлі і трымаюць гэты ўзровень усімі даступнымі спосабамі. Не зачыняюцца і нават па меры магчымасці абнаўляюць інтэр'еры нумароў.

Сумна тое, што масавы турыст сёння не хоча засяляцца як у празмерна дарагія гатэлі, так і ў самыя танныя. Гэтую тэндэнцыю нагадаў нядаўна старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп Гулый. А намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме Мінспорту і турызму Віталь Грыцэвіч дадаў: атэльерам выгадная загрузка нумарнога фонду не вышэй за 70%, у адваротным выпадку давядзецца выводзіць дадатковы персанал. Але і нумары, якія прастойваюць тыднямі, — таксама не ў радасць. Досвед суседніх краін паказвае: зрабіць запаўняльнасць гатэлей рэгулярнай і прагназуемай можна толькі тады, калі спецыялісты на месцах валодаюць аб'ектыўнай інфармацыяй пра шчыльнасць і змест турпатоку, умеюць фармаваць і накіроўваць яго, арганізоўваць фестывалі і іншыя варыянты прыцягнення публікі, прасоўваць мясцовыя маршруты для падарожнікаў, развіваць экатурызм.

Арганізацыя падзей рознага маштабу (івэнт-індустрыя) для Беларусі апошнім часам — не толькі яркая ідэя, але і досыць цікавая сфера дзейнасці. Важная агаворка: яе развіццё немагчыма без стварэння правільнай інфраструктуры і кансалідацыі сферы гасціннасці, выпрацоўкі адзінай сістэмы стандартызацыі і сертыфікацыі паслуг, эфектыўнага супрацоўніцтва з замежнымі калегамі і партнёрамі. Першы міжнародны івэнт-форум — важная дзелавая пляцоўка для выпрацоўкі ўзаемавыгаднай праграмы дзеянняў у гэтай сферы — прайшоў у Мінску 21–22 лютага. Для гатэляў у глыбінцы гэта быў добры шанец нагадаць пра сябе і прапанаваць свае паслугі ў сферы падзейнага маркетынгу. І выдатная магчымасць абзавесціся новымі і, галоўнае, сталымі кліентамі.

Аляксандр **Несцераў**

АДНА ЦЁПЛАЯ ГІСТОРЫЯ

З сям'ёй Фёдаравых мы сустрэліся ў дні, калі ў Мінску праходзіў чарговы Coffee Fest Belarus. Крыху пазней даведаліся, здзівіўшыся: Ірына Фёдарава, кандыдат біялагічных навук і наша добрая знаёмая на Gastrofest «Кава-2019» была адным з удзельнікаў фокус-группы і выбірала сярод барыста самага харызматычнага. І наогул — змяніла прафесію.

Гэтыя крэслы-гушкалкі — гонар гаспадыні

Там, у адной з мінскіх кавярняў, дзе яна гаспадарыць, — атмасферна, як цяпер кажуць. Цёпла, светла, душэўна… І нават днём для гасцей запальваюцца свечкі на століках — для камфорту. Зручныя канапы. Пледы ў клетку. Багацце мяккіх падушак рознай формы і памеру ў каляровых вязаных чахлах — што называецца, у тэму. За адным з вокнаў — сцяна ў метры ад кавярні: памяшканне паўпадвальнае. Дзякуючы знаёмым мастакам, якіх Ірына запрасіла, сцяна тая ператварылася ў вялікую карціну з велізарным дрэвам, аблокамі-круасанамі… Прычым на ёй адлюстраваны працэс нараджэння свету, які творыцца спіцамі майстрыхі-вязальшчыцы. А на вузенькім зялёным дыване перад карцінай — сімпатычныя цацкі. Ірына сама іх звязала, і, спрытна ступіўшы цераз падваконне на тэрыторыю казкі, нам іх падала: паказаць.

Цэнтр зальчыка ўпрыгожваюць два чырвоныя падвесныя крэслы, што мацуюцца на ўстойлівых металічных каркасах. Яны — увасобленая мара і гордасць маладой гаспадыні. Успамінае Ірына: як адкрылі яны з мужам кавярню, то з паўгадзіны проста сядзелі ў гэтых зручных гушкалках. І мы на сабе адчулі: у іх лунаеш, мякка пакалыхваючыся, быццам на воблаку. Дарэчы, ёсць і госці, што ходзяць спецыяльна — пагушкацца, смакуючы класічную каву-эспрэса, латэ ці модны флэт уайт.

На тым самым падваконні, за якім карціна — кошык з клубкамі пухнатых нітак і пруткамі. Гэта, тлумачыць Ірына, для тых, хто захоча нешта звязаць. Альбо проста «злавіць» рэлакс. Агульна вядома: вязанне вельмі дабратворна ўплывае на нервовую сістэму, хутка здымае стрэс, супакойвае ды ўзносіць у стан бесклапотнасці.

Справа ж ад увахода ў кавярню, за вешалкамі — дзіцячы куток з аплікацыяй ката на сцяне. Па ўсім відаць: гасцям з малымі тут рады. Для іх, пакуль дарослыя атрымліваюць задавальненне ад кавы, ёсць дзе паглыбіцца ў свае радасці: папера, фарбы, алоўкі, фламастары для малявання, цацкі, маленькі столік і стульчыкі… На сценцы ў тым кутку ёсць тэлевізар: калі мамы не супраць, малыя могуць пагля-

Ірына і Аляксандр Фёдаравы — гасцінныя гаспадары

дзець мультфільмы. Ці проста пагуляць, пакуль старэйшыя атрымліваюць асалоду ад гарачага напою з круасанам ці слойкай. Водар кавы і свежай выпечкі запаўняе ўсю прастору, настройвае на хюгэ.

У стылі хюгэ

Для тых, хто не ведае: гэтае дацкае слова — hyggelig — азначае здольнасць цаніць звычайныя задавальненні жыцця ды атрымліваць асалоду ад бягучага імгнення. Падобна да таго, падумалася нам, што Ірына Фёдарава з мужам ствараюць у сваёй кавярні своеасаблівую «прастору пагружэння ў шчасце й задавальненне», а таму й мы трохі паглыбімся ў саму яго філасофію.

Упершыню слова hygge, чытаем у інтэрнэце, з'явілася ў пісьмовай дацкай мове на пачатку XIX стагоддзя. Паходзіць ад такога ж нарвежскага, у якім азначае «дабрабыт, дастатак». Цяпер словам вызначаюць асаблівую атмасферу ды адчуванні, звязаныя са шчасцем. Падрабязна пра тое напісаў у кнізе «Hygge. Сакрэт дацкага шчасця» заснавальнік і кіраўнік дацкага Інстытута даследавання шчасця Майк Вікінг (Meik Wiking). Дарэчы, курс дацкага хюгэ ўжо выкладаюць і ў адным з каледжаў Вялікабрытаніі, а па ўсім свеце з'яўляюцца крамы, кафэ, пякарні ў стылі хюгэ.

Мабыць, і для мінскай «Кофты» гэты стыль уласцівы. У дэкоры памяшкання — аніякай вычварнасці, халоднага гламура. Цёплыя светлыя колеры цешаць вока, далоні міжволі цягнуцца адчуць фактуру мяккай пражы. Для хюгэ, дарэчы, важныя станоўчыя тактыльныя адчуванні. Пах круасанаў, дастаўленых у Мінск з Францыі ды тут і дапечаных, нібыта лашчыць нюх і абуджае асацыяцыі з чымсьці вельмі знаёмым, прыемным і бяспечным. Ну, чым не хюгэ, кажам Аляксандру ды Ірыне: і прысмакі ў вас, і кава, і гарачы шакалад, і нават глінтвейн у меню, і сама хатняя, сямейная атмасфера! Усё падабрана як мае быць для прыемнага адпачынку. Урэшце, як і сама назва кавярні — «Кофта».

Пра дацкае хюгэ гаспадары кавярні «нешта чулі», аднак інтэр'ер яе «пад хюгэ» не падладжвалі, больш арыентаваліся на ўласныя ўяўленні пра ўтульнасць і тое, з чаго яна складаецца. Бо ім абодвум добра вядома, што такое хатняя ўтульнасць. Кожны з іх вырас у сям'і, дзе шанавалі яе і стваралі. Нам не раз даводзілася бываць у загарадным доме бацькоў Ірыны, які пабудавалі яны самі непадалёк ад Мінска. Андрэй Уладзіміравіч Рыцік — патомны вайсковец, інжынер-механік, ужо ў адстаўцы, Святлана Георгіеўна — інжынер-будаўнік. Сёння абодва яны ўжо, як гаворыцца, на заслужаным адпачынку. Але паняцце адпачынку ну ніяк не стасуецца з гэтымі людзьмі: яны заўсёды поўныя планаў, якія з упартасцю ўвасабляюць у жыццё, актыўныя, бадзёрыя, пазітыўныя.

Пазнаёміліся мы на адпачынку ў Румыніі. Помніцца яшчэ, як у турыстычным аўтобусе, на якім ехалі па Еўропе да месца адпачынку, Андрэй спыніў хамства аднаго з пасажыраў: ён вёў сябе непрыстойна. Прычым крыху пазней тая актыўная жыццёвая пазіцыя Андрэя Уладзіміравіча дапамагла й кіраўніку групы прыняць правільнае рашэнне: высадзіць з аўтобуса гора-турыста, які груба ігнараваў правілы паводзінаў. Андрэй нас уразіў і скарыў адвагай, рашучасцю і сапраўдным мужчынскім падыходам да сітуацыі. З тых часоў і падтрымліваем добрыя стасункі.

Так, свой дом і сад пры ім, як вядома, патрабуюць пастаяннага ўкладання сіл. Таму і пад'ём ва Уладзіміравіча ранні: у 6 раніцы штодзень на нагах. Абыходзіць уладанні, глядзіць, што дзе трэба зрабіць, падкруціць у хатніх, садова-агародных механізмах у першую чаргу ў залежнасці ад сезона. Да таго ж і майстраваць любіць, нават домік для котак з падагрэвам на ўчастку збудаваў. І Святлана — сама сабе дызайнер і майстар. Інтэр'ер дома — справа яе рук і густу. Выдатна шые і мадэлюе вопратку. Андрэй таксама ў тым, што называюць творчасцю, не пачатковец: і дэкаратыўна-прыкладную асвоіў, і карціны алеем піша, і з вялікім гумарам апісвае ў апавяданнях, аповесцях былі-небыліцы з часоў сваёй нялёгкай афіцэрскай службы.

На першы погляд падасца: мы адышлі далёка ад самой «Кофты». Але ў гэтай кававай гісторыі ёсць і цікавая перадгісторыя, і мы ўсяго толькі, як кажуць, глядзім у корань. Бо не сакрэт: прыклад бацькоў шмат у чым задае вектар руху па жыцці для дзяцей і нават унукаў. Дык вось, працягваем пра сям'ю Рыцікаў-працаўнікоў. А як прыемна пасядзець у іх на ўтульнай верандзе пры доме, вокны якой выходзяць на шырокае поле! Па ім, здараецца, у ранішнюю пару ці адвячоркам ходзяць, а то і прабягаюць ласі і казулі, зайцы, лісы, дзікі. Домік для котак — таксама экзотыка. А сад з лаўкамі ў розных кутках, дзе можна пры жаданні пабыць аднаму, а сажалка рукатворная… І пра жыццё Рыцікаў у Забайкаллі, дзе яны прымудраліся на дачы вырошчваць велізарную бульбу і трускаўкі, таксама чулі мы аповеды. І пра тое, як дзяўчынкі Каця з Ірай атрымалі там у пару сталення цудоўнае працоўнае выхаванне.

Аднак вернемся ва ўтульную кавярню, дзе малодшыя Фёдаравы, двайняткі Марыя ды Уладзіслаў (з абавязковым націскам на і) ужо не раз пабывалі. Ім пакуль што дзіцячы сад, як кажуць, не заходзіць: прыхворваюць, таму атрымліваюць дамашняе выхаванне. Дзядуля Андрэй з бабуляй Святланай, як толькі ўнукі на свет з'явіліся, дапамагаюць маладой сям'і: унукаў нянькаюць. Ідэю з кавярняй бацькі Ірыны падтрымалі асцярожна: малым бо ледзь па чатыры гады споўнілася.

— Адны б мы ніяк не справіліся, калі б нас бацькі з абодвух бакоў не падтрымалі: як фінансава, так і маральна, — прызнаецца Ірына. — Хоць працаваць нам не прывыкаць, але ў бізнэсе, як вядома, свае жорсткія законы. Слабым тут ніяк не ўтрымацца, а вось дзе ёсць каманда — там ужо сіла…

Тым часам яна запальвае свечкі на адным са століка, рыхтуючыся да размовы. А «свячны» рытуал, на думку датчан, і ёсць найпросты спосаб стварыць хюгэ. Прычым, удакладняюць спецыялісты Інстытута даследавання шчасця, амаль 30% апытаных жыхароў Даніі робяць тое штодзень. Траціна датчан аддае перавагу таму, каб запальваць адразу больш за пяць свечак. Гаворым пра тое, і былая супрацоўніца аднаго з акадэмічных інстытутаў тут жа, злёту схоплівае сутнасць: «Выходзіць, мае бацькі, ды і многія з нас інтуітыўна адчуваем, што такое хюгэ. Толькі называем гэта інакш. Бо і ў Беларусі ж зімой і восенню замала сонца, як і ў Даніі… Таму й свечкі мы запальваем, і сяброў прымаем. А добрая выпечка — даўні канёк нашай сям'і! Мы з Кацькаю з дзяцінства пячэм, вырабляем пірагі. Таксама і гасцей любім…»

Аляксандр і яго Ірына, хоць і маладыя, але ж ведаюць: зносіны ў сацсетках апрыёры не заменяць нам рэальныя зносіны з сябрамі, роднымі. Таму ў канцэпцыі «Кофты» якраз і закладзены цёплыя сустрэчы з сябрамі, а не толькі кавaванне «сола». І кола сяброў — таксама ж важны элемент у шматфарбнай мазаіцы хюгэ.

Магчыма, з часам Ірына, ужо як даследчыца, паспрабуе асэнсаваць свой «кававы» досвед і пра хюгэ па-беларуску напіша кнігу. Яна так захоплена цяпер новай справай (кавярня ж адкрылася зусім нядаўна), што казаць пра каву, яе гатункі, пра ідэі, што месцяцца ў яе галаве, можа, прызналася, бясконца. У чым пераканаліся і мы.

Акцэнты не ў модзе, а ў пачуццях

Пра адкрыццё кавярні даведаліся мы ад бацькоў Ірыны, з якімі хоць і не сустракаліся пару гадоў, ды сувязі не гублялі. Вось дык «паварот» у лёсе Ірыны Рыцік, а цяпер Фёдаравай! Яна ж працавала ў навуцы, абараніла кандыдацкую дысертацыю. Удакладнілі тэму: «Іксодавыя клешчы на ўрбанізаваных тэрыторыях Беларусі». Выпусціла кнігу, паспяхова выяўляла сябе як старэйшая навуковая супрацоўніца ў акадэмічным Інстытуце заалогіі — цяпер уваходзіць у Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах. І вось яны разам з мужам, хімікам па адукацыі (ён таксама з кандыдацкай, хоць і не абароненай), раптам сышлі ў зусім іншую сферу. Зразумела, кажам, тэндэнцыя модная. Цяпер Мінск ледзь не «кававай Мекай» становіцца: шумяць фэсты, фармуючы тут кававую культуру. Нават кавярню з беларускімі робатамі-барыста ўжо анансавалі: неўзабаве адкрыецца ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. Але робату — робатава, як той казаў. А Фёдаравы — што шукаюць яны ў гэтай «ненавуковай» сферы?

— Справа не ў модзе, — тлумачыць Ірына. — Я сама — каваманка. Раніца мая без кавы не пачынаецца. П'ю толькі якасны напой, мне падабаецца, калі пасля адчуваю багаты паслясмак. Піць каву — цэлы рытуал. І, натуральна, прыемна, як іншыя таксама падзяляюць мае прыхільнасці. Аднойчы ў дэкрэтным адпачынку гуляла я з каляскаю, дзеткі пасопвалі. А мне так захацелася кавы! Але тут, на новай вуліцы Пятра Мсціслаўца — ніводнай кавярні. У Дана Мол (новы гандлёвы цэнтр у мікрараёне. — **Аўт.**) з 50-кілаграмовай каляскай мне далекавата. Часам брала з сабою каву ў тэрмасе. Але ж гэта не тое задавальненне. А ўвечары Сашу

й кажу: давай я пайду на курсы барыста — хачу навучыцца каву варыць правільна. Саша, нядоўга думаючы, прапанаваў адразу на гаспадыню кавярні вучыцца. Ён у мяне стратэг.

— Так і было: я думаю на перспектыву, — падключаецца да нашай гутаркі Аляксандр. — Гэта ў мяне ў натуры. Іра на курсы пайшла, займалася ў вячэрні час, і ёй спадабалася. Потым у нас пачаўся мазгавы штурм. І доўжыўся ён цэлы год.

Ірына

Ці не шкада было ёй пакідаць інстытут? Аказваецца, не шкада…

— Я калі сыходзіла, то мая кіраўніца дысертацыі, доктар біялагічных навук Лізавета Ігнацьеўна Бычкова сказала: «Я цябе разумею. Раз у дзесяць гадоў у жыцці трэба штосьці кардынальна зменьваць. Ты праварылася тут, старшай навуковай супрацоўніцай стала. Але памятай: мы цябе заўсёды назад прымем». Я, вядома ж, вельмі сумнявалася, калі ўсё пачыналася: «общепит» і навуковец — як сумясціць? Дызайнеры, што кавярню афармлялі, гледзячы на маю лёгкую разгубленасць, неяк запыталі: а вы любіце людзей карміць? Калі так, то ўсё ў вас атрымаецца. Тая фраза й дала мне крылы. Вядома ж, люблю! Бясспрэчна! Мне падабаюцца госці, я іх частую з задавальненнем. Ну вы ж ведаеце, гэта ў нас традыцыя сямейная…

Самай вялікай праблемай для Ірыны з Аляксандрам была… канцэпцыя: абодва ж навукоўцы. Пад якім «соусам» тую каву гасцям прапаноўваць? Чым яны менавіта прыцягнуць у сваю кавярню, калі вакол, у Мінску ўжо ёсць столькі ўсяго рознага?

— Мы адкрываліся з перспектывай развіцця, нават сваю таварную марку зарэгістравалі. Але нейкай фішкі ўсё ж не хапала. Хацелася зрабіць нешта такое, чаму аналагаў няма сярод кавярняў Мінска. Месяц думалі. А назва нарадзілася неяк нечакана, недзе апоўначы. Паклалі дзяцей спаць, Саша таксама пайшоў. Я села, узяла конаўку, спіцы, пражу й звязала кофтачку для конаўкі. Вось так і нарадзілася назва: «Кофта». Кофта — тое, што сугучна з кавай перш за ўсё (у рускай мове перагукваюцца словы кофе і кофта. — **Аўт.**). Кофта — гэта цяпло і ўтульнасць, але, як Саша пажартаваў, усё ж не трыкатажная крама. Кофта — гэта й сучасная стыльная бабуля са сваёй любоўю, смачнай выпечкай, цеплынёй. І мы пачалі тэму круціць. З гэтага слова, як ад малога зерня, расце наша маладое кававае дрэва.

Ці прымяняе Ірына ў афармленні, у адладжвані працы кавярні свае навуковыя пазнанні? Кажа — на кожным кроку. І што цікава: нават пра кляшчоў яна збіраецца маладым мамам распавядаць. Бо цікавасць да гэтай тэмы, асабліва ў вясновую пару, велізарная, і таму кампетэнтная размова аб «правілах клешчавой бяспекі» будзе да месца на сустрэчах пад каву. Спадзяецца Ірына, што мамы й дзецям, сяброўкам раскажуць, як правільна сябе паводзіць у сезон, калі тыя крывасосы вельмі актыўныя. І ў цэлым уменне вучыцца Ірыне таксама спатрэбілася. Тлумачыць:

— Мне вельмі шмат дала мая навуковая школа. Бо навуковая праца — гэта ж уменне з вялізнага патоку інфармацыі вычляняць галоўнае. Навыкі, якія атрымала пры той працы над дысертацыяй, усе тут рэалізуюцца. Перш за ўсё, гэта праца з дакументамі. Хоць па гэтай частцы больш працуе Саша: у яго адміністрацыйная дзейнасць, у мяне — гаспадарчая й творчая.

Наталля Калесніковіч і Аляксандр Барычэўскі — аўтары карціны

Аляксандр

Саша яе, Аляксандр Фёдараў, вучыўся ў Беларускім дзяржуніверсітэце на хімічным факультэце. А ў Інстытуце біяарганічнай хіміі аспірантуру закончыў, працаваў у лабараторыі прыкладной біяхіміі, на кафедры высокамалекулярных злучэнняў. Прычым тэмай займаўся перспектыўнай: стварэннем фільтраў, якія ачышчаюць кроў ад таксінаў — фільтры, як вядома, выкарыстоўваюцца ў апаратах пералівання крыві. А пазней у рамках сямейнага бізнесу дапамагаў бацькам. Там, прызнаецца, і набыў досвед, які вельмі спатрэбіўся пры стварэнні кавярні.

У бацькоў Аляксандра родавыя карані з-пад Ракава, што ў Валожынскім раёне. Як вядома, у тых месцах сфармаваўся даволі арыгінальны культурны асяродак, ёсць багатыя культурныя, побытавыя традыцыі. У тым ліку і традыцыі «сваёй справы», прадпрымальніцтва: бо ў ваколіцах Ракава, былога заходнебеларускага мястэчка, праходзіла мяжа, што падзяляла Беларусь пасля Брэсцкага міру 1921 года на Заходнюю і Усходнюю. Тата яго, Фёдараў Аляксандр Мікалаевіч, — кандыдат медыцынскіх навук, мама, Ганна Цімафееўна — біяфізік. Прабабуля па лініі маці была з Лукашэвічаў — заможнай шляхты. Аляксандр пакуль не ведае сваёй генеалогіі так дасканала, як Ірына, ды, кажа, з часам тым зоймецца: дзеці ж падрастаюць. Бо і ў нашых родавых каранях таксама ёсць важная частка нашай жыццёвай сілы. Дарэчы, ён вельмі ўдзячны сваім бацькам за матэрыяльную і маральную падтрымку ў адкрыцці кавярні.

— Мы пазіцыянуем сябе як установа, якая развівае кававую культуру, — гаворыць Аляксандр Фёдараў. — У нас усе барысты ведаюць, што і як яны вараць, прычым вытрымліваюць тэхналогію па секундах і па мілілітрах. А хіба ж можа быць інакш, калі ў іх працадаўцы самі з лабараторый, «ад навукі»! Яны гасцям нашым, калі тыя пажадаюць, распавядаюць, што і як робяць, як абсмажана зерне, якога памолу, ад якога вытворцы…

Ці лёгка ім з Ірынай агульную справу рабіць? І ці мог ён прадбачыць, што жонка ягоная здольная на такі рызыкоўна-рамантычны крок, як уласная кавярня?

— Я ведаў, што ў нас атрымаецца. Мы ўжо сем гадоў разам. А я гулец, як ужо казаў, на доўгатэрміновыя дыстанцыі. І планы мае стратэгічныя. У гэтым і спорт дапамог — я займаўся футболам, кунг фу, шахматамі, більярдам. Цяпер агульная справа нас аб'ядноўвае. У ёй важна, пераканаліся мы, падзяліць сферы ўплыву й не падрываць аўтарытэт адзін аднаго. А таксама не выпінаць сябе за кошт іншага. Наш тандэм — гэта творчы тандэм, які дае добры, якасны, запатрабаваны на рынку прадукт. Іра — гаспадыня, дырэктар, а я — менеджэр па развіцці. Вось кавярню мы адкрылі, цяпер і пра школу барыста падумваем. Я разумею, што кавярня — гэта рызыка, якая, як кажуць, справа высакародная. Але, каб мець поспех у бізнэсе, высакароднасці і захопленасці малавата. Ірына таксама разумее гэта. Але я не магу не цешыцца, не захапляцца, назіраючы, як прыгожа выходзіць яна да гасцей кавярні, пачынае з імі зносіцца. Мая жонка робіць гэта з такім зайздросным зачараваннем, нібыта ўсё жыццё кавярняй займалася.

Месца з душою. Падрабязнасці ад гаспадыні.

З усімі маю зносіны, трымаю зваротную сувязь. Кожны, хто заглядае да нас — наш госць. Прыйшла неяк дзяўчына, пытаецца: а што будзеце летам рабіць, калі цёплая кофта

Барыста Павел і Марына — віртуозы сваёй справы

не патрэбная? Разумею яе, як і тое, што ад падушак вязаных летам можа быць горача. Ды не буду ж я сакрэты раскрываць, як улетку ўсё ўладкуецца. Кофта ж бо не толькі з зімой ды холадам асацыюецца, мы яе і летам накідваем. Кофта — перш за ўсё ўтульнасць. А лета ў нашай кавярні яшчэ не было: мы толькі ў снежні 2018-га адкрыліся. Магчыма, да лета я ўсё тут у халаднаваты шоўк апрану. Ідэй вельмі многа, ледзь месцяцца ў галаве. Не сумняваюся, інтуіцыя падкажа, як і што зрабіць. Бо я люблю карміць людзей…

Пажылая пара ў адзін з выхадных прыйшла да нас. Шаноўныя людзі былі здзіўлены і захоплены. Казалі: за савецкім часам усё было па-іншаму. Ён, кандыдат фізіка-матэматычных навук, як даведаўся, што я таксама кандыдат навук, сказаў, сыходзячы: калі чалавек дамагаецца поспеху ў навуцы, то ён даб'ецца поспеху ўсюды. А яшчэ адна пажылая дама прыязджае з далёкага ад нас раёну Мінску — з Каменнай Горкі. І сядзіць падоўгу, смакуючы каву. Кажа: найлепшая ў горадзе…

Людзі любяць нашу ўтульнасць. І я тут не працую — я адпачываю. На нагах па 12 гадзін, і мне гэта падабаецца. Да меркаванняў гасцей кавярні, вядома ж, прыслухоўваюся: так з'явіліся тыя вязаныя трусікі на траўцы ля сцяны з карцінай.

Карціну на сцяне, што бачна праз вітражнае акно, напісаў мастак Аляксандр Барычэўскі разам з Наталляй Калесінковіч па матывах твораў беларускай мастачкі Ганны Селівончык. Паўтара месяца яны працавалі. Спачатку я ідэю — акультурыць сцяну — агучыла. Потым Аляксандр прыехаў, паглядзеў, усё зразумеў і сказаў: даверся, усё зраблю, табе спадабаецца. Я рызыкнула, даверылася — нават эскізаў не было. Аднойчы прыйшла і ўбачыла: круасаны ляцяць… Шмат пазітыву. І мне адразу ўсё безумоўна спадабалася.

Наша кавярня — гэта месца з душой, я ўжо неяк пра тое казала. Першапачаткова хацелася, каб гэта быў не камерцыйны праект — такіх кавярняў у Мінску дастаткова. Вельмі доўга я іх наведвала, назірала: вось гэта мне падабаецца, а гэта — ніколькі. Я ўяўляла сабе сваю кавярню з асаблівай цёплай атмасферай. Таму ўсе дэталі інтэр'ера выбіраліся індывідуальна, усё ствараласяўручную. Вось, напрыклад, на тое, каб развесіць ніткі над барнай стойкай, спатрэбілася шэсць гадзін. Я сама гэта рабіла. Саша лесвіцу перастаўляў і часам яе падтрымліваў.

У афармленні нам дапамагала дызайн-студыя інтэр'ера ILEDA. Многія дэталі, у тым ліку аплікацыя з катом, якую цяпер дапаўняюць ліхтарыкі, на сцяне ў дзіцячай зоне — іх ідэя. А гузікі на чахлах да крэслаў рабіў мой тата.

У нас тры барыста. Павел — настаўнік барыстыкі, каватрэнер, праз яго 500 вучняў прайшло. Марына — барыста з пяцігадовым стажам. Наташа — зусім юная, але ўжо выдатна разбіраецца ў каве. Праца барыста — гэта ж і знаёмства з кававым зернем. Калі пачынаеш працаваць, то разумееш, што гэта не банальны напой, не горкая чорная субстанцыя. Кава — напой складаны: у ім жа каля 800 араматычных і смакавых складнікаў.

Мне смажаць кававае зерне спецыялісты фірмы «Singl Step». Само абсмажванне — складаны працэс. Шмат каму здаецца, што абсмажыць каву — гэта як семачкі. Аднак тут шмат што трэба ведаць: і шчыльнасць зерня, і на якой вышыні, дзе тая кава расла… Майстар павінен раскрыць

смакавы патэнцыял зерня, а яго ж лёгка й загубіць. Каб зварыць добрую каву, трэба ўсё пралічыць, гарманічна суаднесці.

У кава-фэстах пакуль не прымаем удзел: ранавата, бо і года не прайшло. Раз на месяц нас запрашаюць на павышэнне кваліфікацыі. Я ж сама павінна разбірацца ў смаку, бо аддаю перавагу толькі якасным прадуктам. Ёсць у нас і спецыяліст па падборы персаналу. Я павінна быць упэўненая ў людзях. Цяпер каманда набрана, і пакуль я задаволеная маімі барыста.

Адышлі ў нябыт у Беларусі тыя часы, калі велізарныя цяжкасці былі пры афармленні бізнесу. Прынамсі, у нас усё праходзіла мякка, інтэлігентна.

Мы — праціўнікі агрэсіўнай рэкламы. Нам важней, як спрацуе «сарафаннае радыё»: як хваля цікавасці да нашай «Кофты» пойдзе «ў народ», закране струны душы тых, хто сапраўды здольны на тонкія пачуцці, хто шануе добрую каву і спадарожную яе смаку атмасферу. Мы ўваходзім у кававы свет пяшчотна і мякка. Ёсць у нас старонка ў Інстаграм, а сайт пакуль яшчэ ствараем.

Нашы дзеці-двайняткі вельмі любяць бываць у кавярні. Бацькі таксама сюды прыязджаюць. Мы бачым, як яны намі ганарацца. І вельмі, паўтаруся з удзячнасцю, нам дапамагаюць.

Бывалі ўжо дні, калі месцаў у кавярні нашай не было: госці пад дзвярыма чакалі. Не заўсёды можна прадбачыць плынь гасцей. Памятаю, неяк тры кампаніі па чалавек пяць зайшлі — вось зала й напоўнілася. У нас тут недалёка й Дом міласэрнасці, і Нацыянальная бібліятэка прама ад вокнаў нашай кавярні бачная, так што народ цікавы па гэтай вуліцы ходзіць. У выхадныя асабліва людзей шмат.

У развіццё кававай культуры ў Беларусі я веру. І мне здаецца, што яна цалкам асаблівай будзе. З часам.

Валянціна і Іван **Ждановічы.**
Фота Івана **Ждановіча.**

Цао Вэньсюань:

«ЧЫТАННЕ — ГЭТА ДЗЕЯ, НАПОЎНЕНАЯ РЫТУАЛЬНАСЦЮ»

Сваімі развагамі аб працы дзіцячага пісьменніка, пра тое, што цікавіць юных чытачоў Кітая, дзеліцца вядомы кітайскі празаік

— Як вы лічыце, дзіцячая літаратура, дзіцячае чытанне ці не пацярпелі паражэнне ў бітве з інтэрнэтам і забаўляльнай індустрыяй, якія захапілі дзяцей?

— Развіццё індустрыі гульняў настолькі імклівае і, сапраўды, вельмі прыцягвае ўвагу. Каб прачытаць адзін літаратурны твор, неабходны тыдзень ці нават болей, а каб паглядзець фільм — дастаткова 120 хвілін. Гэта тэндэнцыя эпохі, аднак яна не супярэчыць развіццю дзіцячай літаратуры. Існуе многа прыгожых класічных літаратурных твораў, якія былі экранізаваны. І наадваварот, многія чытачы пасля прагляду фільма ці серыяла, адаптаванага з літаратурнага твора, звяртаюцца да кнігі. Зачараванне пісьмовым тэкстам велізарнае, і яго не можа замяніць іншы від мастацтва.

— Ці ёсць у мастацкага слова яшчэ рэсурсы, каб адстаяць юнага чытача, не ўпусціць яго цалкам?

— Я заклікаю дзяцей чытаць, бо гэты працэс важнейшы за яго пасярэднікаў. Я не выключаю чытання ў інтэрнэце, але выступаю за вяртанне да ўдумлівага чытання на паперы, гэта для мяне — натуральны і свяшчэнны акт. Кожная работа — не толькі праява старанняў і думак пісьменніка, у кнізе таксама прыхаваны ідэі ілюстратараў, рэдактараў і графічных дызайнераў. Калі бярэш у рукі кнігу, прываблівае дызайн вокладкі: яна стварае жаданне чытаць і даследаваць; перагортваеш старонку і адчуваеш, як прыгожа ілюстрацыі дапаўняюць тэкст, як камфортна гартаць цёплую паперу… А яшчэ чытанне — гэта дзея, напоўненая рытуальнасцю. Так, інтэрнэт зрабіў жыццё больш зручным, у ім нават з'явіліся такія дзіўныя формы як гук, анімацыя і гэтак далей. Але чытанню ў інтэрнэце па-ранейшаму не хапае пачуцця рытуала. Не кажучы ўжо пра такі «пабочны эфект» як зрок дзяцей, які хутка пагаршаецца. На жаль, гэты від «фастфуд»-чытання не спрыяе развіццю моцнага інтарэсу да яго.

— Якія кнігі любяць дзеці Кітаю?

— У апошнія гады рынак дзіцячых кніг усё больш развіваецца. Чытачы малодшага ўзросту любяць кніжкі-расфарбоўкі ды галаваломкі, а ў старэйшых класах чытаюць выдатныя кітайскія і замежныя літаратурныя творы.

— Ці чытаюць дзеці кнігі пра Гары Потэра?

— «Гары Потэр» — кніга, папулярная ва ўсім свеце. Так, яе любяць і дзеці Кітаю. Аднак нашыя аўтарытэтныя ўстановы і настаўнікі, па іх уласным меркаванні, не вельмі паважаюць гэты фантастычны твор. Большую ўвагу яны звяртаюць на літаратурную класіку: яна вытрымала выпрабаванне часам.

— Ці многа перакладаецца ў Кітаі замежнай дзіцячай літаратуры? Наколькі яна папулярная сярод юных чытачоў?

— Шмат якія кітайскія выдаўцы робяць серыі выдатных замежных пісьменнікаў. Ад класічнай дзіцячай літаратуры, такой як «Пітэр Пэн» і «Таямнічы сад», да апошніх твораў, надрукаваных за мяжою, амаль усе з іх перакладаюцца на кітайскую мову. Наша краіна, магчыма, — магутней-

шая ў свеце ў сэнсе мастацкага перакладу. Мы нядрэнна разбіраемся ў сусветнай літаратуры, дзіцячай у тым ліку. Цяпер у Кітаі ўсё больш выдатных арыгінальных твораў, якія атрымліваюць прызнанне і любоў замежных чытачоў. Змест — гэта ключ да твора, імпартаванага ці арыгінальнага. Ён здольны закрануць сэрца чытача. Але, безумоўна, творы кітайскіх пісьменнікаў — асноўны кірунак дзіцячага кнігавыдання.

— Якія тэмы прывабліваюць юных кітайскіх чытачоў: прыгоды, фантастыка, прырода, свет жывёл, гісторыя?..

— У кожнай катэгорыі ёсць творы, якія карыстаюцца найбольшай папулярнасцю. Цяпер на кітайскім рынку дзіцячай літаратуры можна знайсці мноства добрых твораў любога жанру. Я думаю, што незалежна ад яго, пакуль змест твора дастаткова добры, прыцягальны і адаптаваны да ўзросту чытачоў, яны будуць у захапленні. У Кітаі хутка ўкараняецца аўтарскае права. І маленькія кітайскія чытачы могуць сінхронна чытаць амаль усе выдатныя творы з розных краін і рэгіёнаў свету. Да таго ж у Кітаі велізарная колькасць цудоўных арыгінальных твораў сталых пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей дзесяцігоддзямі, як я, ці таленавітых маладых аўтараў.

— Хто для вас прыклад у творчай працы?

— Гэта мой бацька — дырэктар сельскай пачатковай школы і чалавек, які прывіў мне любоў да чытання, а пасля — да пісьма.

— Ці ёсць у вас любімыя дзіцячыя кнігі іншых аўтараў? Ёсць кніга, якую вы перачытваеце?

— Творы італьянца Джані Радары «Прыгоды Чыпаліна» і «Прыгоды Таніна-невідзімкі». Ёсць яшчэ «Мамо» і «Бясконцая гісторыя» нямецкага пісьменніка Міхаэля Эндэ. Ды і «Павуціна Шарлоты» амерыканскага празаіка Элвіна Брукса Уайта.

— Пра што вы яшчэ не расказалі юнаму чытачу? Пра што вашы новыя кнігі?

— Я цяпер працую над дзіўным раманам: пішу гісторыю аб прыватным дэтэктыве і пра яго дзесяцігадовага сына; гісторыю, якая адбылася ў кітайскім горадзе Шанхаі ў 1930–1940-я гады.

— Што б вы параілі пачынаючым дзіцячым пісьменнікам?

— Што тычыцца мяне, то мой матэрыял вельмі шырокі: ён заснаваны на ўспамінах дзяцінства, на досведзе, які я атрымаў ва ўласным жыцці, і, магчыма, нават на выразах, якія вычытваў у творах іншых аўтараў. Я запісваю сваё натхненне, абдумваю, выдзяляю галоўнае, збіраю ўражанні, і тады ў патрэбны час той ці іншы выраз становіцца гісторыяй майго мастацкага тварэння. Пісьменніку заўжды трэба нагадваць сабе, што нельга толькі бясконца пісаць. 70 працэнтаў свайго часу ён павінен аддаваць чытанню, помніць адну простую ісціну: чытанне — прадцеча літаратурнай творчасці, а літаратурная творчасць — гэта вынік чытання.

Гутарыў Кастусь **Ладуцька**

Пісьменнік Цао Вэньсюань

МАТОР! ПАЕХАЛІ!

Пад Дзяржынскам пачаліся здымкі фільма паводле рамана Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча»

Канстанцін Міхаленка ў ролі князя Багінскага і яго сябар гатовыя да палявання

Радзіма Марата Казея і родавае гняздо графскай сям'і Чапскіх — вёска Станькава — нядаўна прымала знакамітых гасцей. Радзівілы, Сапегі, Агінскія — прадстаўнікі самых шляхетных родаў Вялікага Княства Літоўскага прыехалі сюды спецыяльна дзеля палявання. Чакалі толькі каманды «Матор!». Рэжысёр Аляксандр Анісімаў раздаваў кінагрупе апошнія парады. Першы здымачны дзень «Авантур Пранціша Вырвіча» выдаўся сонечным і мітуслівым. Другі — не менш ясны, але ўжо дакладна скаардынаваны. На стужку аб прыгодах авантурыста Вырвіча і яго настаўніка Лёдніка, прыдуманых папулярнай пісьменніцай Людмілай Рублеўскай, на «Беларусьфільме» ўскладаюць вялікія надзеі. Сама ж аўтарка ўпэўненая, што навінка, якая прэтэндуе на ганаровае званне «кіно з нацыянальным характарам», стане не проста экранізацыяй яе самага папулярнага рамана, а яркай кінагісторыяй, пасля прагляду якой беларусы па-новаму зірнуць на сваё мінулае.

На некалькі дзён Станькаўскі Цэнтр экалагічнага турызму ператварыўся ў штаб для здымачнай групы: на яго тэрыторыі размясціліся грымваген акцёраў, трэйлеры з коньмі й паходная кухня. На полі побач — спецыяльна выкапана яма для загону аленяў і… самыя сапраўдныя алені й казулі. Выглядаюць яны нядрэнна: бліскучы мех, круглыя бакі, ежу з рук артыстаў амаль ручныя жывёлы прымаюць вельмі ахвотна. Тут жа рэшткі пажухлай травы пад'ядае пяцёрка коней. Усе гэтыя прыгажуны — ужо прызнаныя кіназоркі. Засвяціліся ў расійскіх блок-

SB.BY

Партрэтнае падабенства Віктара Манаева і Міхала-Казіміра Радзівіла відавочнае

бастарах «Кніга майстроў», «1612», «Кроплі крыві на квітнеючым верасе» ды іншых. Ноч напярэдадні паездкі ў Станькава ў іх таксама выдалася рабочай: здымаліся ў эпізодзе новага фільма пра Зою Касмадзям'янскую.

…Вялікі гетман літоўскі Міхал Казімір Радзівіл па мянушцы Рыбанька перад сваім канём Горам, здаецца, трохі пасуе. Але гэта, увогуле, нядзіўна: народны артыст Віктар Манаеў падклейвае шыкоўныя пшанічныя вусы і шчыра прызнаецца, што да здымак фільма на кані не сядзеў. Але з вялікім задавальненнем наведаў некалькі пробных трэніровак:

— Калі не галопам, то адчуваю сябе цалкам упэўнена. Мой персанаж — асоба ў гісторыі вельмі спрэчная, але я ўсё ж рады, што гэтая роля дасталася менавіта мне. Што цікава, за гады акцёрства ні разу не давялося мне сыграць хоць каго-небудзь з Радзівілаў. Атрымліваецца, што гэты фільм — шыкоўны падарунак да майго 60-годдзя. Мала таго, што я Радзівіл, дык яшчэ і на кані ўпершыню!

А вось акцёр Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра Канстанцін Міхаленка трымаецца ў сядле на рэдкасць упэўнена. Яго князь Агінскі (які выведзены ў рамане пад прозвішчам Багінскі) — вершнік дасведчаны. Сам акцёр, як і яго персанаж, да коней мае пэўную слабасць:

— Абажаю! Можа быць, любоў перадалася мне на генным узроўні? Справа ў тым, што мой прадзед быў рымарам — вырабляў прадметы й прылады для запрэжкі, сядлання й кіравання коньмі.

Засвеціцца ў новай стужцы і акцёр Купалаўскага тэатра Ігар Сігоў. У ролі рэктара езуіцкага калегіума артыст, на рахунку якога больш за 60 роляў у фільмах і серыялах, адчувае сябе нядрэнна. Поўнае разуменне ў яго і з рэжысёрам Анісімавым, да гэтага яны разам працавалі над стужкай «Сляды на вадзе». У акцёра Сігова сваё бачанне навінкі:

— «Авантуры…» разлічаны на гледачоў усіх узростаў, якія цікавяцца сваёй гісторыяй, каранямі. Наш фільм не прэтэндуе на гістарычную дакладнасць. Я б сказаў, што гэта хутчэй лёгкі гістарычны экшэн, які дакладна зацікавіць масавага гледача.

Што тычыцца галоўных герояў — рефлэксаванага інтэлектуала Балтрамея Лёдніка і таго, хто шукае прыгод, — Пранціша Вырвіча, то іх сыграюць артысты, шырокай публіцы пакуль невядомыя. Рэжысёр Аляксандр Анісімаў вынікамі шматдзённых кастынгаў задаволены:

— Я заўсёды старанна падыходжу да выбару акцёраў. На ролю Вырвіча паглядзеў некалькі дзясяткаў маладых артыстаў, але вярнуўся ўсё роўна да таго, каго запрыкмеціў яшчэ ў самым пачатку, — 24-гадовага Гошы Пятрэнкі. А ў ролі яго настаўніка Лёдніка на экране ўпершыню з'явіцца вядомы тэатралам акцёр Іван Трус.

Пасля Станькава рэжысёр Анісімаў і яго каманда пераехалі ў «Смалевуд» — так у айчынных кінакругах называюць натурную пляцоўку «Беларусьфільма» пад Смалявічамі. Частку гістарычнай натуры здымуць у Мірскім, Нясвіжскім і Лідскім замках. Таксама здымачная група заедзе ў Заслаўе, Бабруйск і Гальшаны. Да пачатку лета здымкі ў павільёнах і на натуры плануецца завяршыць, затым рэжысёр будзе працаваць над мантажом і агучкай. Каб даведацца, што атрымаецца на выхадзе, прыйдзецца пачакаць да канца года. На экраны «Авантуры Пранціша Вырвіча» выйдуць не раней за снежань.

Людміла Рублеўская, пісьменніца:

— Мая кніга — гэта частка нашай гісторыі, у якой былі свае рыцары, выдатныя дамы, філосафы, шляхцічы, балі і дуэлі, таямнічыя падзямелля і загадкавыя артэфакты. На жаль, мала хто ведае, але ў Беларусі ў свой час закручваліся сюжэты не менш займальныя, чым тыя, якія натхнялі Аляксандра Дзюма і Вальтэра Скота. Таму я спадзяюся, што пасля фільма беларусы па-новаму зірнуць на сваю гісторыю, вуліцы роднага горада і старадаўнія будынкі, якія захаваліся па наш час.

Юліана **Леановіч**

Рэжысёр Аляксандр Анісімаў (у цэнтры) паспявае ўсё кантраляваць

ГУЛЬНІ З РОЗУМАМ

Хто яна, Людміла Рублеўская? Празаік? Паэтка? Гісторык-даследчык, які аднаўляе ў нацыянальнай свядомасці праўдзівыя кадры мінулага, ці казачніца, якая стварае новую прыгожую гісторыю Беларусі? Відавочна адно: яе творы — мастацкія рэфлексіі вакол малавядомых фактаў з даўніны.

Быць літаратарам у нашыя дні — не модна. Цяпер у трэндзе спецыяльнасці, якія прыносяць прыбытак. І, так званыя прафесіі будучыні, у якіх спецыялісты ствараюць адытыўныя тэхналогіі, стратэгіі дыверсіфікацыі, айдэнтыку, робатаў і мноства іншых пакуль мала зразумелых нам рэчаў.

З іншага боку, пісьменнікаў сёння як ніколі шмат, паліцы кнігарняў заваленыя літаратурай на любы густ. Чаму? Думаю, быць аўтарам твора, які пабачыў свет — прыемна. Адчуваеш гэткі флёр статуснасці. А яшчэ можна пісаць для сябе: выплюхваць на паперу эмоцыі, думкі, калі ім цесна ў галаве. Або — для іншых: такі маўклівы заклік задумацца пра тое, што напісана ў кнізе. Напрыклад, пра мінулае, пра гісторыю роднага краю. Без мінулага ж няма будучыні. Фраза вядомая, можа нават скажаце — банальная, але для нас, беларусаў, актуальная. У апошні час мы сталі больш цікавіцца нацыянальнай культурай і часцей размаўляць на роднай мове. Вось і фільмы пачалі здымаць «з нацыянальным характарам»: напрыканцы года на вялікія экраны павінна выйсці экранізацыя рамана Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега».

Мая субяседніца — вядомы празаік і паэтэса, літаратурны крытык і журналістка, знаўца беларускай гісторыі. Яна шмат усяго цікавага ведае пра славутых людзей з беларускай мінуўшчыны. Не ўсе яны ад «касы», між іншым, былі, як тое некаму здаецца па ўрыўку з Купалаўскага верша. «Хадзілі па зямлі роднай і рыцары, і прыгожыя дамы, філосафы, шляхцічы, былі балы і дуэлі, таямнічыя падзямеллі і загадкавыя артэфакты», — распавядае Людміла. І дзеля справядлівасці дадае: у яе кнігах, перакладзеных на розныя еўрапейскія мовы, нямала і мастацкай выдумкі.

— Людміла, адкуль паходзіць вашае прыгожае прозвішча? Раскажыце пра свае карані.

— Гісторыя Беларусі ўся — з белых плямаў, і гісторыя майго роду — таксама. Можа, таму мяне заўсёды так цікавілі архіўныя вышукі, аднаўленне фактаў. Справа ў тым, што з-за пакручастых шляхоў нашай гісторыі многія факты проста хаваліся самімі людзьмі. Пасля рэвалюцыі знішчаліся сведчанні пра шляхецкае паходжанне, або сваяцтва са святарамі. Калі пачаліся рэпрэсіі — натуральна, пра арыштаваных сваякоў не згадвалі, ці пра пэўныя нацыянальныя прыналежнасці. Мая маці з роду Часлаўскіх, напрыклад, вельмі здзівілася, калі я паведаміла ёй знойдзеныя звесткі пра яе родных дзядзек, стрыечнага дзеда ды іншых сваякоў, што былі арыштаваныя і расстраляныя ў 1937-м у Ленінградзе — туды паехала цэлая «калонія» нашых сваякоў з беларускай вёскі Люцыя. Працавалі на чыгунцы, хто кандуктарам, хто начальнікам склада, мая бабуля — вагаўшчыцай. І амаль усіх арыштавалі… як «польскіх шпіёнаў». Мая бабуля ніколі не гаварыла пра гэта маці. Пра дзеда з боку бацькі ведаю толькі, што яго саслалі ў Сібір. Там ён загінуў, а бацька апынуўся ў дзіцячым доме. Падрабязнасці ўдакладніць цяжка. Знайшла звесткі пра Рублеўскіх канца XIX стагоддзя — праваслаўных святароў, яны таксама могуць быць сваякамі.

— Раскажыце пра сваё студэнцтва: спачатку вучыліся ў Літаратурным інстытуце ў Маскве, потым перавяліся ў БДУ… Але цікава, што пачыналі свой шлях у сталае жыццё з… архітэктурна-будаўнічага тэхнікума. Творчая жылка не адразу праявілася?

— Літаратура — гэта не прафесія. Гэта спосаб мыслення і, напэўна, лад жыцця. У кнізе вядомага даследчыка антычнасці Міхаіла Гаспарава знайшла вызначэнне, што паэзія — споведзь вадзяной істоты, якая жыве на сушы і марыць жыць у паветры. Мне гэта вельмі ўцямна. Я не выбірала — быць паэткай, пісьменніцай ці не быць, як не выбірае вусень, ператварацца ў матыля ці не… А ў архітэктурна-будаўнічы тэхнікум я пайшла, бо хацела са школы сысці пасля восьмага класу. Вучылася заўсёды добра, але атмасферка ў класе была… Карацей, выбрала самы прыймальны варыянт, бо займалася і маляваннем. Пасля тэхнікума ў Літаратурны інстытут падавала дакументы два гады запар. Варыянт з журфакам-філфакам разглядаць не хацела, бо ненавіджу зубрыць правілы. Пісьменнасць у мяне прыроджаная. Чытаю ж кнігі з трох гадоў. Паступіла на аддзяленне паэзіі, трапіла ў семінар Аляксандра Міхайлава і Галіны Сядых. Самае галоўнае — гэта была неверагодна яркая творчая тусоўка пачатку перабудовы. Са мной вучыліся будучыя куртуазныя маньерысты, мы чыталі раней недаступную літаратуру, абмяркоўвалі факты пра

Перажывём мы ўсе свае
няшчасці,
Як некалі дзіцячыя хваробы.
Спазнаюцца маланкавыя
страсці
І горкай адзіноты цяжкі
вопыт.
Перажывём смерць блізкіх і
далёкіх,
Мяжа пакут не перакрэсліць
сэрца…
Што ж застаецца ў нас,
няверных Богу,
Каб выжыць?
Жах прад смерцю застаецца?
Бо на зямлі яго ніхто
не ўладны
Ні высушыць, ні выпіць
дзікім мёдам.
Жаданнем жыць ваўкі
лякуюць раны.
Жаданнем жыць лякуем
мы самоту.
І дай мне, Божа, у апошнім
крыку
Спасцігнуць сэнс зямной
кароткай драмы:
Хаця жаданьне смерці —
грэх вялікі,
Але баяцца смерці —
грэх таксама.
І хай не боязь назаўсёды
знікнуць,
Не жах адплыць на невядомы
бераг,
А свет святла, куды калісь
я знікну,
Дасць сілы мне і прабачаць,
і верыць.

Гэты верш Людміла напісала яшчэ ў Літаратурным інстытуце, калі ёй было гадоў дваццаць. Ён увайшоў у яе першы зборнік.

сталінскія рэпрэсіі, бегалі па тэатрах і выставах… Адчуванне было незвычайнай свабоды! Там я канчаткова зрабіла выбар на карысць беларускай мовы ў сваёй творчасці. Там жа знайшла чалавека, з якім можна было размаўляць на беларускай мове — паэта Віктара Шніпа, які вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах і жыў на сёмым паверсе нашага інтэрната. Вось ужо трыццаць два гады мы з ім размаўляем штодзень на беларускай мове, выгадавалі дваіх дзетак… Натуральна, калі Віктар закончыў свае курсы, я, не скончыўшы сваё навучанне, вярнулася з ім — улетку было наша вяселле. Беларускае аддзяленне філфака БДУ, куды я паравялася — быў свядомы выбар. Я хацела трапіць менавіта ў беларускі асяродак, удасканаліць веданне мовы. Гэта быў час літаратурнага аб'ядання «Тутэйшыя», часткай якога я стала. Гэта было аднойдзенне свайго шляху і сваёй Беларусі.

— Як правіла, вас прадстаўляюць чытачу ці гледачу як празаіка, паэтку, журналістку, літаратуразнаўцу і крытыка. А яшчэ вы актрыса, бо зняліся ў маладосці ў некалькіх кіна-

стужках. А з нядаўніх часоў вы і сцэнарыст: па вашай кнізе «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега» здымаецца фільм. Але хто вы, у першую чаргу, для самой сябе?

— Ну, актрысай мяне назваць нельга. Проста ў дзяцінстве часта здымалася ў масоўцы разам з мамай, ва ўсякіх там фільмах пра Дзяніску Караблёва, «Дзяржаўнай мяжы» і многіх іншых. Так, тады пабачыла многіх легендарных артыстаў, кшталту Галіны Макаравай і Пятра Вельямінава. Уражанні адбіліся ў цыкле апавяданняў «Людзі масоўкі». Была цікавая гісторыя, калі ўжо дарослай я з'явілася ў выглядзе вялікай княгіні Алены, жонкі польскага караля, у адной літаратурнай перадачы (пра гэта — у цыкле «Гісторыі пані», як я была прывідам Парка Чалюскінцаў). А таксама супраца з Беларускім паэтычным тэатрам аднаго акцёра «Зніч»… Але я не актрыса. І сцэнар для фільма па «Авантурах Вырвіча» пісала не я, а сцэнарыст Валянцін Залужны. А што ў мяне шмат прафесіяў — гэта праблема не мая, а «часу вузкай спецыялізацыі». Калісьці ўсё мастацтва было сінкрэтычным, ніхто не падзяляў, будзе ён кампазітарам, музыкам, мастаком ці танцорам. Лічу, найперш трэба быць чалавекам. Шчырым прыстойным чалавекам.

— Праглядаю вашу бібліяграфію і раблю выснову, што ў сярэднім вы ствараеце па адной кнізе ў год. Гэта шмат? Плануеце, колькі чаго і калі напішаце?

— Не люблю планаваць. Нават калі пішу раман, то ніколі не распісваю, што ў якім раздзеле. Мне гэта нецікава. Проза — гэта і канструкцыя, і сад. Які расце сам па сабе, калі ён жыццяздольны. У яго свая ўнутраная логіка. Здаралася, героі прымушалі мяне так ці іначай павярнуць сюжэт. Я не думала, што гісторыя пра шкаляра Вырвіча і ягонага слугу Лёдніка вырасце ў цэлую эпапею. Проста пісанне прозы для мяне — паралельнае жыццё, ад існавання ў якім я не хачу, не здольная адмовіцца. Таму, выйшаўшы з аднаго свету, ачуняўшы ад эмацыйных і фізічных выдаткаў, мімаволі ствараю другі свет, у якім змагу жыць яшчэ нейкі час.

— У 2013 годзе вы ўвайшлі ў топ-10 самых паспяховых жанчын Беларусі. Як даведаліся пра тое? Па якіх крытэрыях увогуле ствараюцца такія рэйтынгі?

— Доўга смяялася, калі даведалася. Гэта як у 1990-х розныя каламутныя біяграфічныя інстытуты рассылалі нашым дзеячам прапановы абвесціць іх «Чалавекам года» за пэўную плату. Я таксама атрымлівала такія «лісты шчасця». Адзін з іх сцвярджаў, што мне прысуджана званне «Бізнэс-лэдзі года». І за сто даляраў я магу атрымаць адпаведны дыплом, ці з Оксфарда, ці з Гарварда. А ў мяне не было ста даляраў. Не тое, што на дыплом — а зусім. От бізнэс-лэдзі! З другога боку, як вымяраецца чужы поспех? Напэўна, камусьці колькасць маіх кніг здаецца да крыўднага вялікай. Але ж яны мне не з неба зваліліся! Я іх напісала і аплаціла ўласным здароўем, бяссоннымі начыма, эмоцыямі — бо я пражываю з героямі ўсё. У мяне ж няма і ніколі не было свайго кабінета, нават вольнага часу для пісання. Усё — пасля асноўнай працы, спадарове. У побыце мы з мужам кіруемся мінімалізмам, таму не маем шмат чаго, што з'яўляецца адзнакамі дабрабыту і поспеху.

— Людміла, як думаеце, рэцэнзіі — папулярны жанр цяпер?

— Жанр не можа быць папулярным. Такім яго робяць удалыя ўзоры выканання. У нас так доўга наракалі на адсутнасць літаратурнай крытыкі, што лагічна, калі пачаліся спробы надаць крытыцы другое дыханне — у фармаце інтэрнэт-эпохі. Праўда, мне гэта больш нагадвае батлы. Хто дасціпней падколе суперніка. Рэцэнзій у класічным выглядзе бадай не засталося. І я не буду плакаць на гэты конт. Літаратура змушае пра сябе гаварыць, выказваць меркаванні — і файна. Галоўнае, «хвалу и клевету приемли равнодушно и не оспаривай глупца».

— Вы не раз паўтаралі, што пішаце кнігі не для чытача. А для каго тады?.. Калі толькі для сябе ці «ў стол», тады чаму, як лічаце, іх усё роўна чытаюць? У чым сакрэт вашага творчага поспеху?

— Я не зарабляю на сваіх кнігах. Як казала, пішу іх у вольны ад працы час. Таму ніхто не будзе дыктаваць мне, як і пра што пісаць. Я пішу тое, што падабаецца мне. Хачу нешта важнае для сябе высказаць, выплюхнуць боль, аднавіць гістарычную справядлівасць… Матывацый шмат — але ўсе яны асабістыя, а не «заказныя». А паколькі я не эксклюзіў, і ёсць дастатковая колькасць людзей, якіх можа ўсхваляваць тое ж, што і мяне — дык яны і робяцца маймі чытачамі, дакладней, суразмоўцамі.

— Я ўпэўнена, што аўтар любой кнігі, — ці то навучальны дапамож-



«У мяне няма праблемы, калі не ведаю, завершаны твор ці не. Ён сам вырашае: ці нарадзіўся. Жывы ж арганізм.»

нік, ці то фантастыка — нясе адказнасць перад чытачом за думку, якую выказвае. Ён накшталт настаўніка, які вядзе за сабою да той ідэі, той звышзадачы, дзеля якой і ствараў твор. Адчуваеце такую адказнасць?

— Барані Божа ад спакусы пачувацца месіяй. Так, неабходна быць гатовым расплочвацца за свае словы. Але калі пішаш тое, што думаеш і адчуваеш, калі адстойваеш у напісаным дарагія для цябе рэчы — гэтая акалічнасць ад пачатку ўключана ў прайс.

— Людміла Рублеўская — перфекцыяністка? Такія людзі часта незадаволеныя сабою, таму што гоняцца за ідэалам. А як у вас?

— Нармальны творчы чалавек заўсёды «на арэлях»: ад «нічога не атрымалася, а-а-а» да «ўсё-ткі ўдалося, хэй-хо!». Праўда, мае «арэлі» да адзнакі «добра» ўздымаюцца рэдка. Так, я перфекцыяністка. Не тое, каб гэта палягчала мне жыццё, але тэкстам на карысць ідзе.

— Вы гаворыце, што любіце даводзіць распачатае да канца. Але напісаць раман за одну ноч, да прыкладу, немагчыма. Калі адчуваеце, што трэба спыніцца?

— У мяне няма праблемы, калі не ведаю, завершаны твор ці не. Ён сам вырашае: ці нарадзіўся. Жывы ж арганізм. Звычайна пад канец рамана ў мяне такое творчае напружанне, я настолькі ў тэме, што адчуваю страшэнную тугу, калі стаўлю кропку. Але гэтая кропка — непазбежнасць, якую я не магу змяніць.

— Мяне, як пісьменніка-пачаткоўца, які пачаў ствараць некалькі кніг, але не дапісаў ніводнай, зацікавіла ваша фраза, я вычытала яе ў інтэрнэце ў адным з вашых інтэрв'ю: «З натхненнем усё неадназначна: бывае, ёсць час заняцца творчасцю, але нічога з сябе не выціснеш — атрымліваецца фальшыва. І, бывае, няма часу, а трэба запісаць некалькі радкоў, у тваім разуменні поўны фільм разгортваецца...». Як вырашаеце гэтую праблему ў адным і другім выпадку?

— З вершамі — кепска. Колькі іх загінула, незапісаных!.. Ці таму што не было часу, ці таму, што я палічыла з'яўленае недасканалым, банальным… З прозай — часам за ноч адзін радок дадасца, часам — некалькі старонак. У прозе неабходная працаздольнасць. У ёй больш рамяства — бо маеш справу з вялікім аб'ёмам «слоўнай руды».

— Ці трэба аўтару прымушаць сябе працаваць над тэкстам, калі натхненне прайшло? Ці не атрымаецца ў выніку «штучная» гісторыя?

— Я выкладаю ў Школе маладога літаратара, і штомесяц мы даем хатнія заданні ў выглядзе аповедаў. То бок змушаем маладых людзей да творчасці. Часта яны скардзяцца, што цяжка, няма натхнення. Але і ў такіх выпадках здараюцца добрыя вынікі. Разумееце, чытачу ж у прынцыпе ўсё адно: пакутваў пісьменнік ці не, напісаў за дзень ці за дзесяць год, змушалі яго ці не…

— Неяк вы згадалі ў адной размове з журналістам, што пісьменніку не перашкодзіць ведаць сістэму Станіслаўскага. Я пазнаёмілася з ёю ў часы вучобы ў Акадэміі мастацтваў. Абсалютна згодная з тым, што калі акцёр пражывае эмоцыі свайго персанажа, ён уцягвае ў гэтую «гульню розуму» і гледача, чытача. Але памятаеце, што здарылася з героем амерыканскага фільма з аднайменнай назвай? Маю на ўвазе кінастужку «Гульні розуму» Рона Ховарда, галоўную ролю ў якой іграў Расел Кроу. Выдуманы свет яго персанажа Джона Нэша стаў рэальным… А гэта ўжо — псіхічнае адхіленне, нават дыягназ. Неадноечы назірала сітуацыю, як пасля добрай ігры ў спектаклі акцёру было цяжка выйсці з ролі. Можа гэта небяспечна: доўга знаходзіцца ў віртуальным свеце?

— Так, думаю, небяспечна. І баюся гэтага. Таму што без стану зменены свядомасці творчасць сапраўдная, па гамбургскім рахунку ўвогуле немагчымая. Але пры гэтым трэба мець трывалую сувязь з рэальнасцю. Памятаеце, якія эксперыменты рабілі над сабою імпрэсіяністы, сімвалісты, дадаісты ды іншыя? Здавалася б, чым глыбей у падсвядомае, тым цікавей. Але я заўсёды прыводжу ў прыклад «Мартына Задэку», кнігу пісьменніка срэбнага стагоддзя Аляксея Рэмізава, які проста ўзяў і запісаў свае снабачанні. І чытаць іх надзвычай нудна. Гэтак жа, як медыцынскія запісы. Калі знаходзішся ў матэрыяле, здараюцца, вядома, містычныя рэчы, бачыш у сне будучыя сцэны рамана, гісторыі, якія пасля акажуцца рэальнымі, пацвердзяцца архіўнымі вышукамі. Але насамрэч гэта нармальна і вытлумачальна — так дасведчаны рэстаўратар аднаўляе страчаныя кавалкі вітража. А вось увесьчасна знаходзіцца ў стане зменены свядомасці — гэта ўжо па-за межамі мастацтва. Як казаў Міхаіл Чэхаў, артыст, сваяк пісьменніка, каб сыграць біфштэкс, не абавязкова быць засмажаным.

— Як потым «адыходзіце» ад творчага працэсу: п'яце моцную каву, выкурваеце цыгарэтку, сустракаеце

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Людміла Рублеўскай і яе муж Віктар Шніп у духоўна-энергетычным полі скульптурнай кампазіцыі «Князь і княжна. Тры ганцы», зробленай Генікам Лойкам паводле паэмы Янкі Купалы «На куццю». Здымак зроблены на святкаванні 130-х угодкаў Янкі Купалы. Вязынка, 2012 г.

SB.BY

Людміла Рублеўская за пісьменніцкім сталом на кінастудыі «Беларусьфільм»

Пісанне прозы для мяне — паралельнае жыццё, ад існавання ў якім я не хачу, не здольная адмовіцца. Таму, выйшаўшы з аднаго свету, ачуняўшы ад эмацыйных і фізічных выдаткаў, мімаволі ствараю другі свет, у якім змагу жыць яшчэ нейкі час.

світанак ці, можа, выходзіце раніцай на прабежку? Колькі часу вам патрэбна, каб вярнуцца ў рэальнасць?

— Каву не п'ю. Не куру. Раніцай люблю паспаць. У рэальнасць вяртаюся доўга і пакутліва. Проста ў мяне такі напружаны графік, столькі працы акрамя творчасці, што не трэба спецыяльных адцягваючых ад яе прычын.

— Людміла, мне падаецца, інтарэс да нацыянальнай культуры і мовы пачаў праяўляцца масава адносна нядаўна: у модзе насіць адзенне з нацыянальным арнаментам, у штодзённым жыцці ўсё часцей гучыць беларуская мова. З чым гэта звязана, як лічыце?

— Ну, пра гэта яшчэ Максім Багдановіч пісаў: пра гаршчок з насеннем, які знайшлі ў пясках Егіпецкай зямлі. Жыццёвая сіла народа не знікае. Заўсёды знойдуцца тыя, хто будуць у любых абставінах імкнуцца захаваць нацыянальную ідэнтычнасць і культурную самабытнасць, і гэта рана ці позна экстрапалюецца на больш шырокія слаі. Асэнсаванне сябе асобай пачынаецца не з асэнсавання, чым ты падобны, а — чым адметны. У канцы 1980-х я, гарадская дзяўчына, якая не чула беларускую мову вакол сябе, пад уплывам Караткевіча горача захацела быць праўдзівай беларускай, гаварыць на прыўкраснай беларускай мове. І пачала пісаць на ёй.

— Гісторыяй у «чыстым выглядзе», нейкімі архіўнымі дакументамі цікавяцца куды менш людзей, чым яе мастацкімі варыяцыямі, легендамі, міфамі. І вы самі прызнаваліся, што нямала фантазуеце з гістарычнымі персанажамі. Мне падаецца, такім чынам вы ствараеце нейкую паралельную гісторыю Беларусі. Але ці правільна гэта: фармаваць новы, магчыма, больш прывабны вобраз той краіны, якой ніколі і не было?

— Для паўнавартаснага існавання народа неабходна стварэнне паўнавартаснага, жыццяздольнага нацыянальнага міфа. Маю на ўвазе не казку, а складаную структуру, якая ўключае ў сябе абагульнены вобраз прадстаўніка нацыі ды асяродка яго існавання. Гэта павінны быць прыцягальныя вобразы, падтрыманыя шматлікімі канкрэтнымі прыкладамі. Вобраз рыцарскай Беларусі, шляхецкай, інсургенцкай, якую ствараў Уладзімір Караткевіч, калісьці скарыў мяне, змусіў сэрца забіцца мацней. У нашай гісторыі дастаткова матэрыялу для стварэння такога багатага, яскравага вобраза, у процівагу беларусу ў лапцях, які нясе на плячах сваю крыўду. Пасля маіх артыкулаў пад рубрыкай «Рыцары і дамы» часам пачынаюць пісаць і тэлефанаваць: «гэта не нашы персанажы», «гэты князь — толькі эксплуататар». Мы маем права на ўсё, што стваралася на нашай зямлі. Маем права ганарыцца ўсімі ўраджэнцамі сваёй зямлі, якія здабылі сабе славу дзесьці ў іншых краінах. Мы столькі ўсяго параздавалі са сваёй гісторыі, што прыйшоў час збіраць.

— У камп'ютарных гульнях і мастацкай літаратуры ёсць агульнае: абодва сусветы прыдуманы чалавекам. Але ёсць і розніца. У чым яна, на вашу думку?

— Літаратура змушае думаць, дапускае нязгоду з аўтарам. Добрая літаратура — гэта заўсёды суперажыванне, эмпатыя. Камп'ютарная гульня — гэта дзеянне, механістыка. Зрабі нешта і атрымаеш прыз. У літаратуры ж два плюс два — не абавязкова чатыры. Там ёсць месца надматэрыяльнаму, няправільнаму, нелагічнаму: Раскольнікаў ідзе на катаргу, Наташа Растова збягае з Курагіным, Ганна Чарнушка выходзіць за Яўхіма на злосць каханаму Васілю… І нічога не паправіш, колькі фанфікаў ні напішы.

— Як зрабіць так, каб дзецям хацелася праводзіць вольны час за чытаннем мастацкай літаратуры, а не за камп'ютарнымі гульнямі?

— Чытаць усёй сям'ёй.

Гутарыла **Аліса Гюнгер**

МІНУЛАЕ Ў РЫТМАХ СУЧАСНАСЦІ

Шэраг цікавых імпрэзаў Нацыянальны гістарычны музей Беларусі ладзіць з улікам тых датаў і падзей, якімі жыве краіна сёння

Гэты будынак па мінскай вуліцы Карла Маркса, 12 многія ведаюць па вялікіх чорных гарматах, што ляжаць пры ўваходзе. Сёлета ў Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі — 100-гадовы юбілей: бо вядзе ж ён гісторыю ад Мінскага абласнога музея — першага беларускага дзяржаўнага музея (1919–1923). Адкрыўся ён у будынку былога Дваранскага сходу, што стаяў на скрыжаванні сучасных вуліц Маркса і Энгельса — той будынак у плыні часу не ацалеў.

Цяпер у зборах музея — больш за 460 тысяч адзінак захоўвання з улікам збораў філіялаў. Гэта, у прыватнасці, скарбы з розных куткоў Беларусі, каштоўныя дакументы, старадрукі, слуцкія паясы, калекцыя музінструментаў, мэблі, зброі, каштоўнага парцалянавага посуду і шмат чаго яшчэ. У Гістарычнага музея ёсць 5 філіялаў: Дом-музей І з'езда РСДРП, Музей гісторыі беларускага кіно, Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, Музей прыроды і экалогіі Беларусі, Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці.

Так сталася, што самы першы дзяржаўны музей узначальвае, пэўна, самы малады кіраўнік падобных устаноў: 26 гадоў было культуролагу Паўлу Сапоцьку, калі на пачатку красавіка 2018-га ён заступіў на пасаду. І, дарэчы, казаў у адным з першых інтэрв'ю з тае нагоды, што людзі — найважней за любую найбагатую калекцыю. Да таго ж мая калега не прамінула слушна ўспомніць, як творча, крэатыўна праявіў сябе Павел Міхайлавіч, тры гады перад тым ачольваючы Мастацкую галерэю «Універсітэт культуры». Спрагназавала, што «ад яго можна чакаць нестандартных ідэй, як паяднаць дзень сённяшні з артэфактамі нашай гісторыі». А як тое ўдаецца — вынікае з нашае размовы з Паўлам Сапоцькам.

Павел Сапоцька

— Спадар Павел, прайшоў год, як вы ўзначалілі Гістарычны музей. Зразумела ж, даводзіцца на такой пасадзе і ўлічваць досвед папярэднікаў, і прыўносіць нешта новае ў працу. Як дасягаецце гармоніі, балансу мінулага і сучаснасці?

— Ведаеце, па вялікім рахунку кожны чалавек і ёсць такі баланс… Мы памятае свае карані, шануем родную культуру, якой тысячы гадоў — і ў той жа час імнемся развівацца, штодзень асвойваць новыя тэхналогіі, працаваць у рытме сённяшняга часу. Трымаем баланс усё жыццё. І ў музеі так: зберагаем мінуўшчыну — аднак імкнемся ўпісацца ў сучасны кантэкст, быць запатрабаванымі ў грамадстве. Як кажуць, не парасці мохам і павуцінай. Адзін з найбольш лагічных і запатрабаваных выхадаў музея на шырокі кантакт з аўдыторыяй — гэта выставачная дзейнасць. Назбіранае павінна не пыліцца недзе ў сховах, а працаваць на карысць Бацькаўшчыны. Цяпер, мяркую, у нашай дзейнасці ёсць жыццяздольны баланс гісторыі, літаратуры й мастацтва. Дарэчы, калі я прыйшоў у музей, то на першай планёрцы сказаў: нягледзячы на тое, што ў нас Нацыянальны гістарычны музей — на гэтай пляцоўцы павінен адбывацца сінтэз і дыялог нацыянальнай гісторыі, айчыннага выяўленчага мастацтва і літаратурнай спадчыны Беларусі. У любым выпадку мы развіваемся ў гістарычным кантэксце, але шукаць новыя формы працы, выхаду ў свет, вібраваць у рытмах сённяшняга часу з усімі нашымі каштоўнымі зборамі — вельмі цікава. Тым больш у пару, калі — ну так

склался! — юбілей за юбілеем. Мы на іх адгукаемся і робім розныя выставы, у тым ліку і мастацкія. Цяпер у нас задумаў — мора! Нешта здзейснілі: маю на ўвазе выставачныя праекты. На ўскідку: зрабілі выставу «100 гадоў беларускай дыпламатычнай службе». Прыйшло на адкрыццё тае выставы шмат знакамітых людзей, усё было святочна і ўрачыста. Зладзілі выставу да 115-годдзя опернай спявачкі, рэжысёра, народнай артысткі БССР і СССР Ларысы Александроўскай. Зусім нядаўна адкрылася выстава да 100-годдзя БССР, цяпер у рабоце праекты да 200-годдзя кампазітара Станіслава Манюшкі, да 100-годдзя ЛКСМ Беларусі…

— Акрамя выстаў — якія ў музея ёсць выхады на аўдыторыю?

— У нас праходзяць і творчыя сустрэчы, аўтарскія вечарыны, ёсць і выдавецкія праекты. Імкнемся розныя пласты айчыннай гісторыі прыпадняць, актываваць, калі казаць моваю ІТ-тэхналогій, ды паказаць шырокаму колу суграмадзян, гасцей Беларусі. Нам важна глыбока даследаваць і цікава, сучаснаю моваю расказаць пра нашу вялікую спадчыну — як матэрыяльную, так і духоўную. Розныя формы практыкуем.

— З прэс-рэлізаў, якія музей дасылае ў рэдакцыі СМІ, бачна: у вас цяпер шмат і розных міжнародных праектаў…

— Тут, заўважу, два напрамкі дзейнасці. Першы: рэалізацыя праграм на базе самога Гістарычнага музея, нашых філіялаў. Другі: папулярызацыя гістарычна-культурнай спадчыны Беларусі за межамі краіны. Скажам, у 2018 годзе мы паказалі цікавыя выставы у Нацыянальным музеі султаната Аман (у горадзе Маскаце). Была выстава ў Нацыянальным музеі Літвы (Вільнюс) — мы там прымалі ўдзел у фотавыставе, прысвечанай Льву Дашкевічу. Гэта быў беларускі фотамастак, навуковец, вынаходнік, публіцыст, педагог. Здымаў сярод іншых вядомых асоб і Янку Купалу. Здымкі, творы Льва Дашкевіча знаходзяцца ў фондах розных музеяў, і ў нашым таксама. Былі ў нас яшчэ сумесныя праекты з Польшчай. Мы паўдзельнічалі ў Днях культуры Беларусі ў Пермскім краі: вазілі ў Расію інфармацыйна-дакументную выставу «Беларусь і беларусы», а таксама «Беларусь сучасная».

— Цікава, ці жывуць там беларусы?

— Так, жывуць! І яны былі запрошаны ў канцэртную залу на святочны канцэрт, які ладзіла Беларуская дзяржфілармонія пры падтрымцы Мінкультуры. Былі ў нас і шматлікія іншыя праекты. У тым ліку мы прымаем розныя выставы ў сябе. Скажам, прадставілі выставу майстроў народных промыслаў В'етнама. Была выстава з фондаў музеяў Татарстана (Расія). Вельмі цікавай атрымалася выстава «Біяграфіі 100 дамоў Пярну» (Эстонія) — прысвячалася 100-годдзю Эстонскай Рэспублікі. Надзвычай цікавыя выставы ладзім з Інстытутам польскім пры падтрымцы Амбасады Польшчы. Паказалі, напрыклад, праект «Знакі незалежнасці» — выставу польскіх грошай: да 100-годдзя аднаўлення незалежнасці Польскай Рэспублікі.

— Мы ведаем, што перад рэвалюцыяй вялікая калекцыя старажытнасцяў графа Эмерыка фон Гутэн-Чапскага была з-пад Мінска вывезена ў Кракаў. Цяпер зберагаецца там у Музеі імя Гутэн-Чапскіх. Ці не прыязджалі таксама і адтуль грошы?

— Не, на вялікі жаль. Хоць, як вядома, у гісторыі беларусаў і палякаў шмат агульных старонак, вядомых асоб, і графы Чапскія — з іх ліку. І, дарэчы, мы пачынаем працу з Кракавам дзякуючы мясцоваму Гістарычна-культурнаму дабрачыннаму фонду «Ляліва», які займаецца зберажэннем, аднаўленнем спадчыны Гутэн-Чапскіх. Дырэктар фонду — Іван Іванавіч Гардзіеўскі, ён жа віцэ-старшыня Мінскага саюза прадпрымальнікаў і працаўдаўцаў. Працуем актыўна і з расійскімі, а таксама кітайскімі калегамі. У прыватнасці, сёлета далучаемся да праектаў, прысвечаных 70-годдзю стварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі. Наша першая міжнародная імпрэза-2019 была прысвечана Кітаю, дакладней — кітайскай архітэктуры. Наш сябар, прафесар, доктар архітэктуры Армен Сардараў прадставіў вельмі цікавую выставу ўласных фотаздымкаў, на іх — як традыцыйная народная архітэктура, так і сучасныя дасягненні яго калег з Паднябеснай. Паказалі яшчэ экспанаты з калекцыі Кітайскага культурнага цэнтра, які створаны, дзейнічае на базе Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — у якім выкладае Армен Сяргеевіч. Летась, дарэчы, мы падпісалі некалькі дамоў пра беларуска-кітайскае супрацоўніцтва: з Шанхайскім гістарычным музеем, з Фінансавым музеем правінцыі Шэньянь. І прымалі напрыканцы года, у снежні 2018-га, дэлегацыю прадстаўнікоў

TIMES.BNTU.BY

Так адкрывалася выстава, прысвечаная кітайскай архітэктуры

Міжнароднай Шанхайскай культурнай асацыяцыі. Пры той асацыяцыі ёсць вельмі цікавыя калекцыі твораў жывапісу, каліграфіі, графікі. Спадзяюся, што сёлета мы іх таксама прадэманструем для беларускай публікі. Для нас цікавыя й сумесны праекты. Скажам, з польскімі калегамі зробім разам выставу, на якой прадставім і беларускіх іканапісцаў, і польскіх.

— Гэта будзе іканапіс прадстаўнікоў розных веравызнанняў?

— Так, розных. З Польшчай будзем працаваць і дзеля папулярызацыі музычнай, літаратурнай спадчыны Станіслава Манюшкі. Мы ганарымся, што сёлета пад гэтую справу атрымалі грант Прэзідэнта Беларусі дзеячам адукацыі, навукі, аховы здароўя й культуры. Праект думаем рэалізаваць у дзвюх частках. Гэта будзе навукова-практычная канферэнцыя, а таксама перасоўная выстава — на базе філіяла «Музей гісторыі тэатральна-музычнай культуры». Выставу плануем паказаць і ў беларускіх рэгіёнах, і ў Дзелавым і культурным комплексе пры Пасольстве Беларусі ў Маскве. Там жа пакажам выставу «Жанчыны Беларусі» ды зробім праект да юбілею знакамітага дыпламата-беларуса Андрэя Грамыкі.

— Як бачна, праца з замежжам разгортваецца ў Гістарычнага музея актыўна…

— Сапраўды, гэта важны кірунак дзейнасці. Вось у красавіку выставу, прысвечаную нашаму слыннаму земляку Напалеону Ордзе, вязем у Абласны гістарычны музей Калінінграда. Дамоўленасць дасягнута раней. Прыязджалі адтуль спецыялісты, зацікавіліся нашай калекцыяй дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва. У тым ліку й творчай спадчынай Напалеона Орды. У нас ёсць арыгінальныя працы, мы іх экспануем і ў іншых музеях Беларусі — скажам, у Нацыянальным мастацкім музеі. Летась такім чынам дзяліліся творамі як Язэпа Драздовіча, так і Напалеона Орды. Была выстава ў Магілёве — туды завезлі творы Паўла Васілевіча Масленікава. Як бачым, нашы калекцыі — вельмі жывыя. Хоць перад намі стаіць галоўная задача: вывучыць, захаваць, рэстаўраваць і «нікому не даць» (ёсць такое правіла фандавіка), але тым не менш — і прадэманстраваць, і паказаць. Прычым вось гэты момант папулярызацыі ў нашай працы вельмі важны. І мы ганарымся тым, што нашы фонды штогод прырастаюць на 2–4 тысячы экспанатаў. Сярод іх і творы выяўленчага мастацтва.

SB.BY

На адкрыцці выставы «100 гадоў беларускай дыпламатычнай службе» кіраўнік МЗС Беларусі Уладзімір Макей і Міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган урачыста загасілі юбілейны паштовы блок

— Ці шмат у Гістарычным музеі калекцый?

— Больш за 50 з улікам філіялаў, і кожная пастаянна папаўняецца, яна жывая, цікавая. Цяпер стаіць перад намі задача: не толькі паказаць назбіранае ў музеях, але й на гэтай аснове рэалізаваць розныя выдавецкія праекты. Юры Лаўрык, адзін з навуковых супрацоўнікаў, вядзе калекцыю старадрукаў, рарытэтных выданняў. Ён падрыхтаваў матэрыялы — разглядаем, і можа выдадзім зборнікам артыкулаў. Ці манаграфіяй, альбомам — бо вельмі гэта цікавы ілюстрацыйны матэрыял на тэму «Кніжная культура Беларусі». Частка фондаў Гістарычнага музея, прысвечаных кніжным выданням, цяпер знаходзіцца у Нацыянальнай бібліятэцы: там створаны добрыя ўмовы захоўвання. І там ёсць нашы супрацоўнікі. Мы ганарымся нашымі калекцыямі, да таго ж працуем і з партнёрамі. Гады паўтары таму я сустрэўся з Мітрапалітам Тадэвушам Кандрусевічам. І тады ў мяне нарадзілася думка: зрабіць выставу каталіцкага мастацтва — у Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», дзе тады працаваў. У хуткім часе мяне прызначылі ў Нацыянальны гістарычны музей, але ж ідэя засталася. І 14 лютага ў нас адкрылася цікавая выстава «Сакральная культура Касцёла Беларусі»: яна доўжылася месяц. Прысвячалася артэфактам каталіцкай айчыннай культуры, калі можна так казаць. Выкарыстаны былі творы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея, Нацыянальнага мастацкага музея, Нацыянальнай бібліятэкі, прыватныя калекцыі. Гэта, у прыватнасці, зборы Ігара Сурмачэўскага — цудоўнага мастака й рэстаўратара, калекцыянера. Я быў уражаны ягонай калекцыяй. Прадставілі экспанаты й беларускія касцёлы Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі: далі нам іх на часовае карыстанне. Гэта мінскі Залатагорскі касцёл, Будслаўскі касцёл Божай Маці, касцёлы Стаўбцоўскага і Лагойскага раёнаў, з Гродна экспанаты. Вельмі ўсё цікава: іканапіс, жывапіс, арнаты, куфры, кнігі, падсвечнікі…

— Чым занятыя цяпер?

— У працы шмат праектаў. Адзін са знакавых: напрыканцы сакавіка пройдзе адкрыццё выстава «1919. Беларуская Рэспубліка» — да 100-годдзя БССР і 95-годдзя беларусізацыі. Гэта і культурная, і асветніцкая акцыя. Робім яе праз арыгінальную падачу матэрыялаў. Навуковая канцэпцыя — наша, падключыліся архівы, бібліятэкі ды іншыя музеі.

Гутарыў Іван **Ждановіч**

«ВОЛАТ У ЦАРСТВЕ ЧАЛАВЕЧАЙ КУЛЬТУРЫ»

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы і Мінскае грамадскае аб'яднанне ўкраінцаў «Запавіт» пры падтрымцы Амбасады Украіны ў Беларусі і Міністэрства культуры Беларусі разам адзначылі 205-годдзе з дня нараджэння Тараса Шаўчэнкі

Юныя беларускія ўкраінкі сярод гледачоў на святе ў Купалаўскім музеі

Як і беларускага Песняра Янку Купалу ў Беларусі, так і гэтага ўкраінскага Кабзара ва Украіне ўжо здаўна абагаўляюць, лічаць нацыянальнай святыняй і гонарам. А ў нашай краіне шануюць народнага паэта як нідзе ў свеце. Помнікі Тарасу Шэўчэнку ўсталяваныя ў Брэсце, Слуцку, Гомелі, Мінску, Магілёве. У вёсцы Карэкаўцы Вілейскага раёна адкрыты памятны знак, прысвечаны сяброўству Шаўчэнкі і ўраджэнца Вілейшчыны, паэта Эдварда Жалігоўскага. У многіх гарадах Беларусі ёсць вуліцы і бульвары Кабзара. Агульнапрызнана: паэзія Тараса Шаўчэнкі, яго літаратурная ды мастацкая спадчына належыць не толькі Украіне, але і ўсёй славянскай супольнасці свету.

Вядома ж, украінцы, якіх у Беларусі жыве больш за 150 тысяч, не могуць не ўшаноўваць памяць пра вялікага паэта. Штогод украінская дыяспара адзначае дзень нараджэння Тараса Шаўчэнкі. Ініцыятарам, як правіла, выступае Мінскае грамадскае аб'яднанне «Запавіт». Арганізоўвае шаўчэнкаўскія паэтычныя конкурсы сярод вучнёўскай моладзі,

ладзіць выставы, круглыя сталы, творчыя сустрэчы…

Так ужо ўладкаваныя мы, людзі: не можам не ствараць куміраў. Тым больш, калі для таго ёсць усе падставы. І ствараем, і падпітваем памяць пра іх: чытаем вершы, спяваем песні ды проста зносімся, паядноўваючыся ў любові да прыгожага паэтычнага слова. Тым і ўзбагачаемся. І гэта відавочна. Урэшце, збіраючыся на падобныя імпрэзы з нагоды дзён нараджэння тых ці іншых выдатных дзеячаў, мы яшчэ раз і сабе імкнемся адказаць на спрадвечныя пытанні: хто ж такія мы самі, адкуль і куды, як кажуць, ідзем.

Так, пэўна было і ў жыцці Тараса Шаўчэнкі. І тая спроба адказаць на іх — у яго і сапраўды геніяльнай паэзіі, малюнках, карцінах.

Для тых, хто не ведае: вядомасць і прызнанасць прыйшлі да Кабзара яшчэ пры ягоным жыцці. І было яму тады ўсяго толькі 26 гадоў. Пра той час, калі расквітнеў паэтычны дар Шаўчэнкі, я, як ураджэнка Украіны з Харкаўшчыны, ведаю яшчэ з школьнага часу. І быццам чую аповед маёй настаўніцы ўкраінскай літаратуры. Яна выдатна чытала вершы Шаўчэнкі. Тыя натхнёныя ўрокі, прысвечаныя Кабзару ў розныя перыяды майго навучання ў школе, былі надзвычай душэўнымі, краналі сэрца. Таму і добра памятаюцца.

— Уявіце сабе, — гаварыла Аляксандра Аляксандраўна — хлопчыку няма і 12 гадоў, як памірае яго бацька. Не заставацца ж яму з мачахай, якая не любіла яго! І таму ён ідзе з дому… І ў дзяка-настаўніка працуе, і дзякам-малярам прыслужвае, і авец пасе… Чаго толькі ён ні нацярпеўся…

Помніцца, як была я ўражана рэпрадукцыяй з малюнка хаты-мазанкі пад саламянаю страхою, у якой жылі бацькі Тараса: так бедна яна выглядала. Разам з яго вершамі ды мастацкай кінастужкай 1951 года «Тарас Шаўчэнка» рэжысёра Ігара Саўчанкі, якую мы класам глядзелі ў кінатэатры, у маё радаснае дзіцячае жыццё без пакут увайшоў боль ад недасканаласці свету і спачуванне прыгонным людзям, з якіх быў Тарас. І тым, пра каго ён пісаў: пра сястру Кацярыну, пра маці ды бацьку… Мая душа наколькі сябе памятаю ў тым пяшчотным узросце, не прымала такой несправядлівасці. Пэўна, тады, пасля знаёмства з біяграфіяй і вершамі Шаўчэнкі і мая душа абудзілася: я пачала больш пільна ўглядацца ў навакольны свет, у якім ёсць месца і непрыгожым з'явам. Раптам убачыла наноў сваіх аднакласнікаў: не ўсе сярод нас, дзесяцігадовых, былі вясёлымі ды гарэзлівымі. Добра памятаю некаторых дзяўчынак і хлопчыкаў з дзіцячага дома: Аліка Насібуліна, Віту Пакроўскую, Сярожу Шыдзіча… Іх вочы часцей былі сумнымі. І чамусьці ўсіх іх мне хацелася накарміць, чым-небудзь парадаваць. А калі зносілася з імі, крыху было ніякавата ад таго, што у мяне ёсць і тата, і мама, і брат. І наогул вялікая радня, якая традыцыйна збіралася ў нас на святы. Нават няёмка было ад уласнай радасці жыцця і жадання добра вучыцца. А яшчэ час ад часу былі сумнымі і вочы майго таты, Чаркашына Міхаіла Сцяпанавіча, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, які не любіў пра яе згадваць. Вось такія ўрокі абуджэння душы падаравала мне знаёмства з лёсам і паэзіяй Тараса Шаўчэнкі.

Яшчэ ў чацвёртым класе на ўроках украінскай літаратуры і мовы (мы і дыктанты пра дзяцінства паэта пісалі) даведалася, што на 16-м годзе жыцця ён папоўніў шэрагі прыслугі памешчыка Паўла Энгельгарда, быў у яго і кухаронкам, і казачком. І як у вольную хвіліну палка імкнуўся маляваць, што не засталося не заўважаным Энгельгардам. Памятаю сваю радасць, як даведалася пра тое, што памешчык, пераследуючы мэту — зрабіць свайго прыгоннага ўласным хатнім жывапісцам, пасылае яго вучыцца да выкладчыка Віленскага ўніверсітэта — партрэтыста Яна Рустэма. А потым, калі Энгельгард пераязджае ў Санкт-Пецярбург, Тарас вучыцца ў мастака Васіля Шыраева…

Калі я закончыла Ваўчанскую сярэднюю школу імя Максіма Горкага ды паступіла на філалагічны факультэт у Кіеўскі дзяржаўны ўніверсітэт, які носіць імя Тараса Шаўчэнкі, мае веды пра ўкраінскага Кабзара значна пашырыліся. Я зразумела, што яго творчая спадчына — выдатная паэтычная інтэрпрэтацыя гісторыі Украіны. На працягу гадоў вучобы мне не раз даводзілася бываць у скверы Тараса Шаўчэнкі. Ён якраз насупраць галоўнага чырвонага корпуса ўніверсітэта.

Ля помніка Тарасу ў дзень яго нараджэння 5 сакавіка заўсёды збіралася моладзь, студэнты, пісьменнікі

Эскіз Тараса Шаўчэнкі. Хата бацькоў.

ЛЮБОЎ МАЛЫШАВА

Аўтапартрэты і карціны Тараса Шаўчэнкі



Алег Вінярскі, акцёр і рэжысёр Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Беларусі, чытае вершы Янкі Купалы «Памяці Шаўчэнкі» і ўрывак з паэмы «Тарасова доля»

і паэты сталага веку. Чыталі вершы, спявалі песні на словы Кабзара. Нават і мне аднойчы давялося прадэкламаваць адзін з маіх любімых вершаў — «Лілэя». Вытанчаны лірычны твор, напоўнены спачуваннем да жаночай долі. А калі я слухала гэты верш на вечарыне ў музеі Янкі Купалы, тое й прыгадалася.

Дарэчы, сваёй нэньці Украіне Шаўчэнка прысвяціў і мастацкія палотны, хоць бываў на радзіме не часта: з 47 гадоў жыцця правеў там толькі 15. І пры жыцці яго любілі і сябравалі з ім знакамітыя і для свайго часу людзі: артыст Міхаіл Шчэпкін, у мінулым такі ж прыгонны, як і Тарас; мастак Карл Брулоў, паэт Васілій Жукоўскі, адзін з кіраўнікоў Імператарскай Акадэміі мастацтваў Васілій Грыгаровіч, педагог Іван Сашэнка ды іншыя.

Цікавы факт з біяграфіі Шаўчэнкі пра сяброўства з выдатным артыстам Айра Олдрыджам. Той быў адзіны сярод 33 акцёраў афра-амерыканец у гісторыі, які быў удастоены сярэбранай памятнай дошкі на сценах Каралеўскага тэатра Шэкспіра ў Стратфардзе-на-Эйвоне. Пра тое піша кінакрытык Антон Філатаў у артыкуле «Як Шаўчэнка ўлюбіўся ў «Караля Ліра» (https://fraza.ua). (Ён жа і паведамляе, што падрабязна паказала ўзаемаадносіны Олдрыджа ды Шаўчэнкі рэжысёрка Вірляна Ткач у сваім спектаклі «Цёмная ноч. Ясныя зоры». Ён нядаўна быў пастаўлены на

> ***З'яўленне Шаўчэнкаўскага «Кабзара» ў 1840 годзе мусіць лічыцца эпахальнай датай у развіцці ўкраінскай літаратуры... Гэтая маленькая кніжачка адразу адкрыла быццам новы свет паэзіі, выбухнула як крыніца чыстай, халоднай вады, зазіхацела невядомай дагэтуль ва ўкраінскай літаратуры яснасцю, простасцю і паэтычнай грацыяй выразаў... Ён быў сынам мужыка — і стаў уладаром у царстве Духа. Ён быў прыгонным — і стаў волатам у царстве чалавечай культуры...***
>
> ***Іван Франко, украінскі паэт***

кіеўскай сцэне). Олдрыдж прыязджаў у Санкт-Пецярбург на гастролі з брытанскім тэатрам. І ў Марыінцы граў галоўныя ролі ў спектаклях «Атэла», і «Кароль Лір» Уільяма Шэкспіра. А з Шаўчэнкам артыст пазнаёміўся ў доме віцэ-прэзідэнта Расійскай акадэміі мастацтваў графа Фёдара Талстога, дзе той бываў, выкладаючы жывапіс дачцы Талстога. Пад час зносінаў украінец і амерыканец выявілі, наколькі іх лёсы падобныя. Олдрыдж — былы раб, а Шаўчэнка — былы прыгонны. Яны пасябравалі. І Шаўчэнка нават напісаў партрэт новага сябра.

Тых, хто цікавіцца лёсам Тараса Шаўчэнкі, адсылаю да ўсюдыіснай Вікіпедыі, дзе прасочваецца яго жыццёвы шлях. У прыватнасці, ідзе гаворка і пра тое, як сімпатыя да адоранага маларасійскага прыгоннага юнака з боку дзеячаў рускай культуры адыграла вызначальную ролю ў справе выкупа яго з няволі. Не адразу ўдалося ўгаварыць Энгельгарда даць Шаўчэнку волю. І толькі касмічная сума, за якую прыгонныя, кажуць, ніколі раней не выкупляліся, зрабіла сваю справу. У сакавіку 1838 года ў Анічкавым палацы ў Санкт-Пецярбурзе праходзіла латарэя, у якасці выйгрыша ў ёй была карціна Карла Брулова «В. А. Жукоўскі». Вось як Шаўчэнка напісаў пра тое ў аўтабіяграфіі:

«Дамовіўшыся папярэдне з маім памешчыкам, Жукоўскі прасіў Брулова напісаць з яго партрэт, з мэтай разыграць яго ў прыватнай латарэі. Вялікі Брулоў пагадзіўся, і партрэт быў гатовы. Жукоўскі з дапамогай графа Вільегорскага ўладкаваў латарэю ў 2500 рублёў, і гэтай цаной была куплена мая воля 22 красавіка 1838 года».

З гісторыі вядома: Шаўчэнка быў надзвычай таленавітым чалавекам, цікавым для культурнай і свецкай эліты тагачаснага Санкт-Пецярбурга. І Кіева таксама, калі там з'яўляўся. Нездарма ў яго гонар ладзіліся абеды й прыёмы. І многа цікавых фактаў з яго жыцця сведчаць: паэт быў жывым чалавекам і нішто чалавечае, як гаворыцца, яму не было чужым. У Інтэрнэце можна сустрэць замалёўкі ад невядомых аўтараў, прыхільнікаў паэта пра тое, што, напрыклад, яго іменем названы адзін з кратэраў на Меркурыі дыяметрам 143 км. Пішуць і пра тое, што Шаўчэнка цаніў моднае адзенне і шэсць разоў быў закаханы, але жанатым быць не давялося: абранніца яму здрадзіла. А жанчыны ім захапляліся. Можна таксама даведацца і пра тое, што пры жыцці Тарас Шаўчэнка не пісаў тэксты для песняў. А пасля яго смерці многія творы пакладзены на музыку вядомымі кампазітарамі: Мікалаем Лысенкам, Мадэстам Мусаргскім, Пятром Чайкоўскім, Сяргеем Рахманінавым. А вершы «Думи мої, думи», «Заповіт», «Реве та стогне

Дніпр широкий» сталі народнымі песнямі. Акрамя таго, паведамляюць: зберагліся 835 мастацкіх прац Шаўчэнкі, але амаль 300 згублена. А яшчэ ён меў званне Акадэміка гравіроўкі, якое ў 1860 годзе Імператарская Акадэмія мастацтваў прысудзіла яму за гравюру, выкананую па карціне Рэмбранта «Прыпавесць пра работніка на вінаградніку»

І што ж сёння?

Слава Тараса Шаўчэнкі з кожным годам пашыраецца і па-за межамі Украіны. Адным з першых, хто пераклаў творы Кабзара на беларускую мову, быў Янка Купала. Ён лічыў Шаўчэнку духоўным настаўнікам. Абодва народныя паэты стваралі новую нацыянальную літаратуру, змагаліся за духоўнае адраджэнне і незалежнасць сваіх народаў.

Вершы Тараса Шаўчэнкі на вечарыне ў Купалаўскім музеі чыталі прадстаўнікі розных пакаленняў украінскай дыяспары з Культурна-асветнага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Обрій» з мястэчка Калодзішчы, а таксама з Мінскага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Заповіт». Да іх далучыліся дзеці акрэдытаваных у Беларусі ўкраінскіх дыпламатаў Дзмітрый Цвердахлеб, Артур Ляшэнка, Ганна Шапіра і Маргарыта Андрэйчук.

Верш Янкі Купалы «Памяці Шаўчэнкі» і ўрывак з яго паэмы «Тарасова доля» прачытаў акцёр і рэжысёр Нацыянальнай дзяржтэлерадыёкампаніі Беларусі Алег Вінярскі.

У канцэртнай праграме былі выступленні фальклорнага ансамбля ўкраінскай песні ды абрадаў «Ватра» пад кіраўніцтвам Аляксандра Валодчанкі. Выконваліся песні на словы Шаўчэнкі «Думи мої, думи», «Пливи, пливи, лебідь», «По діброві вітер виє». Тэнар Мікіта Ядлоўскі, а таксама заслужаны студэнцкі хор Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка «Gaudeamus», якім кіруе Ларыса Ядлоўская, выканалі ўкраінскія народныя песні «Цвіте терен», «Праля», «Порізала пальчик», «Туман яром».

На ўрачыстае завяршэнне свята ўсе яго ўдзельнікі выконвалі знакамітую песню на словы Шаўчэнкі «Реве та стогне Дніпр широкий».

Яшчэ ў той дзень вершы ўкраінскага паэта гучалі таксама на розных мовах свету ў Доме дружбы на вечарыне, прысвечаным дню нараджэння вялікага Кабзара. Пра тое паведаміла БелТА.

Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Украіны ў Беларусі Ігар Кізіма распавёў пра значнасць творчасці і дзейнасці гэтага выдатнага ўкраінскага пісьменніка і мастака. Яго літаратурная спадчына лічыцца асновай украінскай літаратуры і сучаснай украінскай мовы. Дыпламат звярнуў увагу на ролю асобы Тараса Шаўчэнкі для нацыянальнай культуры і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.

Як адзначыў Амбасадар, на беларускай зямлі цэняць творчасць Тараса Шаўчэнкі, што пацвярджае і ўсталяваны непадалёк ад украінскай Амбасады ў Мінску помнік паэту. Бронзавая скульптура з'яўляецца падарункам Кіева Мінску. Што цікава: імя Кабзара занесена і на адзіны ў Беларусі помнік дарозе — Віленскаму тракту ў вёсцы Мясота Маладзечанскага раёна, па якім у мінулым у Вільню дабіраліся многія вядомыя людзі.

Мемарыяльная дошка ў Кустовічах у Кобрынскім раёне нагадвае нам, што ў 1829 годзе падлетак Тарас Шаўчэнка спыняўся ў вёсцы з абозам.

А ў свеце на сённяшні дзень налічваецца 1384 помнікі Тарасу Шаўчэнку, з іх 1256 ва Украіне. Там найбольшая колькасць помнікаў устаноўлена ў Івана-Франкоўскай вобласці — 199, за ёй ідзе Львоўская, дзе помнікаў — 187. У Тэрнопальскай — 165 і ў Чаркаскай — 102.

На вечарыне ў Доме дружбы вершы Тараса Шаўчэнкі дэкламавалі на сваіх родных мовах, перакладзеныя з украінскай, замежныя Амбасадары. Сярод іх — Амбасадар Аўстрыі Алаізія Вергетэр, кіраўнік польскай дыпмісіі Артур Міхальскі, Амбасадар Славакіі Ёзэф Мігаш.

Валянціна **Ждановіч.**
Фота Івана **Ждановіча.**

Студэнцкі хор Мінскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка «Gaudeamus» і ўдзельніцы фальклорнага гурта «Ватра»

РАРЫТЭТЫ З ЧЫГУНКІ

Музеі, як вядома, бываюць розныя. Некаторыя з іх — вельмі арыгінальныя. У Баранавічах, напрыклад, ёсць музей... чыгункі! Гэта — адно з любімых месцаў жыхароў горада. Бо складаецца ён не толькі з традыцыйнага музейнага памяшкання. Найбольш цікавая частка экспазіцыі размешчана пад адкрытым небам. Там можна пабачыць самыя розныя ўзоры чыгуначнай тэхнікі. Прычым не толькі пастаяць побач, але дзесьці нават залезці на падножку вагона, зазірнуць унутр.

Музейныя экспанаты

Афіцыйна гэта месца называецца «Музей гісторыі Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі». Там размяшчаецца калекцыя паравозаў як айчыннай, так і замежнай вытворчасці. Ёсць цеплавозы, пасажырскія і грузавыя вагоны розных пакаленняў. Асабліва цікавы для многіх экскурсантаў — дзейны макет Баранавіцкага чыгуначнага вузла, усталяваны ў адным з пасажырскіх вагонаў (не зазірнуць туды проста немагчыма!).

У іншых вагонах таксама ёсць экспазіцыйныя залы. Там прадстаўлены некаторыя інструменты, прыборы і механізмы (напрыклад, ручныя рэйкарэзныя і рэйкасвідравальныя станкі) — імі ў мінулым карысталіся чыгуначнікі. Можна пабачыць і грузавую дрызіну, якую многія ведаюць калі не з асабістага досведу, то па старых кінафільмах. Ёсць там і дзейны семафор, і гідраўлічная калонка для запраўкі паравозаў вадой.

Гэтыя экспанаты, без сумнення, цікавыя як прафесіяналам-чыгуначнікам, гісторыкам, так і ўсім ахвотным. Дзе яшчэ атрымаецца трапіць у такі цэласны, напоўнены рознымі цікавасцямі тэхнічны свет? Дарэчы, у 2002 годзе ў музеі стварылі экспазіцыю тэхнікі чыгуначных войскаў. Гэта пуцеўкладчык, выправачна-падбівачная машына, зенітна-кулямётныя ўстаноўкі, якія ставілі калісьці на спецыяльных чыгуначных платформах з браніраванымі адсекамі для размяшчэння кулямётных стужак, машыны для будавання мастоў на палях.

Трапляючы ў гэты музей, усведамляеш прыгажосць і значнасць многіх ідэй, рэалізаваных пры стварэнні чыгунак. Тут можна дакрануцца да мінулага і ўбачыць гісторыю развіцця і ўдасканалення чыгуначнай тэхнікі ў розныя часы. Музей перыядычна папаўняецца новымі экспанатамі.

Непадалёк ад экспазіцыі пад адкрытым небам размяшчаецца і музейны будынак. Ён датуецца пачаткам XX стагоддзя і з'яўляецца гістарычна-культурнай каштоўнасцю. А сам музей быў створаны ў ім у 1984 годзе (аддзел тэхнікі быў уладкаваны ў 1999-м).

На цяперашні момант гэта — самы вялікі чыгуначны музей у нашай краіне. Як адзначаюць яго куратары, тэхніку для экспазіцый збіралі з розных аддзяленняў. Штосьці прыносілі як чыгуначнікі, так і звычайныя жыхары горада.

У музейным дамку можна пабачыць шмат цікавых экспанатаў, звязаных з працай чыгуначнікаў. Напрыклад, старую таварную пломбу Палескай чыгункі станцыі Лахва (1899 год). Ёсць тут і жэтон работніка паравознага дэпо Аляксандраўскай чыгункі другой паловы XIX стагоддзя. Сярод цікавінак і паравозны ліхтар з газай другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя. Адметнай з'яўляецца і жалезная скрыначка машыністаў цягнікоў: у такой зазвычай вазілі ежу, асабістыя рэчы, дакументы. Тэлеграфны апарат Морзэ (яго таксама можна пабачыць) паступіў на чыгунку ў 1855–1856 гадах для сувязі паміж дзвюма суседнімі станцыямі, а тэлефон пачалі выкарыстоўваць у канцы XIX стагоддзя.

Важны рыштунак чыгунак яшчэ нядаўняга часу — станцыйны звон. Ударам у яго дзяжурны па станцыі падаваў сігнал-папярэджанне пасажырам пра час адпраўлення цягніка. Адзін удар звона — папярэджанне пра хуткае адпраўленне. Два ўдары — прапанова садзіцца ў цягнік. Тры ўдары — паведамленне аб адпраўленні. Першы ўдар рабіўся на пачатковых станцыях за 20 хвілін да адпраўлення, на прамежкавых станцыях — пры падыходзе цягніка да станцыі. Два ўдары звона рабіліся за дзве хвіліны да адпраўлення. Тры ўдары — на станцыях з прыпынкамі менш чым за дзве хвіліны пры спыненні цягніка.

Ёсць у музеі шмат іншых невялікіх, але цікавых экспанатаў. Гэта хуткасцемер для кантролю за дзейнасцю машыніста на лініі, чарнільны прыбор з драўлянай ручкай і шклянымі пёрамі 1940-х гадоў (шкляныя пёры выкарыстоўваліся для запаўнення паравозачных дакументаў пад капірку).

Варта адзначыць, што вакзал «Баранавічы Палескія» , побач з якім размяшчаецца музей, быў разбураны пад час Другой сусветнай вайны. А ў сваім сучасным выглядзе быў пабудаваны пасля вызвалення горада.

Баранавічы — вядомы чыгуначны вузел, горад, які ўзнік на станцыі. Пэўна, завітаўшы сюды і маючы хаця б адну вольную гадзінку, варта зазірнуць у музей чыгункі, найперш у яго аддзяленне пад адкрытым небам.

Ніна **Шчарбачэвіч**.
Фота аўтара.

НА «СКРЫЖАВАННІ» ТАЛЕНТАЎ І МАСТАЦТВАЎ

Тое, што ў Пінску з'явілася скульптура палешука-пінчука, выглядае надзвычай сімвалічна. Гэты чалавек з барадой у капелюшы і палескай свіце, падпяразаны поясам, нясе ў сабе своеасаблівы культурна-гістарычны код, сфарміраваны многімі пакаленнямі тутэйшых людзей.

P.V.BY

Скульптар Аляксей Паўлючук з эскізнай мадэллю палешука-пінчука

MEDIA-POLESYE.BY

Вось такога бронзавага палешука-пінчука можна цяпер сустрэць у Пінску

— Ці ведаеце вы, як сярод іншых людзей распазнаць сапраўдных «пінчукоў»? — пытаецца вядомы краязнавец і даследчык Таццяна Хвагіна і адказвае: — Дзе б ні сышліся вашы шляхі — у Еўропе, Азіі ці Амерыцы, — калі справа дойдзе да знаёмства, сапраўдны пінчук, загнуўшы мезенец, з годнасцю пачне: «Па-першае, я з Пінска...», нібыта ўвесь свет павінен ведаць, дзе знаходзіцца Пінск і менавіта што з'яўляецца падставай для таго, каб ганарыцца сваім пінскім паходжаннем. Бо для тых, каго з дзяцінства калыхала на сваіх хвалях ласкавая Піна, хто бегаў басанож па пінскіх вулачках і завулках, сталеў сярод сівых мураў, Пінск — гэта не проста пункт на карце: амаль што пуп зямлі». Вось гэтае прыгожае азначэнне пінчука, зробленае Таццянай Хвагінай, стала ідэйнай асновай скульптуры Аляксея Паўлючука. Пінчук стаіць менавіта загнуўшы мезенец.

Азначу, што многа мерапрыемстваў, запланаваных у Пінску на гэты год, пройдуць менавіта там — на пешаходнай вуліцы побач з бронзавым палешуком-гараджанінам. А ў горадзе хутка з'явіцца яшчэ адна знакавая культурная кампазіцыя, прысвечаная знакамітым выхадцам з Пінска. Як вядома, першы Прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман, пяты Прэм'ер-міністр гэтай краіны Голда Меір сваю першую адукацыю атрымлівалі ў Пінску. Засталася навучальная ўстанова таго часу, якая, дарэчы, і цяпер служыць справе адукацыі. Вось там паўстане помнік знакамітым людзям. Яго адкрыццё плануецца будучым летам, паведаміла загадчыца сектара культуры гарвыканкама Тамара Дземідзенка.

Тамара Іванаўна расказала, што ўсяго на год запланавана 445 мерапрыемстваў, прысвечаных статусу культурнай сталіцы і звязаных з гэтай падзеяй. З іх чатыры дзясяткі адрозніваюцца значным маштабам і вялікай колькасцю ўдзельнікаў. Гэта, напрыклад, фестываль духавых аркестраў, фэст арганнай музыкі, вялікі фестываль мастацтваў «Зоры над Пінай».

Паводле слоў арганізатараў, надаецца асаблівае значэнне масавым мерапрыемствам, напрыклад, такім, як фестываль вулічнай творчасці «Скрыжаванне». Для ўдзелу ў мерапрыемстве спатрэбіцца ўсяго толькі жаданне і неабходнасць загадзя паведаміць пра свой намер. Як толькі пацяплее, ва ўсе выхадныя дні на гэтым творчым скрыжаванні аматары мастацтваў будуць спяваць, танцаваць, сюды ж прыйдуць мясцовыя паэты, каб пачытаць уласныя вершы, а дэкламатары змогуць пачытаць і класікаў, было б жаданне. Тут жа будуць працаваць і мастакі — кожны ахвотны зможа замовіць ім свой партрэт альбо набыць прыгожы пейзаж. Гэта вуліца, паводле задумкі, мусіць стаць гэткай агульнагарадской культурнай прасторай альбо нават культурным рухам, каб кожны адчуў, што статус культурнай сталіцы — гэта не толькі пералік абавязковых мерапрыемстваў, нярэдка афіцыйных, гэта яшчэ і яго справа.

Напрыклад, фестываль арганнай музыкі для горада справа не новая. У гарадской канцэртнай зале, якая ўтворана ў касцёле Карла Барамея, выступалі ў розны час Уладзімір Неўдах, Канстанцін Шароў, Кацярына Лявонцьева, Ігар Алоўнікаў, Ксенія Пагарэлая, Элеанора Бялева, Барыс Штокалаў, а таксама цэлы шэраг вядомых замежных музыкантаў. Узведзены ў XVIII стагоддзі ордэнам ксяндзоў-камуністаў кляштарны касцёл і сёння — адна з галоўных славутасцяў горада. Спецыялісты кажуць, што двухметровыя сцены гэтай мініяцюрнай крэпасці здольныя вытрымаць любы шторм. А статус горада яшчэ раз прымушае звярнуць увагу, асабліва моладзі, на цікавую гісторыю будынка, якая сведчыць, што камуністы, прынамсі ў Пінску, з'явіліся задоўга да кастрычніцкіх падзей XX стагоддзя.

Пінск слаўны многімі помнікамі даўніны. Сярод іх першы калегіум езуітаў, дзе цяпер размяшчаецца Музей беларускага Палесся, ансамбль былога манастыра францысканцаў, касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі з яго знакамітай «Пінскай мадоннай». Абрысы гэтых славутасцяў склалі лагатып культурнай сталіцы. Гарвыканкам падвёў вынікі конкурсу — перамагла работа Віктара Сагановіча. Белыя лініі на эмблеме паказваюць напрамкі асноўных вуліц горада.

Старшыня Пінскага гарадскога Савета дэпутатаў Лявонцій Лемяшэўскі, якому выпала ганаровая місія атрымаць эстафету культурнай сталіцы ад папярэдніка-Полацка, адзначыў:

— Статус горада ў 2019 годзе накладвае на ўсіх яго жыхароў пэўныя абавязацельствы. У нас ёсць прафесійны тэатр, вышэйшая навучальная ўстанова, шэраг устаноў культуры. На працягу года яны павінны выканаць пэўныя асветніцкія задачы. У нас ёсць на чым выхоўваць культурныя традыцыі, маю на ўвазе найперш багатую гісторыю больш чым 900-гадовага Пінска, цікавую разнастайную спадчыну. Жывучы ў старажытным прыгожым горадзе, кожны павінен ведаць мінулае, славутасці ды клапаціцца пра захаванне яго прывабнага знешняга выгляду, карацей — быць вартым памяці продкаў.

Святлана **Яскевіч**

Хронікі з Вялікага

Такім быў Вялікі тэатр Беларусі да рэканструкцыі

У гэтым прэстыжным будынку тэатра, як звычайна, кіпіць жыццё. І на сцэне, і за кулісамі — у рэпетыцыйных залах, цэхах, кабінетах адміністрацыйных, творчых і іншых службаў, а таксама ў грымёрных…

Вечарамі, як вядома, тут спяваюць і танцуюць майстры праслаўленай сцэны, днём рэпеціруюцца, калі ў тым ёсць неабходнасць, рэпертуарныя спектаклі. І, вядома ж, будучыя прэм'еры. У цэхах да іх шыюцца касцюмы. А ў службе галоўнага мастака генеруюцца ідэі сцэнаграфіі для будучых оперных і харэаграфічных шэдэўраў. І ўвесь гэты вялікі механізм працуе зладжана, хоць і задзейнічана ў ім каля 1000 чалавек.

Мабыць, больш, чым хто-небудзь навіны пра тое, што адбываецца ў велізарным абноўленым будынку, які адкрыўся 80 гадоў таму, ведаюць нашы тамтэйшыя калегі. Сярод іх журналістка Алена Балабановіч, вядучы рэдактар аддзела інфармацыі Вялікага тэатра Беларусі, адна з аўтараў часопіса «Партер». Мы часта бачым яе ў ліку арганізатараў прэс-канферэнцый, юбілеяў, творчых сустрэч і іншых крэатыўных праектаў. Яна і распавяла нам пра адзін з іх, які ў сувязі з юбілеем будынку тэатра да 10 сакавіка быў запушчаны ў сацыяльных сетках. Аказваецца, гледачам было прапанавана дасылаць у любую з іх здымкі з выявай тэатра з хэштэгам #Дому_80 #БТБ_80 #Вялікаму_80.

— Вось так мы паведамілі пра адкрыццё Вялікага тэатра ў даваенны перыяд. У той даўні вечар 10 сакавіка 1939 года жыхары Мінска ішлі да Траецкай гары, каб далучыцца да знамянальнай падзеі: у тэатра з'явіўся новы ўласны будынак! На сцэне тады давалі прэм'еру — оперу Яўгена Цікоцкага «Міхась Падгорны»… Самыя цікавыя здымкі, — расказала наша суразмоўніца, — мы размясцілі на афіцыйным сайце тэатра і ў нашых сацсетках. А пераможцы (іх трое) пайшлі на спектакль «Сівая легенда» 26 сакавіка!

З Аленай мы і пагутарылі аб рэзанансных падзеях першага вясновага месяца.

Пра «Лятучую мыш», якая заляцела ў Мінск

Працягваюцца рэпетыцыі аперэты Іагана Штрауса «Лятучая мыш». Яе ставіць рэжысёр з Венгрыі Габар Міклаш Кераньі, больш вядомы як Керо, мастацкі кіраўнік Будапешцкага тэатра аперэты і мюзікла. Прэм'ера спектакля запланаваная на 16 красавіка. Ён жа і ўзначаліў пастановачную групу сумесна з італьянскім маэстра — галоўным запрошаным дырыжорам Вялікага тэатра Джанлука Марчано.

Керо нарадзіўся ў Будапешце ў 1951 годзе, скончыў аддзяленне оперных спеваў у мясцовай кансерваторыі і працягнуў адукацыю ў Венгерскай тэатральнай акадэміі, атрымаўшы дыплом «рэжысёра музычнага тэатра». У Венгерскім дзяржаўным оперным тэатры, дзе Керо адпрацаваў 10 гадоў, ён паставіў класічныя оперы: «Лятучы галандзец» Рыхарда Вагнера, «Дон Карлас» і «Макбет» Джузэпэ Вердзі, «Фаўст» Шарля Гуно і іншыя. А ўжо быўшы мастацкім кіраўніком, дырэктарам і рэжысёрам Будапешцкага тэатра аперэты і мюзікла, Габар Міклаш дадаў у афішу такія спектаклі, як: «Каралева Чардаша» і «Графіня Марыца» Імрэ Кальмана, «Краіна ўсмешак» Франца Легара, «Лятучая мыш» Іагана Штрауса…

Яго спектаклі ідуць у Зальцбургу, Санкт-Пецярбургу, Празе, Вене, Тэль-Авіве, Бухарэсце, Мюнхене. А цяпер рэпетыруецца і ў Мінску! Сам Керо абяцае, што на беларускай сцэне гледачы ўбачаць унікальную пастаноўку:

«Мы ствараем спектакль, які захавае традыцыі першай аперэты 1874 года, але таксама ўбярэ ў сябе ўсё самае лепшае з таго, што існуе на сёння». Складаныя лабірынты, паваротны круг, незвычайныя візуальныя эфекты, цікавая харэаграфія — усё будзе працаваць для ўвасаблення задумкі рэжысёра. «Але ўсё-такі галоўная тут музыка! Яна — выдатная!» — падкрэсліў Кераньі.

Для новай пастаноўкі ствараюцца больш чым 200 незвычайных убораў. Дарэчы, мастак па касцюмах Агнеш Дзярмаці, якая працавала ў аскаронасным фільме Іштвана Сабо «Мефістофель», таксама з Венгрыі. Кераньі, як сказаў, шчаслівы зноў звярнуцца да такога цікавага матэрыялу. Яго «Лятучыя мышы» лётаюць на самых розных сцэнах свету.

Цікава, што, як і ў арыгінальнай партытуры, партыю князя Арлоўскага на беларускай сцэне выканае… мецасапрана. Арлоўскі выступіць тут адной з цэнтральных фігур.

Ірына Яромкіна — народная артыстка Беларусі. У балеце «Дон Кіхот» Людзвіга Мінкуса выконвае партыю Кітры. Пастаноўка Валянціна Елізар'ева.

Віктар Пласкіна, галоўны дырыжор Вялікага тэатра Беларусі, заслужаны артыст Украіны. У тэатры працуе з кастрычніка 2007 года.

Габар Міклаш Кераньі, мастацкі кіраўнік Будапешцкага тэатра аперэты і мюзікла ў Вялікім тэатры стварае спектакль «Лятучая мыш», які захавае традыцыі першай аперэты 1874 года

Удзельнікі канцэрта «Маладыя зоркі сусветнай оперы»

Касандра Вюс паціскае руку маэстра Віктару Пласкіне пасля выканання арыі Кірубіна з оперы «Вяселле Фігаро» Вольфганга Амадэя Моцарта

Юры Юшкевіч, уладальнік рэдкага контртэнара і шматлікіх узнагарод міжнародных конкурсаў, сваім выкананнем скарыў мінскую публіку

Аляксандра Флад і Эгле Шыдлаўскайтэ ў дуэце з оперы «Капулеці і Мантэкі» Вінчэнца Беліні

Дарэчы, у беларускім Вялікім «Лятучая мыш» ужо ішла. Над аперэтай ў 1961-м працавалі: дырыжор Таццяна Каламійцава, рэжысёр Вячаслаў Броўкін, мастак Яўген Чамадураў, хормайстар Аляксандр Кагадзееў.

Над новай пастаноўкай аперэты «Лятучая мыш» у Вялікім тэатры яшчэ працуюць Тамаш Ракаі (мастак-пастаноўшчык, сцэнаграфія), Петэр Шомфаі (мастак па святле), Ніна Ламановіч (хормайстар-пастаноўшчык), Вольга Костэль (балетмайстар-пастаноўшчык).

Галоўныя партыі рэпеціруюць вядучыя салісты оперы: Анастасія Масквіна, Алена Сало, Ірына Кучынская, Алена Сіняўская, Алена Таболіч, Марына Ліхашэрст, Клаўдзія Пацёмкіна, Дыяна Трыфанава, Кацярына Міхнавец, Крыскенція Стасенка, Марына Аксёнцава, Васіль Мінгалёў, Аляксандр Краснадубскі, Сяргей Лазарэвіч, Дзяніс Янцэвіч, Аляксандр Міхнюк, Аляксандр Гелах, Андрэй Мацюшонак, Віктар Мендзелеў, Юрый Балацько, Янаш Нялепа, Дзмітрый Капілаў, Ілья Пеўзнер, Андрэй Сялюцін, Андрэй Кліпо і іншыя.

Пра старт вясне

— Мы далі старт вясне! — так выказаўся галоўны дырыжор Вялікага тэатра Беларусі Віктар Пласкіна пра канцэрт «Маладыя зоркі сусветнай оперы», які прагучаў 2 сакавіка. У гэты дзень маэстра стаяў за дырыжорскім пультам. На сцэне спявалі — стыпендыяты некамерцыйнай дабрачыннай арганізацыі Княства Ліхтэнштэйн «SIAA-foundation». Гэтая асацыяцыя дапамагае маладым спевакам і музыкантам, якія валодаюць выдатнымі вакальнымі дадзенымі. У гэтым годзе восем маладых таленавітых салістаў упершыню прадставілі свае мастацтва беларускай публіцы.

Гэта было сапраўднае свята музыкі! Гледачы пачулі вакальныя шэдэўры — знакамітыя арыі, ансамблі з опер еўрапейскіх кампазітараў ад эпохі барока да пачатку XX стагоддзя: Вівальдзі, Моцарт, Бізэ, Даніцэці, Офенбах, Штраўс… Кажуць: маладосць гарады бярэ. Так і здарылася: на пачатку сакавіка маладосць заваявала горад Мінск. Канцэрт парадаваў разнастайнасцю тэмбраў: гучалі барытоны, сапрана ды нават контртэнар. У тэатры чакалі гэты канцэрт з нецярпеннем. І ён, як мы пераканаліся, стаў падзеяй. Зрэшты, як і ўсе іншыя праекты. Ва ўсялякім выпадку так гавораць прыхільнікі тэатра і масмедыя.

Дарэчы, некамерцыйная дабрачынная арганізацыя Княства Ліхтэнштэйн «SIAA-foundation», названая «Sic Itur Ad Astra», што азначае «Такі шлях да зорак». Гэты крылаты выраз стаў не толькі іменем, але й дэвізам фонду, пазначыўшы асноўныя кірункі яго дзейнасці, а таксама магутны крэатыўны патэнцыял. Дзякуючы SIAA многія маладыя артысты атрымалі выдатныя магчымасці для творчага старту, скарыўшы сваім майстэрствам публіку культурных сталіц свету. «SIAA-foundation» з 2006 года аказвае падтрымку маладым спевакам: прызначае штомесячныя стыпендыі, ладзіць міжнародныя майстар-класы й семінары, арганізоўвае канцэрты з вядомымі дырыжорамі. Так, традыцыйным з'яўляецца штогадовы канцэрт стыпендыятаў фонду ў адным з буйных канцэртных залаў Еўропы: Нямецкая опера ў Берліне (2015), Дом Моцарта ў Вене (2016), Вялікая зала Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі (2017), Латвійская нацыянальная опера (2018). Цяпер у гэтым прэстыжным спісе ёсць і Вялікі тэатр Беларусі.

Пра ўзнагароды і юбілеі

Алена Балабановіч палічыла важным і са старонак часопіса павіншаваць вядучага майстра сцэны нашага балета Ірыну Яромкіну — з высокім званнем народнай артысткі Беларусі! «Хай для Ірыны прагучаць нашы шчырыя словы віншавання й захаплення яе яркім талентам, працавітасцю, імкненнем дарыць гледачам прыгажосць! — сказала Алена. — Жадаем Ірыне натхнення — для новых здзяйсненняў!»

Яшчэ падзея, якую адзначылі па-асабліваму. Галоўнаму рэжысёру тэатра Міхаілу Панджавідзэ споўнілася 50 гадоў. І амаль 10 з іх ён служыць у Вялікім тэатры Беларусі. Менавіта ў дзень свайго нараджэння Міхаіл Аляксандравіч запрашаў і журналістаў прыйсці да яго на творчую сустрэчу. Яна адбылася 5 сакавіка ў 18:00 у фае тэатра, перад знакавай для рэжысёра пастаноўкай «Саламея» на музыку Ры-

харда Штрауса. І гэта была не проста прэс-канферэнцыя, а вечар пытанняў і адказаў.

Пра гастрольную пару

На самых розных пляцоўках вялікіх і маленькіх гарадоў Мексікі артысты Вялікага тэатра ў цяперашні час паказваюць балет Пятра Чайкоўскага «Спячая прыгажуня». У Мінск яны вернуцца толькі 17 красавіка.

— «Спячая прыгажуня» — вельмі прыгожы балет! Гэта казка, якую ведаюць практычна па ўсім свеце, хай сабе і ў розных варыяцыях. Наша пастаноўка — класічная, дзе разнастайнасць танца вельмі гарманічна й лёгка кладзецца на дзіўную музыку Чайкоўскага», — так выказалася напярэдадні паездкі загадчыца балетнай трупай тэатра Таццяна Шаметавец, заслужаная артыстка Беларусі. На яе плечы ўскладзена каласальная адказнасць: менавіта яна на гэты раз узначальвае гастролі. Тыхуана, Мантэрэй, Гвадалахара, Ірапуата, Мерыда, Канкун, Мехіка ды многія іншыя — каля 30 гарадоў Мексікі ўбачаць артыстаў беларускага балета ў гэтым годзе.

— За паўтара месяца будзе адыграна 42 спектаклі, і гэта ўлічваючы так званыя «двайнікі», калі ў адзін вечар выканаўцы танцуюць два балеты адзін за адным, да прыкладу, у 6 і ў 9 гадзін вечара. Хвалююся — вельмі! Усё-такі адказваю за 45 чалавек! Галоўнае, каб усе былі сабраныя ды здаровыя. Бо «Спячая прыгажуня» складаны спектакль. Вельмі вялікая нагрузка кладзецца як на вядучых артыстаў, так і на кардэбалет. Часта дзяўчынкі кажуць, што ім значна складаней — па тэхніцы і балетных элементах — танцаваць «Спячую прыгажуню», чым «Лебядзінае возера»… Дарэчы, балерыны Вераніка Алешчанка ды Валерыя Грудзіна будуць дэбютаваць у гэтым спектаклі менавіта ў Мексіцы. А ў галоўных партыях выйдуць Ірына Яромкіна, Аляксандра Чыжык, Яна Штангей, Вікторыя Трэнкіна, Дар'я Мядоўская, Вераніка Аўчыннікава, Ігар Артамонаў, Антон Краўчанка, Канстанцін Геронік, Ягор Азаркевіч, Арцём Банькоўскі ды іншыя нашы выдатныя артысты.

— Мы ўжо ведаем, якая дзіўна прыгожая краіна — Мексіка! — прадаўжае Таццяна Шаметавец. — Велізарныя прасторы, шырокія гарызонты, горы, акіян, залівы! Вядома, вельмі хочацца, каб пад час паездкі знайшліся хвілі-

Сцэна з оперы «Сівая легенда» Дзмітрыя Смольскага (рэжысёр-пастаноўшчык — галоўны рэжысёр Вялікага тэатра Міхаіл Панджавідзэ), за якую тэатр узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі

У дзень свайго 50-гадовага юбілею Міхаіл Панджавідзэ за гадзіну да спектакля «Саламея» Рыхарда Штрауса правёў творчую сустрэчу прама ў фае тэатра і адказаў на шматлікія пытанні журналістаў і гледачоў

За паўтара месяца гастроляў па Мексіцы, якія прадоўжацца яшчэ і ў красавіку, харэаграфічная трупа Вялікага тэатра Беларусі пакажа 42 спектаклі «Спячая прыгажуня» Пятра Чайкоўскага

Яго Вялікасць — Тэатр

Міжнародны дзень тэатра — інтэрнацыянальнае прафесійнае свята ўсіх работнікаў тэатра, якое адзначаецца па ўсёй планеце штогод. 27 сакавіка. Гэты міжнародны дзень традыцыйна праходзіць пад адзіным дэвізам: «Тэатр як сродак узаемаразумення й умацавання міру паміж народамі». «Сусветны дзень тэатра» ўсталяваны ў 1961 годзе па ініцыятыве дэлегатаў IX кангрэса Міжнароднага інстытута тэатра (МІТ) пры ЮНЕСКА. Заснаваны ў Празе (Чэхаславакія) у 1948 годзе. Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з'яўляўся членам МІТ, пачынаючы з 1959 года, — з таго часу, калі ў сталіцы СССР горадзе Маскве, на базе Усерасійскага тэатральнага таварыства, быў створаны Савецкі Нацыянальны цэнтр Міжнароднага інстытута тэатра (http://www.calendar.by/).

Беларускі прафесійны тэатр развіўся са старадаўніх народных абрадаў, творчасці вандроўных музыкаў, прыдворных труп беларускіх магнатаў, дзейнасці аматарскіх калектываў мяжы XIX–XX стагоддзяў. У цяперашні час у краіне працуе 28 дзяржаўных тэатраў, вялікая колькасць самадзейных народных калектываў, у тым ліку: лялечныя тэатры, драматычныя, музычныя. Самым славутым тэатрам Беларусі, яго візітнай карткай з'яўляецца Вялікі тэатр Беларусі. Яго пастаноўкі маюць грандыёзны поспех як у айчыннага, так і ў замежнага гледача.

ЛЮБОЎ МАЛЫШАВА

Стыпендыяты некамерцыйнай дабрачыннай арганізацыі «SIAA-foundation» упершыню прадставілі сваё мастацтва беларускай публіцы

ны й для адпачынку. Але гэта вельмі небяспечны момант. Таму што расслабляцца — нельга! Становішча абавязвае быць сабранымі, на нас — вялікая адказнасць. А яшчэ мне вельмі хочацца, каб артысты адчувалі сябе адной камандай, больш за тое — адной вялікай сям'ёй. Каб усе разумелі: заўсёды ёсць плячо, на якое можна абаперціся. Гэта вельмі важна… Таму ўключаю здаровы аптымізм, дадаю кропельку гумару й кажу ім: «Ад 42 спектакляў нам нікуды не ўцячы! Што б вы ні думалі й чаго б ні баяліся — мы гэта зробім! Паверце!». Я ведаю, што патэнцыял у трупы — велізарны! Кожны з артыстаў — адказны й неабыякавы чалавек, які любіць сваю прафесію.

27 сакавіка — Міжнародны дзень тэатра

Напярэдадні Міжнароднага дня тэатра Вялікі тэатр зрабіў падарунак сваім любімым гледачам. У вечар — 26 сакавіка ізноў распавёў гісторыю кахання, якая жыве ў вяках дзякуючы двум беларускім класікам — пісьменніку Уладзіміру Караткевічу ды кампазітару Дзмітрыю Смольскаму. На сцэне Вялікага прагучала опера «Сівая легенда» ў пастаноўцы Міхаіла Панджавідзэ. Галоўныя ролі выканалі народныя артысты Беларусі Ніна Шарубіна, Сяргей Франкоўскі, Уладзімір Пятроў. За дырыжорскім пультам быў Вячаслаў Чарнуха-Воліч. І што цікава, на гэты спектакль можна было купіць два квіткі па кошце аднаго!

Кожны паказ оперы «Сівая легенда», творчы калектыў якой быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі, становіцца падзеяй. І кожны раз тэатр у гэты вечар рыхтуе для сваіх гледачоў што-небудзь асаблівае. Так было і на гэты раз. 26 сакавіка за гадзіну да спектакля адкрылася выстава-прэзентацыя кнігі Барыса Лазукі «У засені замкаў і палацаў. Матэрыяльная культура сацыяльнай эліты Беларусі XII–пачатку XX стагоддзя». Аповед пра кнігу быў падмацаваны цікавымі рарытэтнымі помнікамі матэрыяльнай культуры з фондаў Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук, які ўзначальвае Барыс Лазука.

Міхаліна **Чаркашына.**
Здымкі прадастаўлены Валікім тэатрам Беларусі.

ІВАН ЖДАНОВІЧ

Першымі на гарадскіх клумбах пасля зімы з’яўляюцца крокусы

КРАІНА
Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ

Часопіс для тых, хто жадае ведаць больш

ISSN 0320-7544
9 770320 754006 19003